# КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

## УВОДЗІНЫ

### План

1. Археалогія як навука
    1.1. Месца археалогіі ў сістэме навук
    1.2. Сацыяльныя функцыі археалогіі
2. Базавыя (фундаментальныя) паняцці археалогіі
3.Працэдура археалагічнага даследавання.
    3.1. Збор матэрыялаў;
    3.2. Апрацоўка матэрыялаў і папярэдні аналіз даных;
    3.3. Інтэрпрэтацыя даных, гістарычныя рэканструкцыі.
4. Археалагічная перыядызацыя

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 1.*

### 1. Археалогія як навука

#### 1.1. Месца археалогіі ў сістэме навук

**Археалогія** (ад грэчаскіх слоў: “архайос” – старажытны і “логас” – словы, веды) – навука, якая вывучае мінулае чалавецтва па матэрыяльных рэштках дзейнасці чалавека.

Аб’ектамі археалагічнага вывучэння з’яўляюцца рэчавыя крыніцы: паселішчы, могільнікі, майстэрні, рэшткі старажытных умацаванняў, архітэктурныя збудаванні, старажытныя шахты, наскальныя малюнкі, камяні з надпісамі, свяцілішча, скарбы, асобныя знаходкі.

Археалогія часта падзяляецца на першабытную (дапісьмовую) і протагістарычную (пісьмовую). Мяжа паміж “дагісторыяй” і “гісторыяй” у розных краінах праводзіцца па-рознаму, што звязана з неаднолькавым часам узнікнення і распаўсюджання пісьменнасці ў розных рэгіёнах.

Большая частка чалавечай гісторыі была безпісьмовай, таму адзінай крыніцай для вывучэння гэтага перыяду з'яўляюцца разнастайныя рэшткі дзейнасці людзей. Старажытныя пісьмовыя крыніцы асвятляюць шматлікія старонкі мінулага, але, як правіла, яны не закранаюць усіх бакоў гісторыі чалавецтва. У такіх выпадках рэчавыя крыніцы вывучаюцца паралельна з пісьмовымі крыніцамі адпаведных эпох, і менавіта археалогія значна пашырае нашыя ўяўленні аб даўніх часах.

Традыцыйна верхнім парогам вывучэння аб'ектаў археалогіі лічыцца XVIII ст., аднак сёння развіваюцца і накірункі, звязаныя з вывучэннем XIX і XX ст.

У айчыннай традыцыі археалогія адносіцца да гістарычных навук (узгадайце крылаты выраз "Археалогія – гэта гісторыя, узброеная рыдлёўкай"). Аднак у розныя часы грамадства разумела месца археалогіі ў сістэме навук па-рознаму.

Сам тэрмін "археалогія" узнік у Старажытнай Грэцыі. Гэтым паняццем карыстаўся філосаф Платон. У адной са сваіх кніг ён пісаў, што "археалогія" – гэта навука, якая мела справу з усёй "старажытнай гісторыяй". У Сярэднявеччы археалогія была часткай геаграфіі – яна апісвала цікавыя мясціны той ці іншай краіны. У эпоху Адраджэння, калі адукаваная грамадскасць была захопленая антычным выяўленчым мастацтвам, археалогія стала часткай музейна-антыкварнай справы. У эпоху Асветніцтва археалогія фактычна займалася тым, што зараз адносіцца да сферы мастацтвазнаўства. Для рамантыкаў першай паловы XIX ст., якія ідэалізавалі мінулае і імкнуліся падмацоўваць свае думкі зваротам да старажытных помнікаў, археалагічная спадчына была звязаная з этнаграфіяй. Пачынаючы з другой паловы XIX ст., археалогія пачала пераўтварацца ў гістарычна арыентаваную дысцыпліну.

Нягледзячы на тое, што археалогія займаецца вывучэннем далёкага мінулага, гэтая навука вельмі моцна звязаная з жыццём сучаснага грамадства.

**1.2. Сацыяльныя функцыі археалогіі –** гэта ролі, якія навука выконвае ў жыцці грамадства і якія ў сваёй сукупнасці абумоўліваюць яе сацыяльную каштоўнасць.

- Функцыя сацыяльнай памяці. Сацыяльная памяць – гэта назапашванне і захаванне ў памяці чалавецтва досведу ўсіх мінулых пакаленняў. Гэта памяць, накіраваная на забяспячэнне ўстойлівасці развіцця і жыцця грамадства. Археалогія выступае як пасрэдніца паміж пакаленнямі чалавецтва.

- Навукова-пазнавальная функцыя. Сэнс функцыі – у прадстаўленні грамадству ведаў аб мінулым.
- Светапоглядная функцыя. Археалогіі належыць істотная роля ў станаўленні навуковага светапогляду чалавека.
- Палітыка-ідэалагічная функцыя. Археалагічная спадчына часта выкарыстоўваецца дзеля рэалізацыі пэўных палітычных і ідэалагічных мэтаў. Археалогія адыгрывае значную ролю ў фарміраванні народнай (нацыянальнай) ідэнтычнасці. Часам археалогія выкарыстоўваецца для сцверджання даўнасці нацыянальнай традыцыі і, як вынік, для пацвярджэння "гістарычнага права" пэўнай дзяржавай на зямлю. Гэта практыка распаўсюджаная ў розных краінах, аднак варта памятаць, што яна вельмі шкодная як для грамадстваў, так і для самой навукі. Таму праблема барацьбы супраць нацыяналістычных спекуляцый на падставе археалагічных помнікаў застаецца актуальнай.
- Эканамічная функцыя. Мінулае мае істотную матэрыяльную вартасць. На постсавецкай прасторы археалагічная спадчына – і то не ў поўнай ступені – запатрабаваная музейнай, турыстычнай і інш. падобнымі сферамі. У шэрагу краін свету вынікі археалагічных даследванняў выкарыстоўваюцца рознымі галінамі гаспадаркі (у сельскай гаспадарцы, будоўлі, медыцыне і інш).

## 2. Базавыя (фундаментальныя) паняцці археалогіі

Для археалогіі такімі тэрмінамі з'яўляюцца:

**Артэфакт** (ад лат. *art* – рамяство, мастацтва і *facio* – рабіць, выраблять) – гэта любы прадмет, зроблены рукамі чалавека, а таксама любы матэрыял, падпраўлены чалавекам.

Г.зн., артэфактамі з'яўляюцца, напр., і крамянёвая сякера, і кавалак крэменю з адным сколам.

**Археалагічны помнік** – гэта любыя рэшткі старажытных пабудоў, сляды працоўнай ці культавай дзейнасці чалавека, а таксама месцы выяўлення асобных старажытных рэчаў, зробленых чалавекам альбо прыстасаваных ім да сваіх мэтаў.

Існуюць розныя класіфікацыі археалагічных помнікаў. Археалагічныя помнікі, у залежнасці ад функцый, якія яны выконвалі ў мінулым, традыцыйна падзяляюцца на наступныя асноўныя групы:

- паселішчы;
- пахаванні;
- помнікі вытворчай дзейнасці чалавека;

- помнікі культавага і рэлігійнага прызначэння;
- помнікі старажытных камнунікацыйных сістэм (шляхі і г.д.).;
- скарбы;
- месцазнаходжанні асобных артэфактаў.

**Паселішчы** падраздзяляюцца на тры тыпы.

*Стаянкі* – неўмацаваныя (г.зн. без вонкавых прыкмет) паселішчы, характэрныя для каменнага і бронзавага вякоў.

*Гарадзішчы* – паселішчы, якія мелі абарончыя ўмацаванні (земляныя валы, равы, мураваныя сцены ці іншыя фартыфікацыйныя збудаванні). Умацаваныя паселішчы ўзніклі ў канцы эпохі каменя і існавалі да перыяду позняга сярэднявечча.

*Селішчы* – неўмацаваныя паселішчы, якія адносяцца да жалезнага веку і эпохі сярэднявеччча.

Старажытныя **пахаванні** дзеляцца на два тыпы.

*Грунтовыя пахаванні.* Пахаванні без вонкавых наземных прыкмет. Нябожчыкаў хавалі ў яме. Гэта найбольш старажытны тып пахавальнага збудавання, які з'явіўся яшчэ ў палеаліце.

*Курганныя пахаванні.* Пачатковае значэнне слова “курган”, якое мае цюркскае паходжанне, – “крэпасць”, “гарадзішча”. Менавіта ў такім значэнне гэта слова выкарыстоўвалася ў пісьмовых тэкстах, створаных да XV ст. Пазней слова “курган” стала азначаць “магільны холм”. У Беларусі мясцовае насельніцства часта называе курганы капцамі, валатоўкамі, французкімі ці шведскімі магіламі і інш.

Адзінкавыя грунтовыя ці курганныя пахаванні сустракаюцца рэдка, часцей яны ўтвараюць цэлыя групы – могільнікі.

Пахаванні і ў грунтовых, і ў курганных магілах маглі здзяйсняцца па абраду крэмацыі (трупаспалення) і інгумацыі (трупапакладання).

**Помнікі вытворчай дзейнасці чалавека.** Да іх адносяцца майстэрні, у якіх выраблялі каменныя, крамянёвыя прылады працы, бурштыновыя ўпрыгожанні, ажыццяўлялі металаапрацоўку і г.д.., а таксама – помнікі па здабычы адпаведнай сыравіны: шахты па здабычы крэменю, руды, ямы, у якіх здабывалі гліну для ганчарных майстэрняў і інш.

**Помнікі культавага і рэлігійнага прызначэння** – гэта культавыя месцы і збудаванні: свяцілішчы, капішчы, культавыя камяні, рэшткі храмаў, цэркваў і г.д.;

**Скарб –** гэта комплекс прадметаў, выключаных з выкарыстання і ўхаваных у тайніку (часцей у зямлі). У археалогіі ў паняцце "скарб"

укладаецца больш шырокі сэнс, чым у агульнапрынятым уяўленні. Для археолага скарбам з'яўляюцца не толькі каштоўныя прадметы, ўпрыгожванні альбо манеты. Сустракаюцца скарбы каменных, бронзавых і жалезных вырабаў, а таксама іх нарыхтовак. Такім чынам, вылучаюцца манетныя і рэчавыя скарбы. Мяркуецца, што схаваныя рэчы мелі вялікую вартасць для ўладальнікаў. Скарбы маглі ўзнікаць пры розных абставінах, напрыклад:

- як месца сховішча каштоўных прадметаў, сабраных ўладальнікам з мэтай захавання іх падчас вайны, рабунку;
- як падараванне ці ахвяры, якія складалі ў культавых месцах, так званыя ватыўныя скарбы;
- як месца сховішча прадметаў, якія перавозілі купцы па гандлёвых шляхах, так званыя купецкія скарбы.

**Культурны пласт** – пласт зямлі, які ўтварыўся ў выніку жыцця і дзейнасці чалавека. У культурным пласце захоўваюцца рэшткі збудаванняў, разнастайных канструкцый, прадметы матэрыяльнай культуры – асобныя рэчы. Культурны пласт утвараўся павольна, на працягу вякоў і тысячагоддзяў. Яго магутнасць (ад некалькіх сантыметраў да некалькіх метраў) залежыць ад працягласці і інтэнсіўнасці жыцця людзей на пэўным месцы.

Культурны пласт утвараўся паступова. Звычайна больш старажытныя слаі залягаюць глыбей, чым напластаванні пазнейшых часоў, таму вывучэнне паслядоўнасці залягання слаёў дазваляе рэканструяваць этапы засялення помніка.

**Стратыграфія** (ад лат. *stratum* – слой і грэч. *graphō* – пішу) – апісанне ўмоў залягання культурнага пласта археалагічнага помніка адносна геалагічных напластаванняў і іншых слаёў. Стратыграфія цесна звязаная з глебазнаўствам і геалогіяй.

Апісанне напластаванняў вядзецца паслядоўна па пластах зверху ўніз. Археолаг звяртае ўвагу на характар, колер, структуру глебы, вызначае наяўнасць прыродных і культурных уключэнняў, парушэнняў натуральнага залягання і інш.

Такім чынам, у археалогіі стратыграфія – гэта метад вывучэння культурных напластаванняў і вызначэння храналогіі помніка.

Археолагі вылучаюць адкрытыя і закрытыя комплексы. **Адкрытыя комплексы** фарміруюцца доўгі час і ўтрымліваюць рознагасовыя знаходкі. Да такіх комплексаў адносіцца культурны пласт паселішчаў. **Закрытыя комплексы** фарміруюцца цягам вельмі кароткага часу, і рэчы,

якія знаходзяцца ў такім комплексе, адначасовыя. Да закрытых комлексаў адносяцца скарбы, несапсаваныя пахаванні, спаленыя жытлы. Закрытыя комплексы – вельмі важныя для датавання, паколькі рэчы, якія ўваходзяць у іх склад, былі ізаляваны ад вонкавага ўздзеяння ў адзін і той жа час. Наяўнасць у закрытым комплексе манеты ці нейкай іншай датаванай рэчы дазваляе вызначыць больш ці менш дакладна дату ўтварэння гэтага комплексу.

## 3. Працэдура археалагічнага даследавання.

Археалагічныя даследаванні ўключаюць 3 этапы:

1) збор матэрыялаў;

2) апрацоўка матэрыялаў і папярэдні аналіз даных;

3) інтэрпрэтацыя даных, гістарычныя рэканструкцыі.

**3.1. Этап збору матэрыялаў** часта атаясамліваецца з палявымі працамі, калі праводзяцца археалагічныя разведкі і раскопкі. Для правядзення разведак і раскопак неабходна атрымаць Дазвол – афіцыйны дакумент, які выдаецца Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Усе самавольныя археалагічныя працы, у т.л. пошук артэфактаў з дапамогай металашукальнікаў, без Дазвола забаронены.

**Археалагічная разведка** – работы, накіраваныя на пошук і выяўленне новых археалагічных помнікаў, а таксама – на асэнсаванне на сучасным навуковым узроўні помнікаў, ужо вядомых па архіўным ці літаратурным даным.

Археолаг, пешкам абыходзячы пэўныя тэрыторыі, якія вызначыў папярэдне, збірае т.зв. “пад’ёмны матэрыял” – фрагменты керамікі, крамянёвыя артэфакты, каменныя ці жалезныя вырабы і інш. рэчы, якія знаходзяцца на паверхні зямлі, а таксама фіксуе рэшткі археалагічных аб'ектаў. Усе абследаваныя пункты даследчык адзначае на карце, усе помнікі фатаграфуе, апісвае ў сваім палявым дзённіку.

Для вызначэння стратыграфіі, плошчы помніка і яго папярэдняга датавання звычайна выкарыстоўваюцца зандажныя працы. На помніку закладаецца шурф – невялікі раскоп плошчай ад 1 м$^2$ да 24 м$^2$.

Акрамя таго, у археалогіі шырока выкарыстоўваюцца т.зв метады дыстанцыйнага зандавання, а таксама геафізічныя метады разведкі.

Да найбольш распаўсюджаных метадаў дыстанцыйнага зандавання адносіцца аэрафотаздымка. **Аэрафотаздымка** – візуальнае абследаванне мясцовасці з паветра пры дапамозе фота- ці відэакамеры. Падчас аэрафотаразведкі праводзіцца аэрафотаздымка ландшафта. На атрыманых

стэрэаздымках спецыяліст можа ўбачыць сляды дзейнасці старажытнага чалавека, якія не магчыма заўважыць пад час звычайнай археалагічнай разведкі.

**Геафізічныя метады** разведкі дазваляюць выяўляць аб'екты, якія знаходзяцца ў пласце глебы альбо глыбей яго. У выніку выкарыстання такіх метадаў спецыялісты знаходзяць рэшткі абарончых муроў, падмуркі будынкаў, рэшткі вогнішчаў, засыпаныя ямы і інш. аб'екты. Найбольш распаўсюджанымі метадамі, якія выкарыстоўваюцца ў археалагічнай практыцы, з'яўляюцца магнітаразведка і электраразведка.

У выніку правядзення археалагічных разведак – візуальных абследаванняў, пад'ёмных збораў матэрыялу, шурфоўкі – археолаг атрымоўвае папярэднюю інфармацыю аб часе існавання, культурнай прыналежнасці, функцыянальных асаблівасцях помніка. На падставе аналізу гэтых даных археолаг прымае рашэнне аб мэтазгоднасці правядзення археалагічных раскопак на канкрэтным помніку.

**Археалагічныя раскопкі** – асноўная і найбольш важная форма даследавання археалагічнага помніка. Мэтай раскопак з'яўляецца ўсебаковае вывучэнне помніка, вызначэнне яго функцыянальнай і культурнай прыналежнасці, стратыграфіі і храналогіі.

Раскопкі – найбольш адказная частка палявой працы, паколькі ў працэсе даследавання вывучемая частка помніка знішчаецца назаўсёды. Для правядзення раскопак выбіраюцца помнікі, якія могуць даць значныя навуковыя вынікі, альбо помнікі, якім паграджае знішчэнне.

Пры археалагічных раскопках важна не толькі выявіць нейкую старажытную рэч, ці нават збудаванне, але і высветліць характар культурных напластаванняў, паслядоўнасць залягання асобных праслоек, сувязь раскапаных аб'ектаў з вызначанымі праслойкамі і г.д. Таму раскопкі паселішчаў і грунтовых могільнікаў вядуцца дастаткова вялікімі плошчамі, а раскопкі курганоў праводзяцца толькі са здыманнем усяго насыпа і вывучэннем усей прасторы пад насыпам, а таксама прылеглай плошчы, на якой могуць знаходзіцца ровікі, прысыпкі, сляды трызны і г.д.

Раскопкі звычайна праводзяцца паслойна і пакавдратна. Археолаг, паслядоўна здымаючы пласты, фіксуе рэшткі аб'ектаў, а таксама вызначае размяшчэнне знаходак на плошчы раскопа.

Раскопкі праводзяцца ўручную лапатамі, шпатэлямі альбо нажамі. Часам культурны пласт дадаткова прасейваецца ці прамываецца.

Пад час раскопак археолаг вядзе палявы дзённік, у якім апісвае склад культурнага пласта, яго змяненне ў асобных месцах раскопа, дае

характарыстыку ўсіх аб’ектаў і знаходак. Пасля выбаркі культурнага пласта да мацярыка (узровень, ніжэй якога знаходкі адсутнічаюць) даследчык фіксуе вертыкальныя сценкі раскопа (так званыя профілі) і складае план мацярыковай паверхні, на якім адзначае ямы і іншыя аб’екты. Усе яны таксама дэталёва вывучаюцца.

Пасля завяршэння раскопак раскоп абавязкова засыпаецца. Калі вялося даследаванне кургана, то курганны насып аднаўляецца ў першапачатковым выглядзе.

На падставе палявой дакументацыі і вынікаў першаснай апрацоўкі знаходак археолаг складае Справаздачу аб палявых даследаваннях. У гэтай справаздачы адлюстроўваюцца этапы раскопак, апісваюцца вывучаныя аб’екты, выяўленыя матэрыялы, а таксама робяцца высновы аб асаблівасцях помніка, мэтазгоднасці правядзення далейшых даследаванняў і г.д. Завершаная навуковая справаздача перадаецца на захаванне ў архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.\

### 3.2. Апрацоўка матэрыялаў і папярэдні аналіз даных.

Сабраныя ў экспедыцыі матэрыялы апрацоўваюцца і вывучаюцца. Знаходкі ачышчаюць, шыфруюць (падпісваюць, указваючы звесткі аб помніку, годзе даследавання, месцы выяўлення артэфакта). Часта праводзяць кансервацыю і рэстаўрацыю знойдзенных рэчаў. **Кансервацыяй** называецца такая апрацоўка рэчаў, якая захоўвае іх ад дэфармацыі і разбурэння. **Рэстаўрацыя** – гэта аднаўленне першапачатковага выгляду пашкоджанай рэчы.

Асноўнай працай, якую выконвае археолаг на камеральным этапе, з’яўляецца аналіз і вывучэнне рэчаў.

Перш за ўсе, праводзіцца групіроўка, сістэматызацыя і класіфікацыя артэфактаў (паводле іх формы, прызначэння, матэрыялу, з якога яны выраблены і інш. крытэрыяў). У археалогіі найбольш распаўсюджанымі з’яўляюцца марфалагічныя класіфікацыі – г.зн., класіфікацыі, у падставу якіх пакладзены асаблівасці формы рэчаў. Устаноўлена, што знешняя форма вырабаў часта абумоўлена культурнай, храналагічнай, тэрытарыяльнай, функцыянальнай і інш. прыналежнасцю.

Важнай задачай, якая стаіць перад археолагам, з’яўляецца дакладнае вызначэнне сыравіны, з якой былі выраблены знойдзеныя артэфакты. Гэтыя даследаванні звычайна праводзяцца археолагамі ў супрацоўніцтве з прадстаўнікамі прыродазнаўчых навук: геалогіі і мінералогіі, хіміі, батанікі, заалогіі і г.д.

Істотнае месца ў археалагічнай працы належыць і тэхналагічнаму аналізу, калі даследчык вызначае спосаб вырабу той ці іншай знаходкі. Для вырашэння гэтай задачы выкарыстоўваюцца розныя метады: метады, запазычаныя ў тэхнічных навук, якія вывучаюць сучасныя тэхналагічныя працэсы (напр., кераміказнаўства, металаграфія і інш.), этнаграфічныя аналогіі (даныя аб спосабах вырабу рэчаў у народаў, блізкіх па свай культуры да першабытных), эксперыментальная археалогія (кірунак сучаснай навукі, калі даследчыкі ўласнаручна вырабляюць артэфакты, аналагічныя старажытным).

Для вызначэння функцыі рэчаў выкарыстоўваецца трасалагічны метад, які часта спалучаецца з эксперыментальнай археалогіяй. Археолагі вырабляюць прылады працы, тоесныя старажытным, і выкоьваюць імі самыя розныя віды працы. У выніку выкарыстання прылады на яе працоўных частках узнікаюць мікраслядыы зношанасці – розныя драпіны, запаліраванасці і г.д. Розныя віды матэрыялаў (рог, костка, скуры і г.д.) пакідаюць на прыладзе розныя віды слядоў спрацаванасці. Археолаг, вывучаючы з дапамогай мікраскопа археалагічныя артэфакты і выяўляючы на прыладзе пэўныя сляды зношанасці, можа высвестліць функцыі знаходкі, матэрыял, для апрацоўкі якога яны выкарыстоўвалася, спосаб захопу прылады рукой і г.д.

Важнае месца ў вывучэнні рэчаў належыць іх датаванню. У археалогіі выкарыстоўваецца дзве сістэмы датавання: адноснае і абсалютнае датаванне.

**Адносная храналогія** – гэта вызначэнне паслядоўнасці з’яў, падзей і інш.: “што адбывалася раней?”, “што адбывалася пазней?”, “што адбывалася адначасова?”. Адносная храналогія дае адказ на пытанні “перад чым?” і “пасля чаго?”.

На практыцы выкарыстоўваецца шмат метадаў адноснага датавання, пры гэтым асноўнымі метадамі з’яўляюцца тыпалагічны і стратыграфічны.

На сённяшні дзень у археалогіі распрацаваныя шматлікія тыпалогіі розных катэгорый артэфактаў (для канкрэтных рэгіёнаў, перыядаў і г.д.), якія ў пэўнай ступені адлюстроўваюць паслядоўнасць бытавання рэчаў. Новазнойдзены выраб параўноўваецца з ужо вядомымі артэфактамі, і такім чынам вызначаецца яго адносная храналогія.

Стратыграфічны метад дазваляе правесці адноснае датаванне знаходак па пластах, у якіх яны былі выяўлены (пласт, які размяшчаецца ніжэй, больш старажытны ў параўнанні з верхнімі напластаваннямі).

**Абсалютная храналогія** – гэта вызначэнне ўзроста помніка ў каляндарных датах (тысячагоддзе, стагоддзе, год, дзень). Абсалютная храналогія дае адказ на пытанне "калі?". Дакладнасць адказу можа быць розная (нават ± некалькі тысячагоддзяў).

Для абсалютнага датавання выкарыстоўваюцца розныя метады. Адзін з самых распаўсюджаных – **радыевугляродны метад** (метад датавання па радыеактыўнаму вугляроду С14). Гэты метад выкарыстоўваецца для датавання арганічных матэрыялаў (костка, вугаль, нагар на посудзе). Сутнасць метаду заключаецца ў наступным. У атмасферы пад уздзеяннем касмічных променяў утвараецца радыеактыўны ізатоп вуглярода з атамнай вагой 14. Кожны арганізм (расліна, жывёліна, чалавек) пад час свайго жыцця пастаянна засвойвае гэты ізатоп. Пасля смерці арганізму ўглярод перастае паступаць, а той, што назбіраўся, пачынае распадацца. Колькасць яго праз 5800 гадоў скараціцца ў два разы, праз 11600 гадоў – у чатыры разы і г.д. Калі ведаць колькасць С14 у вывучаемым узоры, то можна вызначыць дату смерці арганізма і, адпаведна, прадатаваць археалагічныя матэрыялы.

Актыўна выкарыстоўваецца і **дэндрахраналагічны метад**. У аснове метаду ляжыць закон прыроды, адпаведна якому кожны год таўшчыня ствала дрэва павялічваецца на адно гадавое кальцо, якое добра прагледжваецца на папярэчным зрэзе ствала. Калі год быў цеплым, сонечным і дастаткова вільготным, гадавое кальцо атрымоўваецца шырокім, калі год быў халодным і засушлівым – кальцо вузейшае. У дрэў аднаго гатунку, якія растуць у адным рэгіене, гадавыя кольцы падобныя. Аднак, натуральна, адны дрэвы старэйшыя, іншыя – маладзейшыя. Пры сумяшчэнні спектраў гадавых калец некалькіх такіх дрэў можна выявіць участкі, на якіх кольцы супадаюць. Менавіта такім чынам атрымоўваюць дэндрашкалу пэўнай даўжыні. У тым выпадку, калі такая дэндрашкала хаця б у адной кропцы прывязаная да каляндарнай даты (напр., датаваная радыевуглродным метадам), узнікае абсалютная шкала, якая дазваляе дакладна датаваць археалагічныя аб'екты і помнікі.

### 3.3. Этап інтэрпрэтацыі даных і гістарычных рэканструкцый

На папярэднім этапе даследавання археолаг правёў класіфікацыю знойдзеных пад час раскопак рэчаў, высветліў спосаб іх вырабу, функцыі і асаблівасці выкарыстання, вызначыў час існавання помніка. На падставе гэтых і некаторых іншых даных, атрыманых з дапамогай прыродазнаўчых навук, даследчык павінен адказаць на шэраг пытанняў: якое насельніцтва

жыло ў рэгіёне? чым характарызавалася яго гаспадарчая дзейнасць? сацыяльная структура? светапогляд? з якімі іншымі супольнасцямі кантактавалі тыя людзі? якім чынам адбываліся кантакты? Пошук адказаў на гэтыя і іншыя аналагічныя пытанні называецца па-рознаму: гістарычныя інтэрпрэтацыі, гістарычныя рэканструкцыі і г.д. Менавіта ў аднаўленні мінулага і заключаецца сутнасць апошняга і ў пэўнай ступені найбольш складанага этапу археалагічных даследаванняў.

Праца археолага нагадвае працу крыміналіста. І адзін, і другі, вывучаючы матэрыяльныя рэшткі дзейнасці чалавека, павінен рэканструяваць падзеі, сведкам якіх не з’яўляўся. Праца археолага ўскладняецца тымі акалічнасцямі, што матэрыяльных слядоў, як правіла, вельмі мала, часта яны не маюць адпаведнікаў у сучаснай культуры і таму незразумелыя, а падзеі, якія цікавяць даследчыка, маглі адбыцца і сотні тысячагоддзяў таму.

Аднім з ключавых падыходаў пры інтэрпрэтацыі даных з’яўляецца выкарыстанне паняцця “**археалагічная культура**”. Па меры назапашвання археалагічных крыніц археолагі сталі заўважаць падабенства археалагічных помнікаў на пэўных тэрыторыях. Такія групы помнікаў, абмежаваныя ў часе і ў прасторы і аб’яднаныя падабенствам тыпаў паселішчаў, пабудоў, пахавальнага абраду, керамікі, формаў прылад працы, зброі і ўпрыгожванняў, называюць археалагічнымі культурамі.

Кожная археалагічная культура мае сваю назву. Як правіла, гэта назва даецца:

- паводле назвы помніка, як даў найбольш прадстаўнічыя матэрыялы – напр., лінгбійская культура названа па стаянцы Лінгбі ў Даніі;
- паводле арэала (тэрыторыі распаўсюджвання помнікаў) – напр, днепра-данецкая культура;
- паводле спецыфічных рысаў матэрыяльнай культуры: артэфактаў, аб’ектаў, помнікаў – напр., культура шарападобных амфар, культура доўгіх курганаў.

Археолагі мяркуюць, што археалагічныя культуры ў пэўнай ступені адлюстроўваюць насельніцтва, якое ў старажытныя часы жыло ў тым ці іншым рэгіёне. Пры вылучэнні і вывучэнні археалагічных культур даследчыкі аднаўляюць гісторыю асобных тэрыторый, прасочваюць перамяшчэнне груп насельніцтва, іх сувязі з суседнімі і больш аддаленнымі супольнасцямі і г.д.

## 4. Археалагічная перыядызацыя

У 1836 г. дацкі вучоны Крысціян Томсан займаўся сістэматызацыяй калекцыі зброі Нацыянальнага музея ў Капенгагене. Ён падзяліў археалагічныя знаходкі, у залежнасці ад матэрыялу, з якога яны былі выраблены, на тры групы, і размясціў іх у эвалюцыйным парадку: каменныя, бронзавыя і жалезныя вырабы. Гэты падыход заклаў падмурак археалагічнай перыядызацыі. На працягу апошніх 150 гадоў такая сістэматызацыя неаднаразова ўдасканальвалася, аднак яна і дагэтуль застаецца актуальнай.

Такім чынам, у гісторыі чалавецтва вылучаюць каменны, бронзавы і жалезны вякі.

Каменны век падзяляецца на 3 перыяды: палеаліт (старажытны каменны век), мезаліт (сярэдні каменны век) і неаліт (новы каменны век).

Палеаліт пачаўся каля 3 млн. гадоў таму. Ён падзяляецца на ранні альбо ніжні (каля 3 млн. гг. таму – каля 150/120 тыс. гг. таму), сярэдні (каля 150/120 – 40/30 тыс. гг. таму), верхні альбо позні (40/30 тыс. гг. таму – 12 тыс. гг. таму), фінальны (каля 12 тыс. гг. таму – 10 тыс. гг. таму).

Мезаліт датуецца перыядам IX – V тыс. гг. да н.э.

Неаліт датуецца часам V – канец III тыс. гг. да н.э.

Бронзавы век датуецца часам: канец III / пачатак II тыс. да н.э. – VII ст. да н.э.

Перыядызацыя жалезнага веку ажыццяўляецца па заходнееўрапейскай схеме і па айчыннай, усходнееўрапейскай схеме. Па цэнтральнаеўрапейскай перыядызацыі ў жалезным веку вылучаюцца 4 перыяды: гальштацкі (VIII – V ст. да н.э.), латэнскі (V ст. да н.э. – мяжа н.э.), рымскі (першыя стагоддзі н.э.), эпоха вялікага перасялення народаў (350–450 гг. н.э.).

Па ўсходнееўрапейскай перыядызацыі жалезны век падзяляецца на ранні жалезны век (VII ст. да н.э. – V ст. н.э.) і позні жалезны век (V–VIII ст. н.э.).

Археалагічныя помнікі, якія датуюцца VII–XVIII ст. н.э., адносяцца да сярэднявечнага часу. Гэты час падзяляецца на 2 перыяды: ранняе сярэдневякоўе (да XIII ст.) і позняе сярэдневякоўе (XIV–XVIII ст.).

# ТЭМА 1. КАМЕННЫ ВЕК

## План

1. Палеаліт
   1.1. Ніжні (ранні) палеаліт
   1.2. Сярэдні палеаліт
   1.3. Верхні (позні) палеаліт
   1.4. Фінальны палеаліт
   1.5. Мастацтва чалавека эпохі палеаліту
2. Мезаліт
   2.1. Агульная характарыстыка эпохі
   2.2. Археалагічныя культуры.
   2.3. Духоўная культура чалавека эпохі мезаліту
3. Неаліт
   3.1. Агульная характарыстыка эпохі
   3.2. Неалітызацыя Еўропы
   3.3. Асаблівасці неалітычнай эпохі на тэрыторыі Беларусі
   3.4. Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху неаліту
   3.5. Духоўная культура насельніцтва тэрыторыі Беларусі эпохі неаліту

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 2*

Каменны век – найбольш працяглы перыяд у гісторыі чалавецтва, на працягу якога асноўнай сыравінай для вырабу прылад працы з'яўляўся камень (крэмень),

Са зменай умоў жыцця ў працэсе працоўнай дзейнасці мяняўся і сам чалавек – эвалюцыяніраваў яго інтэлект, удасканальваліся прылады працы і зброя, ускладняліся заняткі і побыт. З ўлікам гэтага навукоўцы падзяляюць каменны век на тры перыяды: палеаліт, мезаліт, неаліт

Кожны перыяд мае свае адметнасці, вызначальныя асаблівасці ў матэрыяльнай і духоўнай культуры, занятках чалавека.

# 1. Палеаліт

## 1.1. Ранні (ніжні) палеаліт

Гэты перыяд падзяляецца на дзве эпохі: алдувайскую і ашэльскую.

**Алдувайская эпоха** названая па стаянцы Алдувай у Паўднёвай Афрыцы. Усе выяўленыя алдувайскія помнікі знаходзяцца ў зоне з цеплым кліматам; асноўная іх частка адзначаецца ва Усходняй Афрыцы. Некаторыя алдувайскія артэфакты вядомыя таксама на поўначы кантыненту, Блізкім Усходзе і Закаўказзі.

Алдувайскай эпоха датуеца перыядам каля 3 млн. – 700 тыс. гадоў таму.

Найбольш старажытным помнікам алдувайскай эпохі з'яўляецца стаянка Када-Гона ў Эфіопіі (2,6–2,5 млн. гадоў таму назад), Каобі-Фора ў Кеніі (2 млн. гадоў) і інш.

Для алдувайскай эпохі характэрны груба апрацаваныя каменныя прылады. Выкарыстоўвалася параўнальна невялікая колькасць відаў прыладаў: 1) аббітыя кавалкі пароды (галькі і інш.), 2) сколы, адбітыя ад пароды (адшчэпы), 3) адбойнікі (камяні, якія выкарыстоўвалі для апрацоўкі пароды).

Аббітыя кавалкі пароды – як правіла, груба аббітыя камяні з некалькімі гранямі. Яны выкарыстоўваліся ў якасці ўдарнай прылады для апрацоўкі раслліннай і жывельнай ежы (т.зв. шматграннікі ці сфероіды), альбо прымяняліся для атрымання сколаў-нарыхтовак (нуклеусы). Характэрным тыпам прылад алдувайскай эпохі з'яўляюцца чоперы і чопінгі. Чоперы – гэта галечныя прылады, працоўны край якіх быў утвораны аббіўкай з адной паверхні. Чопінгі – прылады, працоўны край якіх сфарміраваны грубымі сколамі з дзвюх паверхняў. Функцыі чопераў і чопінгаў былі самыя разнастайныя (рубка галінак, рашчляненне туш жывёлін і інш.). Прылады працы былі яшчэ невялікімі па памерах (каля 8–10 см).

Знойдены адшчэпы, некаторыя з якіх маюць дробныя сляды аббіўкі па гранях (такі від апрацоўкі каменю і крэменю называецца рэтуш). Прылады з адшчэпаў выкарыстоўваліся для выканання самых розных дзеянняў.

У якасці прыладаў выступалі таксама косткі жывёл, пра што сведчаць знаходкі неапрацаваных костак са слядамі зношанасці і спрацаванасці.

Алдувайскія помнікі размяшчаліся на берагах рэк і азёр, у месцах, парослых дрэвамі. Надзейных доказаў існавання на такіх помніках жылых пабудоў няма. Аднак у Алдувайскай цясніне на адной са стаянак пры раскопках было выяўлена чатырохметровае кола з бальзату, якое, як мяркуюць, магло служыць падмуркам для прымітыўнага жытла ў выглядзе шалаша.

Прылады працы алдувайскага аблічча выраблялі перадусім Homo habilis (чалавек ўмелы), чыі парэшткі знойдзены на шматлікіх помніках. Аднак сёння даследчыкі не выключаюць, што такія прылады пачалі вырабляць яшчэ аўстралапітэкі. Нарэшце, самыя познія алдувайскія помнікі былі звязаныя з дзейнасцю архантрапаў – Homo ergaster ці Homo erectus.

Гамініды займаліся перадусім збіральніцтвам пладоў, карэнняў і інш. Аснову рацыёна складала менавіта раслінная ежа. На помніках знойдзены і шматлікія косткі жывёл, што сведчыць аб паступовым узрастанні ролі мяснога харчавання. Даследчыкі мяркуюць, што галоўнымі крыніцамі мяса для аўстралапітэкаў і хабілісаў былі тушы жывёл, якія загінулі натуральнай смерцю. Паляванне з’яўлялася перыядычным заняткам, і яго аб’ектамі былі жывёлы дробных памераў.

**Ашэльская эпоха** названа па стаянцы на тэрыторыі сучаснай Францыі. Эпоха датуецца перыядам каля 700–150/120 тыс. гг. таму. Найбольш старажытныя помнікі выяўлены на тэрыторыі Усходняй Афрыкі. У ашэльскую эпоху з’явіліся ўмовы для рассялення людзей таксама ў Еўропе (у прыватнасці, у Закаўказзі, Малдавіі, Прыкарпацці), на Блізкім Усходзе, у Паўднёвай Азіі.

У пачатку ашэля ў асобных раёнах Афрыкі яшчэ дажывалі свае часы апошнія аўстралапітэкі, але асноўнымі персанажамі новай эпохі сталі архантрапы. На заключных этапах з’явіліся першыя палеантрапы – неандэртальцы (Homo Sapiens Neanderthalensis).

У ашэльскі час распаўсюдзіліся новыя прылады працы – параўнальна вялікія артэфакты, апрацаваныя з двух бакоў (адсюль іх агульная назва – біфасы). Для іх вырабу пачалі выкарыстоўваць не толькі цвёрдыя пароды каменя, але і крэмень, які ў пазнейшыя часы стаў галоўным відам сыравіны.

Асноўнымі тыпамі прылад былі ручное рубіла і клівер. Ручное рубіла – гэта авальная, апрацаваная з двух бакоў, прылада даўжынёй 10–20 см, выробленая з валуну ці кавалку каменю. Рубілы былі

шматфункцыянальнымі прыладамі. Яны выкарыстоўваліся для рубкі і апрацоўкі дрэваў, для раструшчвання костак, для рэзання, скраблення і г.д.

Клівер (калун) адрозніваўся аб рубіла наяўнасцю прамога ці злёгку выпуклага сякучага ляза, якое не мела дадатковай апрацоўкі. Гэтыя прылады вылучаліся сваёй трохвугольнай, трапецыяпадобнай ці прамавугольнай формай. Кліверы таксама выкарыстоўваліся для выканання разнастайных відаў працы (нанясення ўдараў, рэзання, скраблення і г.д.).

Паступова павялічвалася колькасць і асартымент прыладаў, выробленых не з натуральных кавалкаў сыравіны, а з адшчэпаў (спецыяльных сколаў-нарыхтовак). Адшчэпы часта дадаткова апрацоўвалі рэтушшу і выкарыстоўвалі ў якасці нажоў, скрабачоў. Запатрабаванне ў такіх нарыхоўках садзейнічала ўдасканаленню тэхнікі апрацоўкі каменю і крэменю.

Да ашэльскага часу адносяцца першыя надзейныя звесткі аб выкарыстанні драўляных вырабаў. На шматлікіх помніках знойдзены абломкі дзід, палак-капалак, вастрый і г.д. Па-ранейшаму ва ўжытку знаходзіліся і касцяныя прылады – як правіла, косткі з мінімальнай апрацоўкай.

Пашырэнне тэрыторыі, занятай архантрапамі, было выклікана не толькі экалагічнымі, але і дэмаграфічнымі фактарамі – перадусім павялічэннем колькасці гамінід. Гэта, у сваю чаргу, было звязана са зменай гаспадарчых стратэгій. У ашэльскую эпоху атрымала распаўсюджанне сістэматычнае паляванне на буйных жывёл (сланоў, капытных жывёл і інш.). Аднак аснову жыццезабеспячэння па-ранейшаму складала збіральніцтва.

Вучоныя мяркуюць, што ў ашэлі пачаўся паступовы пераход насельніцтва да аседлага жыцця. Гэты працэс у розных рэгіёнах праходзіў па-рознаму. Даследчыкамі былі выяўлены шматлікія паселішчы некалькіх тыпаў. Вядомы і доўгачасовыя, і кароткачасовыя стаянкі. Выяўлены таксама майстэрні, якія размяшчаліся ў месцах, багатых на камень альбо крэмень. У гэтых майстэрнях чалавек праводзіў першапачатковую апрацоўку сыравіны. Знаходкі рэштак вогнішчаў сведчаць аб тым, што ў ашэльскі час чалавек навучыўся здабываць агонь. На выключаецца, што аседласць садзейнічала першаму падзелу працы – на жаночую і мужчынскую.

## 1.2. Сярэдні палеаліт

Традыцыйна гэты перыяд атаясамліваецца з **мусцьерскай эпохай,** якая атрымала сваю назву па стаянцы на тэрыторыі сучаснай Францыі. Датуецца часам каля 150/120 – 40/30 тыс. гг. таму.

Каля 250 тыс. гг. таму пачалі ўзнікаць новыя, не характэрныя для ашэля, тэхнікі апрацоўкі каменя. Працэс іх распаўсюджання цягнуўся прыкладна да 150 – 100 тыс. гг. таму, калі ў Еўропе, Заходняй Азіі і на большай частцы Афрыкі ўсталяваліся мусцьерскія традыцыі апрацоўкі каменнай і крамянёвай сыравіны.

Паралельна адбываліся грунтоўныя змены ў фізічнай будове чалавека. На змену архантрапам канчаткова прыйшлі палеаантрапы. Іх парэшткі знойдзены на тэрыторыі Афрыкі, Еўропы, Азіі. Палеаантрапы, якія існавалі ў розных рэгіёнах, мелі пэўныя адрозненні паміж сабой.

“Класічныя” неандэртальцы (Homo Sapiens Neanderthalensis) з’явіліся на тэрыторыі Еўропы не пазней за 130 тыс. гг. таму і жылі на яе абшарах цягам як мінімум 100 тыс. гг.

У канцы мусцьерскай эпохі пачалася эра неаантрапа – чалавека сучаснага тыпу (Homo Sapiens Sapiens, краманьёнца). Каля 40–35 тыс. гг. таму чалавек сучаснага тыпу пранік на тэрыторыю Еўропы, што ў археалагічным плане звязваецца з пачаткам наступнага перыяду – верхняга палеаліту.

Аснову матэрыяльнай культуры неандэртальцаў складалі вырабы з каменю і крэменю. Галоўная асаблівасць мусцьерскай індустрыі – павялічэнне ролі прыладаў, вырабленых з нарыхтовак – адшчэпаў. Яны станавіліся стандартызаванымі, удасканальвалася тэхніка іх атрымання. Для расшчаплення крэменю, акрамя масіўных каменных адбойнікаў, пачалі таксама выкарыстоўваць адбойнікі з косці і рогу.

У эпоху мусцье павялічылася колькасць тыпаў прылад працы. Характэрнымі вырабамі мусцьерскага часу з’яўляліся востраканечнікі, скрэблы і маленькія рубільцы. Востраканечнікі – гэта вастрыі, якія мелі трохвугольную форму і былі апрацаваныя рэтушшу толькі па краю і толькі па аднаму боку. Яны маглі прымяняцца ў якасці нажоў для рэзання мяса, скуры, дрэва, у якасці кінжалаў і наканечнікаў дзідаў. Характэрны для мусцье і розныя тыпы скрэблаў. Яны прадстаўлялі сабою авальныя, трохвугольныя ці прамавугольныя адшчэпы, апрацаваныя з аднаго ці некалькіх бакоў рэтушшу. Скрэблы выкарыстоўваліся пры апрацоўцы туш жывел, пры апрацоўцы скур і дрэва. Акрамя таго, як і ў папярэднюю эпоху, частку прыладаў пераважна рубячага дзеяння выраблялі з асобных

кавалкаў сыравіны. Аднак у мусцьерскі час іх памеры памяншаліся, а апрацоўка станавілася больш старannaй.

Драўляныя прылады вельмі рэдкія. Вядомы толькі адзінкавыя знаходкі – напрыклад, дзіда, знойдзеная на тэрыторыі Германіі. На завостраным канцу вырабу захаваліся сляды абпалу, якія сведчаць аб тым, што старажытны майстар мэтанакіравана апрацоўваў дрэва, імкнучыся зрабіць яго больш цвёрдым.

У якасці сыравіны выкарыстоўвалася таксама костка. Як правіла, яе апрацоўка была мінімальная. Цэлыя косткі і іх фрагменты выконвалі функцыі кавадлаў, адбойнікаў, прыладаў для капання і г.д. Часам костку апрацоўвалі такім жа чынам, як і камень – адбівалі адшчэпы і наносілі рэтуш.

Аснову гаспадарчай дзейнасці чалавека складала паляванне. У сувязі з тым, што неандэртальцы, займаючы вялікія тэрыторыі Еўропы, Азіі і Афрыкі, пражывалі ў неаднолькавых экалагічных умовах, аб’екты палявання і стратэгіі палявання ў розных рэгіёнах істотна адрозніваліся. Адным з асноўных аб’ектаў палявання быў мамант. Паляванне на мамaнта было паспяховым толькі ў тым выпадку, калі яно вялося калектыўна. Практыкаваліся таксама паляванне на зубраў, паўночных аленяў, дзікіх каней, пячорных мядзведзяў, а таксама на птушак. На некаторых помніках знойдзены своеасаблівыя зерняцёркі, што сведчыць аб тым, што ў мусцьерскую эпоху людзі займаліся збіральніцтвам.

Вядомы паселішчы розных тыпаў. У горных раёнах неандэртальцы часта жылі ў пячорах. У іншых раёнах людзі засноўвалі свае паселішчы на берагах рэк, у блізкасці ад крыніц пітнай вады і месцаў вадапою жывёл. Насельніцтва, якое пражывалаў прыледавіковых рэгіёнах, звычайна будавала наземныя жытлы і паўзялянкі, і ўзводзіла гэтыя канструкцыі з костак буйных жывёл, перадусім мамантаў. Па меры магчымасці ў якасці будаўнічага матэрыялу выкарыстоўваліся таксама камяні, галінкі дрэў і інш. Унутры жытлоў археолагі часта выяўляюць рэшткі вогнішчаў, якія сведчаць аб ацяпленні памяшканняў. Вядомыя таксама такія помнікі, як паляўнічыя лагеры, стаянкі-майстэрні і г.д. Для майстэрань характэрна вялікая колькасць расколатага крэменю і нязначная колькасць касцей жывёл. Кароткачасовыя паляўнічыя лагеры ўтрымліваюць невялікую колькасць культурных рэшткаў, звычайна сустракаюцца косткі жывёл. Доўгачасовыя паляўнічыя паселішчы характарызуюцца моцным культурным пластам з вялікаю колькасцю каменных прылад і фаўністычных рэшткаў.

Да мусцьерскага часу адносяцца першыя вядомыя пахаванні чалавека, якія даследчыкі звычайна звязваюць са з’яўленнем рэлігійных вераванняў. Пахаванні выяўлены на тэрыторыі і Еўропы, і Азіі. Яны былі грунтовыя, як правіла, размяшчаліся на тэрыторыі паселішчаў. Памерлых хавалі па абраду трупапакладання. Вядомы таксама пахаванні асобных частак цела. Напрыклад, археолагі неаднаразова вывучалі пахаванні, у якіх знаходзіліся толькі чарапы альбо толькі доўгія косткі і г.д. Часта сустракаюцца пахаванні, у косткі былі пасыпаныя вохрай. Пахавальны інвентар звычайна адсутнічаў.

У некаторых пахаваннях, акрамя парэштак людзей, выяўлены таксама косткі жывёл. Адным з найбольш вядомых неандэртальскіх пахаванняў з’яўляецца пахаванне хлопчыка 8–9 гадоў з грота Цешык-Таш ва Узбекістане. Каля касцей размяшчаліся некалькі пар буйных казліных рагоў, якія стваралі кола. У пахаванні ў пячоры Шанідар (тэрыторыя сучаснага Ірану) быў выяўлены пылок раслін. Гэта сведчыць аб тым, што на цела нябожчыка былі ўскладзены кветкі. На тэрыторыі Заходняй Еўропы выяўлены пахаванні ў каменных скрынях. У адной скрыні знаходзілася пахаванне чалавека, у другой – мядзведзя. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што існаванне такіх абрадаў з’яўлялася вынікам зараджэння культу жывёл.

Мусцьерскім часам датуюцца і нешматлікія праявы мастацтва: знойдзены нешматлікія вырабы, упрыгожаныя наразнымі рытмічнымі ямкамі і крыжыкамі, а таксама плямамі вохры.

У эпоху мусцье развівалася сацыяльная арганізацыя грамадства. Вядомы пахаванні фізічна абмежаваных людзей, інвалідаў. Напрыклад, у Шанідары было знойдзена пахаванне аднарукага неандэртальца. Натуральна, існаванне такіх людзей без патрымкі калектыву было немагчымае.

Разам з тым, у эпоху мусцье распаўсюджанай з’явай быў канібалізм. На шматлікіх помніках знойдзены раздробленыя і перамешаныя з косткамі жывёл чалавечыя косткі з выедзеным костным мозгам. Як мяркуюць даследчыкі, канфлікты былі неад’емнай часткай жыцця грамадства.

Мусцьерскім часам датуюцца і першыя сляды пранікнення чалавека на **тэрыторыю Беларусі.**

Зямлю Беларусі ў мусцьерскі час скоўвала вечная мерзлата. Перад ледавіком існаваў шырокі пас прыледавіковай пустэльні. На поўдзень прасціралася тундра і халодны стэп з адпаведнай чэзлай расліннасцю.

Толькі ў далінах рэк захоўваліся рэдкія пералескі з карлікавай бярозы, вербаў, кустоўя. Адпаведным клімату і расліннасці быў і жывёльны свет, які складаўся з тыповых прадстаўнікоў тундры і лесатундры (паўночныя алені, пясцы, белыя курапаткі), лесу (высакародныя алені, бурыя мядзведзі), стэпу (зубры, коні, лісы), а таксама жывёлін, што маглі існаваць у розных зонах. Асабліва характэрнымі для прыледавіковай фауны былі маманты і валасатыя насарогі – асноўны аб’ект палявання палеалітычных жыхароў.

Адзінкавыя знаходкі з крэменю, якія мелі мусцьерскія рысы (вастраканечнік, скрэбла-нож і інш.), былі выяўлены выпадкова каля в. Свяцілавічы, каля в. Абідавічы ў Быхаўскім раёне, каля в. Бердыж Чачэрскага раёна.

Нешматлікасць знаходак не дазваляе даследчыкам дакладна вызначыць, адкуль і калі чалавек прыйшоў на тэрыторыю Беларусі. Бліжэйшыя помнікі мусцьерскага часу знойдзены ў Падзесенні, Паволжы, Прыкам’і. Найбольш верагодны перыяд з’яўлення людзей на тэрыторыі нашай краіны – 100–35 тыс. гг. таму.

Сталае засяленне тэрыторыі Беларусі варта звязваць з пазнейшай эпохай – верхнім палеалітам, калі ўжо з'явіўся чалавек сучаснага тыпу (краманьёнец).

## 1.3. Верхні палеаліт

Эпоха верхняга палеаліту датуецца перыядам 40/30 – 14 тыс. гг. таму. У гэты час адбывалася далейшае развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры чалавека. Верхні палеаліт – час панавання неаантрапа, альбо чалавека сучаснага тыпу (Homo Sapiens Sapiens, краманьёнца).

Самыя старажытныя парэшткі Homo Sapiens Sapiens (косткі ўзростам каля 100 тыс. гг.) знойдзены на тэрыторыі Паўднёвай і Усходняй Афрыкі. Косткі неаантрапаў, якія датуюцца часам 100–70 тыс.гг. таму, знойдзены на Блізкім Усходзе, у ізраільскіх пячорах. Каля 50–60 тыс. гг. таму пачалося рассяленне краманьёнца за межы Афрыкі і Блізкага Усходу. Каля 40–35 тыс. гг. таму чалавек сучаснага тыпу пранік на тэрыторыю Еўропы. У канцы верхняга палеаліту крамаьёнец засяліў тэрыторыю Паўночнай Амерыкі, Аўстраліі і Акіяніі. Як мяркуюць даследчыкі, у працэсе рассялення розныя папуляцыі краманьёнцаў былі вымушаны дапасоўвацца да розных экалагічных умоў, што паступова вяло да фарміравання рас. На тэрыторыі Еўропы краманьёнцы пэўны час суіснавалі з неандэртальскім

насельніцтвам. Асаблівасці гэтага суіснавання, дакладны час і прычыны знікнення неандэртальцаў дагэтуль застаюцца не высветленымі.

Пачатак верхняга палеаліту характарызуецца наступленнем карэнных змен у тэхніцы і спосабах апрацоўкі сыравіны.

1) Вядучым тыпам нарыхтоўкі становяцца не адшчэпы, а доўгія сколы параўнальна сіметрычных абрысаў – т.зв. пласціны. Для іх атрымання выкарыстоўваліся не плоскія нуклеусы, як у папярэдні час, а нуклеусы прызматычнай формы. Пры расшчапленні крэменю пачалі прымяняць не толькі аббіўку (г.зн. удар пры дапамозе адбойніка), але і прынцыпова новую тэхніку – адціскную, калі на сыравіну ўздзейнічалі дакладна разлічаным націскам пры дапамозе дадатковых прыстасаванняў (адціскальнікаў). Гэта дазваляла атрымоўваць нарыхтоўкі больш сіметрычных і правільных абрысаў. З пласцін-нарыхтовак выраблялі вялікую колькасць разнастайных крамянёвых прылад. Найважнейшымі з іх былі: разцы, якія служылі для апрацоўкі косці, рога, дрэва; скрабкі з паўкруглым дасканала адрэтушаваным лязом, прыстасаваным для скраблення скур; праколкі, якія служылі для свідравання дрэва і косці, для праколвання скур і г.д.

2) З’яўленне і распаўсюджанне шматлікіх і разнастайных касцяных і рагавых прыладаў працы: наканечнікаў дзідаў і дроцікаў, гарпуноў, наканечнікаў матык і кірак, шылаў, іголак і г.д. Для вырабу гэтых прыладаў пачалі выкарыстоўваць метады, якія не был вядомыя ў папярэднія эпохі: рэзанне, свідраванне, шліфаванне і г.д. Многія касцяныя прадметы ўпрыгожваліся гравіраванымі схематычнымі малюнкамі, а зрэдку – і выявамі жывёл, людзей.

Эпоха верхняга палеаліту – час пахаладання, калі на вялікіх еўрапейскіх абшарах сфаміраваліся аднародныя ландшафты, флора і фауна якіх былі характэрныя для раёнаў тундры, лесатундры. Гэта эпоха – час панавання т.зв. “мамантавай фауны”. Асноўным аб’ектам палявання быў мамант, аднак паляванне вялося таксама на шарсцістага насарога, пячорнага ільва, паўночнага аленя, дзікага каня, быкоў і інш. жывел. Як мяркуюць даследчыкі, у якасці паляўнічай зброі выступала кап’якідалка – своеасаблівае кароткае кап’ё (дзіда). Значную ролю ў гаспадарцы людзей верхняга палеаліту іграла паляванне на дробных жывел: зайцаў, суркоў і птушку. Мяркуюць, што паляванне на іх вялося пры дапамозе разнастайных сілкоў. Рыбалоўства яшчэ адыгрывала нязначную ролю.

У верхнепалеалітычны час істотна павялічылася колькасць паселішчаў (стаянак). Ва ўмовах халоднага клімату чалавек быў

вымушаны будаваць трывалыя жытлы з ацяпленнем. Узводзіліся і наземныя жытлы, і заглыбленыя ў глебу паўзямлянкі. Найбольш важным канструктыўным элементам жылых пабудоў быў каркас з біўняў маманта, абкладзены ў аснове іншымі косткамі гэтай жывёліны. Паверх костак шчыльна ўкладаліся скуры. Найбольш распаўсюджаным тыпам жытла былі невялікія збудаванні акруглай у плане формы. Былі распаўсюджаны і доўгія жытлы, якія як бы складаліся з некалькіх акруглых хацін. Па доўгай восі такога жытла размяшчаўся ланцужок вогнішчаў. Побач з жытламі археолагі выяўляюць разнастайныя ямы гаспадарчага прызначэння.

Для верхнепалеалітычнага часу характэрна павялічэнне колькасці пахаванняў і ўскладненне пахавальнага абраду. Найбольш старажытныя пахаванні краманьёнцаў, якія датуюцца каля 100 тыс. гг. таму, выяўленыя на гары Кармэль на тэрыторыі Ізраэля. У грунтовых ямах былі пахаваныя мужчыны, жанчыны і дзеці. Каля пахаваных змяшчаўся пахавальны інвентар.

Шматлікія пахаванні адзначаюцца і на тэрыторыі Заходняй Еўропы. Напрыклад, у Італіі было выяўлена т.зв. “пахаванне князя”. У пячоры Арэна Кандзіда быў знойдзены шкілет маладога мужчыны, забітага ў выніку ранення ў шыю. Чалавечыя парэшткі былі пасыпаныя чырвонай вохрай і жоўтым фарбавальнікам. У пахаванні знаходзіліся шматлікія пацеркі з іклаў маманта, фрагменты рогу з гравіроўкамі, крамянёвыя прылады працы.

Вядомы пахаванні і на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Аднымі з самых відовішчных пахавальных помнікаў з’яўляюцца пахаванні, выяўленыя на стаянцы Сунгір каля р. Уладзімір. Археолагамі былі адкрыты пахаванні, якія датуюцца часам каля 25 тыс. гадоў таму назад. На дне магіл быў знойдзены вугаль. У першым пахаванні знаходзіўся шкілет мужчыны 55–65 гадоў. На грудзях у яго была знойдзена свідраваная падвеска з галькі, на руках больш за 20 бранзалетаў з біўня маманта. На шкілеце было сабрана некалькі тысяч касцяных пацерак, якія былі калісьці нашыты на адзенне. Іх размяшчэнне дазволіла даследчыкам рэканструяваць касцюм, які складаўся са скуранай ці замшавай кашулі тыпу маліцы, доўгіх скураных штаноў і абутку тыпу макасінаў. На ягонай галаве была шапка, таксама ўпрыгожаная трыма радамі пацерак і пясцовымі ікламі. У другім пахаванні знаходзіліся шкілеты падлеткаў (дзяўчынка 7–8 гадоў і хлопчык 12–13 гадоў), прыціснутыя адзін да другога галавамі. Побач з кожным шкілетам знаходзіліся дзіды з рашчэпленых біўняў маманта. На руках пахаваных былі надзеты касцяныя бранзалеты.

У верхнім палеаліце ўзнікала своеасаблівае мастацтва, прадстаўленае пячорным жывапісам, скульптурай з косці і каменю і гравіроўкай на касцяных пласцінах.

У верхнепалеалітычны час адбывалася далейшае ўскладненне культурнай сітуацыі. На тэрыторыі Еўропы і Азіі археолагамі вылучаны некалькі дзесяткаў археалагічных культур, для кожнай з якіх характэрныя асаблівасці ў тэхніцы апрацоўкі крэменю і інш. відаў сыравіны, спосабах вырабу прыладаў працы, домабудаўніцтве, гаспадарчай дзейнасці і г.д.

**На тэрыторыі Беларусі** пакуль вядомыя і даследаваныя дзве стаянкі верхняга (позняга) палеаліту: каля в. Бердыж і в. Юравічы. Яны знаходзяцца на паўднёвым усходзе рэспублікі ў Гомельскай вобласці.

Прыродныя ўмовы для жыцця людзей у верхнепалеалітычны час былі неспрыяльныя. Паўночныя вобласці займаў ледавік апошняга зледзянення. На поўдзень ад яго шырокай паласой прасціраліся забалочаныя нізіны і тундра, халодныя стэпы. Найбольш верагодна, была заселена толькі паўднёвая частка Беларусі.

Самае старажытнае паселішча выяўлена ў 1928 г. каля сучаснай в. Юравічы Калінкавіцкага раёна. На помніку былі знойдзены цэлыя і разбітыя косткі мамантa, каня, быка. некалькі дзесяткаў крамянёў са слядамі апрацоўкі, прылады, такія як скрабкі, разцы, пласціны і інш. Паселішча датуецца часам каля 26 тыс. гг. таму.

Яшчэ адна стаянка была знойдзеная ў 1926 г. на Пасожжы. Стаянку назвалі Бердыжскай. Дакладнае датаванне паказала, што людзі тут жылі каля 23–24 тысяч гадоў назад.

Бердыжцы мелі даволі разнастайны набор крамянёвых прылад працы і паляўнічай зброі: нажы розных тыпаў, кінжалы, разцы, скрабкі, пласцінкі з рэтушаваным краем. Аналагічнай тэхнікай вырабаў старажытных прылад валодалі многія плямены Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія стварылі так званую касцёнкаўска-аўдзееўскую культуру. Культуравызначальнымі прыладамі з'яўляюцца наканечнікі «з бакавой выемкай» і нажы «касцёнкаўскага тыпу». У Бердыжы знойдзены даволі шматлікія косткі жывёл, пераважна мамантаў.

Як былі спланаваны стаянкі каля Бердыжа і ў Юравічах, даведацца немагчыма. Справа ў тым, што летнімі часамі адтайвалі верхнія пласты зямлі і пачыналі павольна спаўзаць па вечнай мерзлаце на ніжэйшыя ўчасткі. Разам з імі перамяшчаліся і рэшткі жытлоў, у выніку чаго касцяныя канструкцыі і агнішчы поўнасцю разбураліся.

Доўгі час археолагі меркавалі, што стаянкі выконвалі функцыю паселішчаў. Сёння даследчыкі прыйшлі да высновы, што помнікі з'яўляліся месцамі забою і раздзелкі жывёл – кароткатэрміновымі паляўнічымі лагерамі.

### 1.4. Фінальны палеаліт

Фінальны палеаліт датуецца перыядам 14 – 10 тыс. гг. таму. Гэта быў час паступовага адыходу ледніку на поўнач. Адступанне ледавіка не было паступовым, здараліся і зацяжныя пахаладанні.

У новых умовах нязначнага пацяплення наступілі змены флоры і фауны. Знікла мамантавая фауна (маманты, валасатыя насарогі і інш.). Фінальны палеаліт – час панавання паўночнага аленя, які і стаў асноўным аб'ектам палявання старажытнага чалавека. Паўночныя алені – жывёлы міграцыйныя, якія летнім часам перамяшчаліся да ўзбярэжжа Балтыкі, а зімой – на поўдзень, у раён Палесся, Прыкарпацця і інш. Адпаведна за сваёй дабычай павінны былі перамяшчацца і паляўнічыя. Гэтыя акалічнасці вялі да змянення матэрыяльнай і, верагодна, духоўнай культуры старажытнага чалавека.

Неабходнасць палявання на паўночнага аленя выклікала з'яўленне новых відаў зброі. Паляванне на жывёлу, якая перамяшчалася хутчэй, чым паляўнічы, з дапамогай дзіды было неэфектыўным. Таму ў фінальнапалеалітычны час атрымалі распаўсюджанне лук і стрэлы.

Для сваіх паселішчаў людзі фінальнапалеалітычнага часу выбіралі сухія месцы на карэнным беразе або на ўчастках надпоймавых тэрас буйнейшых рэк. Адсутнасць на стаянках тоўстых культурных напластаванняў, рэшткаў вялікіх доўгачасовых збудаванняў і невялікая колькасць знаходак сведчаць аб тым, што чалавечыя калектывы былі не толькі малалікімі, але і часта перамяшчаліся з месца на месца. Таму стаянкі былі пераважна месцамі іх кароткачасовага знаходжання. Плошчы паселішчаў былі невялікімі. Жытлы будаваліся з жэрдак, накрываліся, відавочна, карой або скурамі, у плане былі авальнымі або акруглымі. Як правіла, збудаванні заглыбляліся ў зямлю на 20-30 см. Навокал жытлаў размяшчаліся вогнішчы і гаспадарчыя ямы, у якіх, верагодна, захоўваліся харчовыя запасы. На некаторых стаянках былі знойдзены скапленні крамянёвых прылад працы і адыходаў іх вытворчасці – своеасаблівыя майстэрні, працоўныя месцы майстраў.

У гэты час у Еўропе фарміруюцца шматлікія археалагічныя культуры. Варта спыніцца на тых культурах, якія маюць дачыненне да тэрыторыі Беларусі.

У фінальнапалеалітычны час на захад Беларусі з тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы пранікалі групы насельніцтва лінгбійскай і свідэрскай культур.

**Лінгбійская культура** атрымала сваю назву па аднайменнай стаянцы ў Даніі.

*Арэал* культуры ахопліваў тэрыторыі Даніі, Паўднёвай Швецыі, Германіі, Польшчы, Паўднёвай Літвы, Заходняй Беларусі, Паўночна-Заходняй Украіны.

*Помнікі.* Паселішчы носьбітаў культуры размяшчаліся на высокіх тэрасах. Жытламі былі наземныя збудаванні тыпу чумаў.

*Крамянёвы інвентар* лінгбійскага насельніцтва характарызуецца масіўнасцю форм і вузкім наборам прылад. Іх асноўным паляўнічым узбраеннем былі лук са стрэламі, наканечнікамі для якіх служылі масіўныя лістападобныя вастрыі з тоўстымі чаранкамі, падпраўленымі рэтушшу толькі са спінкі. Для вырабу наканечнікаў выкарыстоўвалі падоўжаныя адшчэпы – т.зв. пласціністыя адшчэпы. Шырока распаўсюджанымі вырабамі былі разцы на масіўных адшчэпах, акруглыя скрабкі.

На заходнееўрапейскіх помніках лінгбійскай культуры сустракаюцца таксама сякеры альбо матыкі, вырабленыя з рагоў паўночных аленяў.

Асноўным гаспадарчым заняткам насельніцтва з’яўлялася паляванне на паўночных аленяў.

*Паходжанне і гістарычны лёс* культуры дакладна не высветлены. Большасць даследчыкаў лічаць, што лінгбійская культура склалася на падставе позніх верхнепалеалітычных культур. У сваю чаргу, лінгбійская культура стала адным са складнікаў пазнейшых фінальнапалеалітычных культурных адзінак, у прыватнасці, свідэрскай культуры.

На паўднёвым захадзе і захадзе Беларусі адзначаюцца і помнікі **свідэрскай культуры.** Культура названа па матэрыялах помніка Свідры Вельке, што на тэрыторыі Польшчы каля Варшавы.

*Арэал.* Помнікі гэтай культуры вядомы на шырокай тэрыторыі, якая ахоплівала Польшчу, Літву, Украіну і Беларусь. Асобныя групы носьбітаў культуры праніклі нават у басейн Дзясны і Верхняй Волгі.

*Помнікі.* Паселішчы носьбітаў культуры размяшчаліся на высокіх тэрасах. Жытламі былі наземныя акруглыя збудаванні з вогнішчамі.

*Крамянёвы інвентар.* Свідэрскае насельніцтва рабіла прылады на пласцінах, адбіваючы іх з нуклеусаў насустрач адна адной. Сярод паляўнічай зброі звяртаюць на сябе ўвагу доўгія лазалістай формы наканечнікі стрэл, часта з вылучанымі чаранкамі. У інвентары было таксама шмат разнастайных разцоў, скрабкоў, праколак. Для апрацоўкі дрэва і разбірання туш дзічыны служылі крамянёвыя авальныя і са звужэннем на корпусе сякеры.

Для вырабу сваіх прыладаў працы свідэрскае насельніцтва выкарыстоўвала якасны крэмень, які не толькі збірала з паверхневых россыпаў, але і здабывала шляхам капання адкрытых выпрацовак.

Асноўным гаспадарчым заняткам насельніцтва з’яўлялася паляванне на паўночных аленяў.

*Паходжанне.* Як адзначае большасць даследчыкаў, свідэрская культура склалася ў выніку складаных трансфармацыі ўсходніх груп лінгбійскай культуры.

*Гістарычны лёс.* З канцом ледавіковай эпохі і ўходам асноўнага аб’екта палявання – паўночнага аленя – на поўнач частка свідэрскага насельніцтва мігравала ў паўночным, паўночна-ўсходнім кірунку. Частка носьбітаў культуры засталася ў ранейшых рэгіёнах пражывання і адаптавалася да новых прыродных умоў. Свідэрская культура аказала пэўны ўплыў на фарміраванне культур ранняга мезаліту.

Усходняя Беларусь у фінальным палеаліце была заселеная прадстаўнікамі мясцовай **грэнскай культуры,** названай так па стаянцы каля в. Грэнск Чачэрскага раёна на Гомельшчыне. Грэнская культура была вылучана па матэрыялах стаянак, размешчаных у басейне р.Сож.

*Арэал.* Найбольш значныя паселішчы, пакінутыя грэнскім насельніцтвам, знойдзены на ўзбярэжжах Дняпра (Магілёўская і Гомельская вобласці, а таксама на Смаленшчыне), на Бярэзіне і на азёрах Дзвінска-Бярэзінскага водападзелу.

*Помнікі.* Паселішчы носьбітаў культуры размяшчаліся на высокіх тэрасах. Жытлы былі наземныя, адзначаюцца таксама і паўзямлянкі.

*Крамянёвы інвентар.* Для вырабу прыладаў працы насельніцтва выкарыстоўвала мясцовы “сожскі” крэмень, які характарызаваўся параўнальна нізкай якасцю. Таму асноўным відам нарыхтоўкі былі не пласціны, а адшчэпы. Асаблівасцю грэнскай культуры з'яўляецца наяўнасць у інвентары своеасаблівых асіметрычных наканечнікаў стрэл (т.зв. “наканечнікі грэнскага тыпу”). Рабілі іх, як правіла, не на доўгіх правільна агранеными пласцінах, а на адшчэпах. Насельніцтва карысталася

таксама разнастайнымі разцамі, якімі апрацоўвалі пераважна рог і костку, невялікімі скрабкамі, праколкамі і інш.

Асноўным гаспадарчым заняткам насельніцтва з’яўлялася паляванне на паўночных аленяў.

*Паходжанне* культуры дакладна не вызначанае. Даследчыкі выводзілі грэнскую культуру з некаторых верхнепалеалітычных культур, лічылі яе роднаснай лінгбійскай культуры і г.д.

*Гістарычны лёс.* Пасля заканчэння ледавіковай эпохі частка грэнскага насельніцтва перасялілася на ўсход і паўночны ўсход, даўшы пачатак мезалітычным культурам Волга-Окскага міжрэчча і Падзесення. Аднак на тэрыторыі Беларускага Падняпроўя носьбіты грэнскай культуры працягвалі існаваць і ў раннім мезаліце. Іх удзел у фарміраванні мясцовых мезалітычных традыцый пакуль дакладна не высветлены.

## 1.5. Мастацтва чалавека эпохі палеаліту

**Ніжні і сярэдні палеаліт.** У якасці сведчанняў мастацкай дзейнасці чалавека гэтага перыяду даследчыкі разглядаюць ўпрыгожанні і прадметы дробнай пластыкі (фігуратыўныя выявы), а таксама прадметы з нарэзкамі, насечкамі і г.д.

1) Найбольш старажытныя ўпрыгожанні – пацеркі са шкарлупіны страусінага яйца, узрост якіх дасягае каля 200 тыс. гг.– былі знойдзены на тэрыторыі Афрыкі. На некаторых маладзейшых еўрапейскіх помніках выяўлены ўпрыгожанні ў выглядзе пацерак і прасвідраваных зубоў і фалангаў млекакормячых.

2) Найбольш старажытная антрапаморфная выява, выразаная з мягкай галькі, знойдзена на ашэльскай стаянцы на тэрыторыі Блізкага Усходу (у Ізраэлі). Яе узрост – каля 200 тыс. гг. Своеасаблівая выява чалавечага твару была выяўлена на мусцьерскім помніку на тэрыторыі Францыі.

3) Абломкі костак з разнастайнымі меткамі (нарэзкамі, насечкамі, штрыхамі, плямамі фарбаў і г.д.) пачалі выкарыстоўваца яшчэ ў ашэльскую эпоху. Мусцьерскім часам датуецца некалькі дзесяткаў такіх артэфактаў. Даследчыкі не маюць адзінага меркавання адносна іх функцый. Некаторыя спецыялісты мяркуюць, што чалавек, наносячы на косткі нарэзкі альбо насечкі, укладваў у гэтыя меткі адмысловы сэнс, разглядаў іх як матэрыяльнае ўвасабленне пэўных паняццяў. Іншыя аўтары лічаць, што чалавек такім чынам асвойваў самыя простыя мастацкія выяўленчыя сродкі.

**Верхні палеаліт.** У гэты час развівалася выяўленчае мастацтва, прадстаўленае пячорным жывапісам, прадметамі буйной і дробнай пластыкі (барэльефы і скульптуры з косці і каменю) і гравіроўкай на касцяных пласцінах.

1) Да цяперашняга часу вядома звыш 300 пячор з рэшткамі палеалітычнага жывапісу. Найбольшая колькасць помнікаў адзначаецца на тэрыторыі Еўразіі, перадусім у Франка-Кантабрыйскім рэгіёне (сумежыя раёны Францыі і Іспаніі). У меншай колькасці помнікі мастацтва вядомы ў Альпах, Маравіі, Украіне, Сярэднерускай раўніне, Сібіры.

Асноўным зместам палеалітычнага мастацтва з’яўляюцца выявы жывёл: маманта, бізона, тура, каня, аленя, насарога, мядзведзя, льва і г.д. Выявы чалавека вельмі рэдкія. Сярод іх сустракаюцца малюнкі людзей з галавой жывёліны альбо птушкі (магчыма, маскі). Калі жывёлы адлюстраваны ў рэалістычнай манеры, у колер, то выявы людзей – графічныя і схематычныя.

Функцыі палеалітычных малюнкаў дакладна не вядомыя. Шматлікімі даследчыкамі агучваліся розныя тлумачэнні. Так, не выключаецца, што малюнкі жывел маглі быць звязаныя з першабытным культам жывёл, з паляўнічай магіяй. Выказваліся меркаванні, што пячоры, у якіх знаходзідіся выявы, маглі быць месцамі ініцыяцый, культавых практык. Аднак пытанне гэта дагэтуль застаецца вельмі дыскусійным.

2) На верхнепалеалітычных помніках часта сустракаюцца прадметы буйной і дробнай пластыкі. Да першай катэгорыі адносяць барэльефы (амаль усе яны выяўлены на тэрыторыі Францыі). Другую катэгорыю складаюць антрапаморныя і зааморфныя статуэткі. Яны былі шырока распаўюджаны на тэрыторыі Еўразіі.

Найбольш характэрныя знаходкі верхнепалеалітычнага мастацтва – т.зв. “палеалітычныя Венеры” – скульптурныя выявы аголеных жанчын, якія стаяць у поўны рост, склаўшы на жываце рукі. Галава ў фігурак часта адсутнічае альбо паказаная вельмі абагульнена, без індывідуальных рысаў. Асобныя часткі цела (жывот, грудзі, сцёгны) выразна падкрэсленыя. Як правіла, скульптуркі мелі невялікія памеры (звычайна каля 5–12 см у вышыню) і былі выраблены з з косці ці каменю.

Вядомыя і шматлікія скульптурныя выявы жывёл (кошкі, мядзведзі, маманты, бізоны, быкі і г.д.). Звычайна іх выраблялі з косткі ці каменю. На паселішчы Дольні Вестоніцэ на поўдні Чэхіі знойдзены фігуркі, вырабленыя з абпаленай гліны. Іх абпальвалі ў спецыяльнай печы, размешчанай у адной з пабудоў.

Даследчыкамі выказваліся самыя разнастайныя меркаванні адносна функцый статуэтак. Напрыклад, жаночыя фігуркі разглядаліся ў якасці адлюстравання культу Багіні-маці ці сямейнай заступніцы, лічыліся своеасаблівым фецішам для магічных практык, прымаліся за доказы існавання матрыярхату і г.д. Аднак пытанне гэта дагэтуль застаецца дыскусійным, і праблема прызначэння статуэтак па-ранейшаму не вырашана.

3) У верхнепалеалітычны час шырока распаўсюдзілся гравіроўка па касці і каменю. Графічныя выявы шматлікія і разнастайныя: абстрактныя лініі, геаметрычныя арнаменты, выявы людзей і жывёл.

## 2. Мезаліт

### 2.1. Агульная характарыстыка эпохі

Прыкладна 10 тыс. гадоў таму (ці каля 9 тыс. гг. да н.э.) закончыўся ледавіковы перыяд. Знікненне ледавіка прывяло да значных змен прыроднага асяроддзя – рэзкага пацяплення. Флора і фауна Цэнтральнай, Усходняй Еўропы набыла сучасны выгляд. Паўночны алень міграваў на поўнач. Частка фіальнапалеатычнага насельніцтва мігравала за аб’ектам палявання, частка засталася на асвоеных тэрыторыях і была вымушана прастасоўвацца да новых умоў. З гэтага часу бярэ адлік новая эпоха, якая атрымала назву “мезаліт”. Асновай гаспадаркі мезалітычнага насельніцтва было паляванне, збіральніцтва і рыбалоўства. Гаспадарчыя прыярытэты чалавека знайшлі сваё адлюстраванне ў матэрыяльнай культуры. Вызначальнымі асаблівасцямі мезалітычнай эпохі з’яўляюцца наступныя рысы:

1) Шырокае і паўсюднае распаўсюджанне лука і стрэл. Гэтая зброя з’явілася яшчэ ў палеалітычны час. У мезаліце, у параўнанні з папярэдняй эпохай, адзначаюцца крамянёвыя наканечнікі стрэл больш разнастайных абрысаў і больш стандартызаванай формы, памеры артэфактаў істотна памяншаюцца. Параўнальна частай знаходкай з’яўляюцца і рэшткі драўляных лукаў і дрэвак стрэл. Як мяркуюць даследчыкі, у мезалітычны час паляванне стала індывідуальным заняткам.

2) Распаўсюджанне новых і істотнае ўдасканаленне раней вядомых тэхнік і спосабаў апрацоўкі крэменю. Свайго росквіту дасягае адціскная тэхніка расшчаплення, накіраваная на атрыманне рэгулярных пласцін-нарыхтовак, неабходных для вырабу стандартызаваных прылад працы. Вялікае значэнне набывае ўкладышавая тэхніка, заснаваная на

выкарыстанні мікралітаў – дробных вырабаў памерамі 1–3 см, апрацаваных рэтушшу. Мікраліты мелі разнастайныя формы, вельмі часта геаметрычныя: трохвугольнікі, трапецыя, ромбы і г.д. Яны выкарыстоўваліся ў якасці ўкладышаў для састаўных прылад працы (стрэл, гарпуноў і г.д.). Мікраліты мацаваліся ў спецыяльна падрыхтаваных пазах касцяных, рагавых альбо драўляных прылад з дапамогай вяжучых раствораў, перавязак.

3) Распаўсюджанне рыбнай лоўлі. Археалагічныя знаходкі і выяўленчыя помнікі сведчаць аб відавочным развіцці і ўдасканаленні гэтай формы гаспадарчай дзейнасці. З эпохай мезаліту звязваюць вынаходніцтва чоўна і вясла. Лоўля рыбы вялася з дапамогай вуды, сетак, гарпуноў. На шматлікіх стаянках былі выяўлены косткі і лускі рыб, па якіх даследчыкі вызначылі, што ў лясной зоне нейбольш папулярнымі відамі рыб былі шчупак, сом, лешч, акунь.

4) У мезалітычны час пачынаецца даместыкацыя (прыручэнне і развядзенне) жывёл. Першай жывелай, прыручанай чалавекам, быў сабака. Археалагічныя дадзеныя сведчаць аб тым, што ў мезаліце сабака выкарыстоўваўся чалавекам у першаю чаргу як крыніца харчавання.

Адыход ледавіка прывёў да з’яўлення новых вялізных незаселеных прастораў, і характэрнай рысай гэтага перыяду стала інтэнсіўнае іх засваенне чалавекам. Менавіта ў мезаліце была заселена асноўная частка тэрыторыі Беларусі. Людзі сяліліся на берагах рэк, займаючы ўжо не асобныя мясціны, а даволі вялікія адрэзкі рачных далін. Адным з галоўных патрабаванняў пры выбары месца жыхарства была блізкасць багатага рыбай вадаёма і радовішчаў крэменю, на якіх атрымлівалі сыравіну для вырабу прылад працы. Жытлом мезалітычных людзей былі даволі лёгкія збудаванні, аснову якіх складалі канструкцыі з жэрдак. Яны былі акруглыя ў плане дыяметрам каля 5 метраў або падпрамавугольныя. У месцах, багатых крамянёвай сыравінай, ствараліся спецыяльныя майстэрні, на якіх вялася крэмнеапрацоўка.

**2.2. Археалагічныя культуры.** У мезалітычны час на тэрыторыі Еўропы адбываліся складаныя культурныя працэсы.. У гэты час скла́ліся некалькі культурных зон, якія адрозніваліся перадусім характарам крамянёвага інвентару. Тэрыторыя Беларусі, на думку большасці даследчыкаў, уваходзіла ў адну культурна-гістарычную зону з Прыбалтыкай, Польшчай, Волга-Окскім міжрэччам і некаторымі іншымі рэгіенамі.

Адной з найбольш яскравых культур поўначы гэтай зоны з'яўлялася **кундская культура**, якая атрымала назву па паселішчы каля г. Кунда (Эстонія).

*Арэал культуры* ахопліваў тэрыторыю Усходняй Прыбалтыкі, Прыанежжа, Ленінградскай вобласці; на тэрыторыі Беларусі – басейн Заходняй Дзвіны, Нёмана, верхняй Прыпяці.

*Храналогія.* Агульны час існавання культуры – VIII–V тыс да н.э., на тэрыторыі Беларусі – VIII–VII тыс. да н.э.

*Помнікі.* Асноўны тып помнікаў – стаянкі, радзей адзначаюцца пахаванні. Вялікі могільнік мезалітычнай эпохі адкрыты ў Звейніеке (Латвія). Тут было знойдзена звыш 100 пахаванняў з трупапакладаннем. Усе шкілеты пасыпаны вохрай. Разам з нябожчыкамі былі пакладзены касцяныя дзіды, кінжалы, каменныя сякеры, амулеты з зубоў жывел. Адной з найбольш цікавых знаходак з'яўляецца кінжал з рога, ручка якога была зроблена ў выглядзе галавы лася.

*Касцяны і крамянёвы інвентар.* Характэрнай асаблівасцю кундскай культуры на тэрыторыі Прыбалтыкі з'яўляецца перавага касцянога інвентару над крамянёвым. Гэта было выклікана адсутнасцю значных запасаў крамянёвай сыравіны ў рэгіёне. З косці выраблялі гарпуны, рыбалоўныя кручкі, матыкі, прадметы быту і ўпрыгожванні. У Беларусі кундская культура прадстаўлена амаль выключна крамянёвым інвентаром. Асноўным відам нарыхтоўкі былі рэгулярныя пласціны, атрыманыя адціскной тэхнікай. З іх выраблялі наканечнікі стрэл (вызначальнай рысай кундкай культуры з'яўляюцца чаранковыя наканечнікі з рэтушаваным вастрыём, чаранковыя наканечнікі з бакавой выемкай), разцы на спецыяльна зламаных пласцінках, пакарочаныя скрабкі, укладышы і г.д.

Плямёны кундскай культуры існавалі на тэрыторыях, багатых вадаёмамі. Знойдзены інвентар (перадусім касцяны) сведчыць аб вялікай ролі рыбалоўства ў гаспадарчай дзейнасці носьбітаў культуры. Насельніцтва займалася таксама паляваннем і збіральніцтвам.

*Паходжанне.* Большасць даследчыкаў лічыць, што кундская культурная супольнасць у значнай ступені сфарміравалася ў выніку міграцыі свідэрскіх плямён у Паўднёва-Усходнюю Прыбалтыку.

*Гістарычныя лёсы* Кундскае культура стала асновай для складвання нарвенскай неалітычнай культуры.

Паўднёвы ўсход Беларусі быў заселены носьбітамі **кудлаеўскай культуры.** Назва паходзіць ад стаянкі Кудлаеўка на Украіне.

*Арэал* – басейн Сярэдняй Дзясны, Сярэдняе Падняпроўе, Сярэдняя і Ніжняя Прыпяць, Ніжняе Пасожжа. Матэрыялы культуры знаходзяць таксама на захадзе Беларусі і на поўдні Літвы .

*Храналогія.* Агульны час існавання культуры – VIII–VI тыс да н.э., на тэрыторыі Беларусі – VII–VI тыс. да н.э.

*Помнікі.* Стаянкі звычайна размяшчаліся на пясчаных узвышшах на поплаве рэк, на берагах азёр.

*Крамянёвы інвентар.* Асноўнымі нарыхтоўкамі для вырабу прыладаў працы з'яўляліся адшчэпы і нерэгулярныя пласціны, атрыманыя тэхнікай удару. З пласцін выраблялі вастрыі, мікраліты (трохвугольнікі, трапецыі), чаранковыя наканечнікі стрэл (іх археолагі лічаць культуравызначальнымі для кудлаеўскай культуры). Акрамя таго, кудлаўскае насельніцтва карысталіся прыладамі, характэрнымі і для іншых мезалітычных плямён: разнастайнымі скрабкамі, разцамі, прыладамі сякучага дзеяння і г.д. Для іх вырабу выкарыстоўваліся адшчэпы.

На беразе воз. Вячэра (Любанскі раён) былі знойдзены шматлікія касцяныя і рагавыя артэфакты кудлаеўскай культуры: востраканечнікі, наканечнікі стрэл, кінжалы, гарпуны, рыбацкі кручок і г.д. Некаторыя з вырабаў былі арнаментаваныя.

Насельніцтва займалася прысвойваючымі відамі гаспадаркі.

*Паходжанне.* Дакладна не вызначана. Некаторыя аўтары звязваюць паходжанне кудлаеўскай культуры з мясцовымі фінальнапалеалітычнымі культурамі. Частка даследчыкаў мяркуе, што кудлаеўская культура сфарміравалася на аснове камарніцкай культуры, якая ў раннім мезаліце існавала на тэрыторыі Польшчы.

*Гістарычныя лёсы***.** Дакладна не вядомыя. Пашырана меркаванне, што на аснове кудлаеўскай культуры сфарміравалася днепра-данецкая культура неалітычнага часу.

Ва ўсходніх, заходніх, паўднёвых раёнах Беларусі вядомыя помнікі **яніславіцкай культуры.** Назва пахозіць ад пахавання Яніславіца на тэрыторыі Польшчы.

*Арэал* – басейн Віслы, Нёмана, Верхняй і Ніжняй Прыпяці, Пабужжа. Помнікі таксама вядомы ў басейне Верхняга Дняпра, Пасожжа.

*Храналогія.* Позні мезаліт, VI–V/IV тыс. да н.э.

*Помнікі.* Вядомы паселішчы і пахаванні. Стаянкі размяшчаліся на узвышшах у поплавах рэк, на тэрасах. Жытлы былі наземныя ці заглыбленыя ў зямлю – т.зв. паўзямлянкі. На некаторых помніках выяўлены паглыбленні з агнішчамі, абкладзенымі камянямі, вакол якіх

былі згрувашчаныя шматлікія крамянёвыя артэфакты. Сваіх памерлых носьбіты культуры хавалі ў грунтовых ямах паводле абраду трупапакладання ў пазіцыі седзячы альбо лежачы. У магілу змяшчалі багаты пахавальны інвентар: прылады працы і узбраенне з крэменю і косці, упрыгожанні (падвескі з зубоў дзікіх жывёл). Асобныя магілы пасыпаныя вохрай ці гематытам. На тэрыторыі Беларусі яніславіцкія пахаванні пакуль не выяўлены.

*Крамянёвы інвентар.* Для вырабу прыладаў працы яніславіцкае насельніцтва выкарыстоўвала рэгулярныя пласціны, атрыманыя шляхам адціскання. Найбольш характэрнымі для яніславіцкай культуры з'яўляюцца ланцэтападобныя вастрыі, якія найчасцей ужываліся як наканечнікі стрэл, доўгія трохвугольныя ўкладышы з краявой рэтушшу, мікраліты ў выглядзе трохвугольнікаў, трапецый. Выкарыстоўваліся разцы на зламаных пласцінках, скрабачы на адшчэпах, разнастайныя рубячыя прылады і г.д.

Вядомы таксама касцяныя і рагавыя вырабы. З арганічнай сыравіны насельніцтва майстравала кінжалы, нажы, сякеры, матыкі, востраканечнікі, муфты і інш. Некаторыя прылады дадаткова ўпрыгожваліся – на іх наносілі арнамент. Такія дэкараваныя знаходкі паходзяць з кар'ера пад Смаргонню.

Носьбіты культуры займаліся прысвойваючымі відамі гаспадаркі.

*Паходжанне* яніславіцкай культуры звязваецца з мезалітычным насельніцтвам Паўднёвай Прыбалтыкі. Яніславіцкае насельніцтва ў некаторых рэгіёнах і асабліва на перыферыі свайго рассялення жыло ўпярэмешку з супольнасцямі іншых культур, уступаючы з імі ў розныя формы ўзаемаадносін.

*Гістарычныя лёсы.* Даследчыкамі адзначаецца ўдзел яніславіцкай культуры ў фарміраванні некаторых неалітычных культур Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

### 2.3. Духоўная культура чалавека эпохі мезаліту

Археолагі атрымоўваюць сведчанні аб духоўным свеце мезалітычнага чалавека, вывучаючы помнікі мастацтва і пахавальныя комплексы.

**Мастацтва мезаліту** прадстаўлена 3 відамі: 1) манументальнае мастацтва (наскальныя малюнкі), 2) прыкладное мастацтва (арнамент і гравіроўка), 3) дробная пластыка (скульптуркі людзей, жывёл і інш.).

1) Найбольш шматлікія наскальныя малюнкі мезаліту знойзены на Пірэнейскім паўвостраве і ў Паўночнай Афрыцы. Сустракаюцца яны таксама ў Сярэдняй Азіі, Паўночным Прычарнамор'і, на Каўказе. Малюнкі размяшчаліся не ў пячорах, як у папярэднюю эпоху, а на выступах скал. Сустракаліся выявы жывёл, але, у адрозненне ад палеаліту, найбольшае распаўсюджанне атрымалі выявы людзей – пераважна мужчын (паляўнічых, ваяроў і інш.), радзей жанчын. Цэнтральныя сюжэты неаскальнага жывапісу – сцэны палявання, барацьбы, ваенныя сутыкненні. Характэрнай рысай мезалітычнага мастацтва з'яўляецца схематызм малюнкаў. Першабытныя мастакі выкарыстоўвалі мінеральныя фарбы (вохру і інш.).

2) На шматлікіх мезалітычных помніках археолагі знаходзяць разнастайныя арнаментаваныя прадметы з косці, рога. Асноўныя матывы арнаменту – геаметрычныя выявы: прамыя і хвалістыя лініі, зігзагі, сетка інш. Сустракаюцца таксама вырабы з антрапаморфнымі ці заапморфнымі малюнкамі.

Мастацкія вырабы гэтай катэгорыі выяўлены і на тэрыторыі Беларусі. У жвіровым кар'еры пад Смаргонню знойдзены масіўны выраб з рога, пакрыты нарэзкавым і кропкавым узорам. Некалькі касцяных прыладаў (кінжал, наканечнік) з геаметрычным арнаментам, а таксама фрагмент птушынай косткі з заапморфнай выявай (выявай жывёліны) паходзяць з воз. Вячэра ў Любанскім раёне.

3) Для дробнай пластыкі эпохі мезаліту характэрны тыя ж рысы, што і для наскальных малюнкаў – схематызм, спрошчанасць і г.д. Як і ў палеаліце, выраблялі скульптуркі людзей, але археолагі часцей знаходзяць фігуркі жывёл. Сустракаюцца таксама артэфакты, якія ўмоўна называюць падвескамі, бляшкамі і г.д. Асноўным матэрыялам для іх вырабу з'яўляліся камень, костка, рог, бурштын.

**Пахавальная абраднасць.** У мезалітычны час па-ранейшаму здзяйсняліся індывідуальныя пахаванні людзей на тэрыторыі стаянак і па-за іх межамі. Новай рысай эпохі стала распаўсюджанне могільнікаў – старажытных могілак, якія размяшчаліся за межамі паселішчаў. Такія помнікі вядомыя на тэрыторыі і Заходняй, і Усходняй Еўропы. Як правіла, памерлых хавалі ў грунтовых ямах па абраду трупапакладання. Зрэдку сустракаюцца пахаванні, у якіх знаходзіліся толькі асобныя часткі шкілетаў, перадусім чарапы. Косткі часта пасыпаныя вохрай. Магілы змяшчаюць разнастайны пахавальны інвентар (крамянёвыя і касцяныя прылады працы, упрыгожанні і г.д.). У розных рэгіёнах пахавальныя

абрады мелі свае спецыфічныя асаблівасці. На тэрыторыі Беларусі пахаванні мезалітычнага часу пакуль не вядомыя.

### 3. Неаліт

Неаліт (V–III тыс. да н.э.) адпавялае цепламу і вільготнаму кліматычнаму перыяду. У эпоху неаліту рассяленне людскіх калектываў адбывалася яшчэ інтэнсіўней, чым у папярэдні час. Для гэтага перыяду характэрны радыкальныя змены ў матэрыяльнай і духоўнай культуры чалавека.

**3.1. Агульная характарыстыка эпохі.** Галоўнымі асаблівасцямі неалітычнай эпохі з’яўляюцца:

1) Распаўсюджанне вытворчай гаспадаркі (земляробства і жывёлагадоўлі). На сённяшні дзень даследчыкі вылучаюць некалькі цэнтраў узнікнення вытворчай гаспадаркі, самым старажытным з якіх з’яўляецца Блізкі Усход. Каля 10 тыс. гг. таму мясцовае насельніцтва ўжо займалася земляробствам, крыху пазней – і жывёлагадоўляй. Першымі раслінамі, якія чалавек пачаў вырошчваць, былі пшаніца і ячмень. Жывёлагадоўля пачалася з адамашнівання казы і авечкі. Першыя земляробы і жывёлаводы абыходзіліся без керамікі.

Блізкаўсходні цэнтр адыграў ключавую ролю ў распаўсюджанні новых форм гаспадаркі на тэрыторыі Еўропы, Заходняй Азіі, часткова – Паўночна-Усходняй Афрыкі.

Іншымі старажытнымі цэнтрамі вытворчай гаспадаркі з’яўляліся рэгіёны Далёкага Усходу (каля 8 тыс. гг. таму), Паўночнай Афрыкі (каля 8 тыс. гг. таму), Цэнтральнай Амерыкі (каля 7 тыс. гг. таму).

У выніку ўкаранення новых форм гаспадаркі адбываўся пераход насельніцтва да аседлага жыцця, узнікала і паглыблялася маёмасная, а пазней і сацыяльная дыферэнцыяцыя, ускладнялася сімволіка і ідэалогія.

Гэтыя рыдыкальныя змены ў гаспадарчай дзейнасці чалавека атрымалі назву “неалітычнай рэвалюцыі”.

2) Вытворчасць глінянага посуду. Найбольш старажытны гліняны посуд быў вядомы на тэрыторыі Далёкага Усходу яшчэ ў эпоху фінальнага палеаліту.

На Блізкім Усходзе, у рэгіёне зараджэння вытворчай гаспадакі, керамічная вытворчасць пачалася каля VII тыс. да н.э. З’яўленне керамічнага посуду ва Усходняй Еўропе адносіцца да VI/V тыс. да н.э. Старажытнае насельніцтва тэрыторыі сучаснай Беларусі авалодала навыкамі вырабу керамікі ў V тыс. да н.э.

Посуд ляпіўся рукамі з гліняных стужак: спецыяльна падрыхтаванае глінянае цеста выцягвалі ў стужку, а потым па спіралі накладалі віток за вітком, утвараючы гаршчок. Гаршкі часта ўпрыгожваліся (арнаментаваліся): ямачнымі ўцісканнямі, насечкамі, наколкамі, грабеньчатым штампам, пракрэсленымі лініямі і інш. Пры гэтым у кожнай культуры назіралася сваё спецыфічнае спалучэнне арнаментаў. Нарыхтоўку гаршка загладжвалі, прасушвалі і абпальвалі на вогнішчы.

Неалітычныя пасудзіны звычайна мелі канічную ці яйкападобную форму з вострым ці прыкругленым дном.

3) У новы каменны век дасягнула росквіту апрацоўка крэменю. Крамянёвыя прылады ранняга неаліту былі яшчэ вельмі падобнымі па тыпу і тэхніцы вытворчасці да мезалітычных. Але час нёс пашырэнне асартыменту і ўдасканаленне тэхналогій. Калісьці даследчыкі меркавалі, што менавіта ў эпоху неаліту ўзніклі такія спосабы апрацоўкі каменя і крэменя, як шліфаванне і свідраванне. Аднак пазней было ўстаноўлена, што гэтыя тэхнікі з’явіліся яшчэ напрыканцы мезаліту, і цягам неалітычнай эпохі адбывалася толькі ўдасканаленне і распаўсюджанне новых навыкаў. У неаліце надзвычай папулярнымі сталі шліфаваныя рубячыя прылады – сякеры (былі неабходныя для распрацоўкі будучага поля пры занятках земляробствам), цёслы і долаты (служылі пры вырабе чоўнаў).

4) З’яўленне прадзення і ткацтва. Доказам гэтых заняткаў з’яўляюцца знаходкі праселкаў (гліняных кружкоў з адтулінай, якія надзявалі на верацяно), фрагментаў тканін і керамікі з іх адбіткамі. Валокны для прадзення ніцяў спачатку выраблялі з крапівы, дзікай каноплі, з лыка дрэў, з поўсці авечкі, з валакна дзікарослага ільну. Першапачаткова ткалі без ткацкга станка, г.зн. фактычна плялі. Пазней пачалі выкарыстоўваць і ткацкі станок. У Сірыі, Месапатаміі атрымаў распаўсюджанне вертыкальны ткацкі станок. Менавіта прыстасаванні такога тыпу былі вядомыя і ў Еўропе.

## 3.2. Неалітызацыя Еўропы

**Неалітызацыя** – працэс распаўсюджання вытворчых форм гаспадаркі (земляробства і жывёлагадоўлі), які суправаджаўся зменамі ў сферы тэхналогіі, культуры, сацыяльнай арганізацыі і ідэалогіі.

Пераход да вытворчых форм гаспадаркі пачаўся на тэрыторыі Еўропы каля VI тыс. гг. да н.э. Першыя прыкметы неалітычнай эпохі зафіксаваны ў Заходнім і Усходнім Міжзімнамор’і. Менавіта адсюль

адбывалася распаўсюджанне земляробства і жывёлагадоўлі ў паўночным кірунку.

У сучаснай археалагічнай навуцы існуюць два асноўныя падыходы да апісання працэсу неалітызацыі Еўропы.

**1) Міграцыйны падыход.** Станаўленне гэтага падыходу звязана з імем Г. Чайлда. Ён меркаваў, што “неалітычная рэвалюцыя” першапачаткова мела месца на тэрыторыі паўднёва-заходняй Азіі. Мігранты з Азіі рассяліліся па тэрыторыі Еўропы, і разам з імі распаўсюдзіліся культурныя злакі і свойская жывёла.

Пазней генетыкі распрацавалі дэмаграфічную мадэль рассялення насельніцтва – т.зв. “мадэль хвалявай міграцыі”. Паводле гэтай мадэлі, пераход да земляробства суправаджаўся дэмаграфічным выбухам, шчыльнасць насельніцтва павялічваліся, і па дасягненні пэўнай “крытычнай кропкі” частка насельніцтва быда вымушана перасяляцца на незанятыя тэрыторыі. Хуткасць такой міграцыі дасягала 18–25 км цягам жыцця аднаго пакалення. Шматлікае мезалітычнае насельніцтва, якое займалася выключна прысвойваючымі відамі гаспадаркі, знішчалася мігрантамі.

На карысць такога падыходу выступаюць і некаторыя даныя малекулярнай генетыкі, згодна з якімі большая частка сучаснага генафонду Еўропы сфарміравалася ў выніку іміграцыі пярэднеазіяцкага насельніцтва пры нязначным удзеле данеалітычных папуляцый.

**2) Аўтахтонны падыход.** У межах гэтага падыходу існуюць некалькі розных канцэпцый, найбольш папулярнай з якіх з’яўляецца наступная. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што мезалітычнае насельніцтва Еўропы дасягнула дастаткова высокага ўзроўню сацыяльнага развіцця. Адбыўся пераход да аседлага жыцця, пачалася маёмасная дыферэнцыяцыя грамадства. Гэта паступова вяло да складвання своеасаблівых прывілеяваных груп (старэйшын, шаманаў). Эліта імкнулася ўмацаваць сваю ўладу, для чаго ёй было неабходна пашыраць кантроль над рэсурсамі, найбольш істотнымі з якіх былі харчавыя. Аднак прысвойваючыя формы гаспадаркі не маглі гарантаваць бесперабойнай наяўнасці ежы, і таму новая эліта пачала ўспрымаць найбольш прагрэсіўныя формы гаспадарчай дзейнасці – земляробства і жывёлагадоўлю.

На карысць такога падыходу выступаюць і некаторыя даныя малекулярнай генетыкі. Даследчыкі, вывучаючы храмасомы сучасных папуляцый Еўропы, зрабілі выснову аб тым, што большая частка

элементаў храмасом была не змянялася на працягу 25 тыс. гадоў. Доля своеасаблівых храмасом, якія маглі ўзнікнуць пад уздзеяннем новага насельніцтва (звязанага з пярэднеазіяцкай "неалітычнай рэвалюцыяй" ), у розных рэгіёнах Еўропы змяняецца ад 5% да 12%.

### 3.3. Асаблівасці неалітычнай эпохі на тэрыторыі Беларусі

Спецыфічнай рысай неаліту на тэрыторыі Беларусі было параўнальна позняе ўспрыманне вытворчых форм гаспадарання. Насельніцтва доўгі час займалася прысвойваючымі формамі гаспадаркі. Пачатак неаліту на тэрыторыі нашай краіны звязваецца са з'яўленнем керамікі. У познім неаліце ў шырокім ужытку з'явіліся шліфаваныя крамянёвыя вырабы.

Рассяленне людзей у розных прыродна-кліматычных асяроддзях вяло да з'яўлення больш выразных адрозненняў у інвентару, хатніх пабудовах, пахавальным абрадзе, у формах гаспадаркі, на падставе якіх даследчыкі вылучаюць розныя археалагічныя культуры.

Адной з буйных культур лесастэпу, якая аказала моцны ўплыў на суседзяў, у тым ліку і на насельніцтва Паўднёвай Беларусі, была **днепра-данецкая культура** (альбо ўсходнепалеская культура, у дачыненні да помнікаў на тэрыторыі Беларусі ўжываецца таксама назва "ўсходнепалескі варыянт днепра-данецкай культуры").

*Арэал* ахопліваў Сярэдняе Падняпроўе, правабярэжжа Дняпра да Бярэзіны, Ніжняя Прыпяць, Северскі Данец. На Беларусі насельніцтва днепра-данецкай культуры засяліла Усходняе Палессе.

*Храналогія* – канец V – пачатак II тыс. да н.э.

*Помнікі.* Паселішчы размяшчаліся невялікімі групамі ў далінах рэк. Жытло было наземным ці злегку паглыбленым у мацярыковую глебу. У цэнтры пабудоў знаходзіліся адкрытыя вогнішчы. Носьбіты днепра-данецкай культуры хавалі нябожчыкаў у грунтовых могільніках у выцягнутым становішчы на спіне і пасыпалі іх вохрай. Больш раннія пахаванні часта пазбаўлены пахавальнага інвентару. У канцы неаліту ўзнікае звычай суправаджаць нябожчыкаў некаторым інвентаром. На Беларусі могільнікі днепра-данецкай культуры не знойдзены.

*Кераміка.* Посуд днепра-данецкага насельніцтва быў прадстаўлены вострадоннымі гаршкамі. Толькі ў самым канцы неаліту на Прыпяці з'явіліся пласкадонныя формы. Ляпіліся гаршкі з гліны з дамешкамі валакністых раслінных рэштак. Пад краем венцаў амаль заўсёды наносіўся пояс глыбокіх круглых ямак, астатняя паверхня аздаблялася грабеньчата-

накольчатымі ўзорамі. У канцы існавання культуры на посудзе дадаткова з’явіліся адбіткі шнура і лінейнага штампа. Узоры на посудзе складаліся ў гарызантальныя зоны. На адным з гаршкоў з Юравіч была наколамі выгравіравана кампазіцыя з фігур чалавека і качкі.

*Крамянёвы інвентар.* Высокага ўзроўню сярод насельніцтва днепра-данецкай культуры дасягнула крэмнеапрацоўка. Крамянёвы інвентар уключаў разнастайныя наканечнікі стрэл, шматлікія скрабкі, шырокія і вузкія нажы, разцы, праколкі, цёслы, востраканечнікі.

*Гаспадарка.* Сярод днепра-данецкага насельніцтва Украіны былі распаўсюджаны вытвараючыя формы гаспадаркі, на Беларусі ж пераважалі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Толькі ў познім неаліце пачалі распаўсюджвацца жывёлагадоўля і земляробства.

*Паходжанне.* Дакладна не высветлена. Культура сфарміравалася ў Сярэднім Падняпроўі і на Северкім Данцы ў выніку развіцця познамезалітычных культур. Паступова культура распаўсюдзілася на ўсход Беларусі.

*Гістарычны лёс* таксама дакладна не вядомы. На працягу ўсяго свайго існавання культура адчувала ўздеянне з боку іншых культур, у раннем неаліце – буга-днястроўскай, у познім неаліце – нёманскай, сярэднедняпроўскай. У Беларускім Палессі групы нашчадкаў позненеалітычнага насельніцтва пратрымаліся да пачатку II тыс. да н.э. – да бронзавага веку.

Усходняя Беларусь была заселена носьбітамі **верхнедняпроўскай культуры.**

*Арэал* – басейн верхняга цячэння Дняпра, Сажа.

*Храналогія* – канец V – пачатак II тыс. да н.э.

*Паселішчы* размяшчаліся невялікімі групамі ў далінах рэк.

*Крамянёвы інвентар.* На раннім этапе яшчэ захоўваўся шэраг адзнак папярэдняй эпохі. Так, насельніцтва працягвала ўжываць лістападобныя крамянёвыя наканечнікі стрэл. З цягам часу распаўсюдзіліся трохвугольныя, ромбападобныя, міндалепадобныя наканечнікі стрэл з двухбаковай апрацоўкай паверхні.

*Кераміка.* Першыя гаршкі былі таўстасценныя, са значнай колькасцю раслінных дамешак у цесце. Арнаменты – сціплыя: авальныя ямкавыя паглыбленні і адбіткі буйназубчастага грэбеня. Часам посуд не аздабляўся. На познім этапе развіцця культуры пачалі вырабляць шыракагорлыя круглабокія вялікія гаршкі з дамешкамі пяску і дробнай жарствы ў цесце. Аздабляўся посуд адбіткамі грэбеня, ямкавымі паглыбленнямі, насечкамі і

нарэзкамі. Арнамент складаўся з гарызантальных, дыяганальных, зігзагападобных і кампазіцый у выглядзе шахматнай дошкі. Значна лепшым стаў абпал керамікі.

*Гаспадарка.* Верхнедняпроўскае насельніцтва было даволі кансерватыўным, яно займалася выключна паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам.

*Паходжанне.* Дакладна не высветлена. Верагодна, культура сфарміравалася ў выніку развіцця мясцовых познамезалітычных культур.

*Гістарычны лёс.* Носьбіты верхнедняпроўскай культуры дажываюць да бронзавага веку. Пад націскам новага насельніцтва – плямёнаў сярэднедняпроўскай культуры – частка аўтахтонаў (мясцовага насельніцтва) перамясцілася ў паўночным накірунку, а частка засталася на месцы і была паступова асімілявана.

Поўнач Беларусі ў раннім неаліце займала **нарвенская культура.**

*Арэал.* Асноўны масіў нарвенскіх плямёнаў займаў тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі (Эстоніі, Літвы, Латвіі), захад Ленінградскай і Пскоўскай вобласці РФ, поўнач Беларусі (Падзвінне без паўднёва-ўсходняй ускраіны, Нарачанскія азёры і верхняе цячэнне Віліі).

*Храналогія* – V – IV тыс. да н.э.

*Паселішчы* размяшчаліся блізка каля вады, займаючы нязначныя ўзвышэнні пры вытоку рэчак з азёр, каля плыткіх зарослых узбярэжжаў вадаёмаў. У выніку некаторыя стаянкі аказаліся пазней затопленымі і затарфянелымі. На такіх паселішчах захаваліся не толькі мінеральныя, але і арганічныя рэшткі жыццядзейнасці чалавека.

*Прылады працы.* Выраблялі з крэменю, косткі, рога. Нарвенцы, што знаходзіліся на поўдзень ад Дзвіны, недалёка ад радовішчаў крэменю ў вярхоўях Віліі, шырока выкарыстоўвалі для прылад працы і зброі крэмень. Насельніцтва больш паўночных мясцін, дзе натуральныя радовішчы крамянёвай сыравіны амаль адсутнічалі, выкарыстоўвалі рог і костку. Нарвенцы выраблялі касцяныя біканічныя і іголкападобныя наканечнікі стрэл, кінжалы, сякеры і цёслы, рыбацкія кручкі і гарпуны, матыкі з ласінага рога (служылі для выкопвання каранёў ядомых дзікарослых раслін).

*Посуд.* Вырабляліся пераважна шырокаадкрытыя вастрадонныя гаршкі з гліняных стужак. У фармовачную гліну дадавалі раслінныя рэшткі і дробнатоўчаныя ракавіны. Аздабляўся посуд паясамі насечак, наколаў, грабеньчатымі адбіткамі і рыскамі, размешчанымі пераважна ўверсе. Абпал быў недасканалы, таму посуд быў крохкім і часта біўся.

Пашкоджаныя гаршкі рамантаваліся шляхам накладання на трэшчыны бярэсты і сшывання праз прасвідраваныя адтуліны. У такім выглядзе яны не ўжываліся для прыгатавання ежы на агні, але заставаліся прыдатнымі для захоўвання сыпучых рэчываў.

Гаспадарка насельніцтва была цалкам прысвойваючая. Пра паляўніцтва сведчаць знаходкі костак дзікіх жывёлаў і паляўнічай зброі, пра рыбалоўства – косткі рыб і гарпуны, пра збіральніцтва – шалупінне арэхаў і разнастайныя матыкі.

*Паходжанне.* Культура склалася на аснове мезалітычнай кундскай культуры.

*Храналогія.* Нарвенская культура на тэрыторыі Беларусі датуецца прыкладна 4900 – 3500 гг. да н.э.

*Гістарычныя лёсы.* У сярэдзіне III тысячагоддзя да н.э. у Прыбалтыку і часткова на поўнач Беларусі прыйшлі з-за Фінскай затокі плямёны **культуры з тыповай грабеньчата-ямкавай керамікай**. Нешматлікае прышлае насельніцтва было асімілявана нарвенцамі. Аднак пад яго ўплывам мясцовае насельніцтва пачало ляпіць посуд са скошанымі і патоўшчанымі краямі венцаў, у арнаментацыі з'явіліся паясы глыбокіх круглых ямак і ромбападобных фігур. Так у другой палове IV тыс. да.н.э. нарвенская культура пачала паступова трансфармавацца ва **ўсвяцкую культуру.**

*Арэал.* Беларускае Паазер'е, паўднёвая Пскоўшчына, паўночна-Заходняя Смаленшчына, крайні ўсход Літвы. За межамі Паазер'я – басейн Верхняй Віліі і верхняе цячэнне Беразіны Дняпроўскай.

*Храналогія* – канец IV – III тыс. да н.э.

*Паселішчы* размяшчаліся блізка каля вады, займаючы нязначныя ўзвышэнні пры вытоку рэчак з азёр, каля плыткіх зарослых узбярэжжаў вадаёмаў. Жытлы былі наземныя. Пры іх будаўніцтве выкарыстоўваліся жэрдкі і драўляныя завостраныя калы. Пахаванні не выяўленыя, але на паселішчах знойдзеныя фрагменты чалавечых костак і дробных абломкаў чарапоў. Гэта можа быць сведчаннем існавання канібалізму альбо своеасаблівых пахавальных абрадаў.

*Прылады працы.* Выраблялі з крэменю, косткі, рога. Крамянёвы інвентар нешматлікі, што тлумачыцца беднасцю мясцовай сыравіны. Знойдзены наканечнікі стрэл, скрабкі, нажы, праколкі і інш. Шырока выкарыстоўваліся рог і костка. Выраблялі касцяныя наканечнікі стрэл, кінжалы, сякеры і цёслы, рыбацкія кручкі і гарпуны, матыкі, грузілы да вудаў і інш.

*Посуд.* Вырабляліся пераважна шырокаадкрытыя вастрадонныя гаршкі і міскі. У фармовачную гліну дадавалі дробнатоўчаныя ракавіны і шамот. Абпал быў недасканалы, таму посуд быў крохкім і часта біўся. Пашкоджаныя гаршкі рамантаваліся шляхам накладання на трэшчыны бярэсты і сшывання праз прасвідраваныя адтуліны. Аздабляўся посуд паясамі насечак, наколаў, грабеньчатымі адбіткамі, пракрэсленымі рыскамі. Сустракаюцца таксама пасудзіны, аздобленыя сімвалічнымі геаметрычнымі фігурамі, стылізаванымі выявамі вадаплаўных птушак, змей.

Гаспадарка насельніцтва была пераважна прысвойваючая. Пра паляўніцтва сведчаць знаходкі костак дзікіх жывёлаў і паляўнічай зброі, пра рыбалоўства – косткі рыб і гарпуны, пра збіральніцтва – шалупінне арэхаў і разнастайныя матыкі. Нешматлікія косткі свойскіх жывёл указваюць на існаванне зачаткавай жывёлагадоўлі.

*Паходжанне.* Культура склалася на аснове нарвенскай культуры і культуры з тыповай грабеньчата-ямкавай керамікай.

*Гістарычныя лёсы.* У другой палове III тыс. да н.э. у рэгіёне з’явіліся прадстаўнікі іншых культур – верхнедняпроўскай культуры, культуры шарападобных амфар, культуры шнуравой керамікі. Гэта прывяло да заняпаду ўсвяцкай культуры і паступоваму фарміраванню паўночнабеларускай культуры.

Заходняя Беларусь была заселена носьбітамі **нёманскай культуры.**

*Арэал* – ахопліваў Заходнюю Беларусь (Беларускае Панямонне (за выключэннем Віліі), правабярэжжа Верхняй Прыпяці), паўночна-ўсходнюю Украіну, паўднёва-заходнюю Літву, паўночна-ўсходнюю Польшчу (без Балтыйскага ўзбярэжжа).

*Храналогія* – канец V – пачатак II тыс. да н.э.

*Паселішчы* размяшчаліся на мысах рачных тэрас і дастаткова высокіх дзюнах поплаву, што не затапляліся паводкамі. У найбольш зручных для рыбалоўства мясцінах, каля старыц і затокаў, стаянкі ўтваралі гнёзды, што налічвалі часам да 10 помнікаў. Паміж такімі густазаселенымі тэрыторыямі знаходзіліся пустэльныя зоны з адзінкавымі паселішчамі.

*Кераміка.* У раннім неаліце носьбіты нёманскай культуры карысталіся слаба абпаленымі вострадоннымі пасудзінамі, злепленымі з гліны з дамешкамі валакністых раслінных рэшткаў. Пазней у якасці дамешак пачалі выкарыстоўваць шамот (трушчаныя чарапкі пашкоджанага і непрыдатнага для выкарыстання посуду), жарству (дробныя часцінкі каменя). Паверхня гаршкоў аздаблялася сціпла і, пераважна, ў верхняй

частцы: пад краем венцаў прысутнічаў абавязковы пояс з глыбокіх круглых ямак, паясы з грабеньчатых адбіткаў, наколаў, насечак.

У позненеалітычны час атрымал распаўсюджанне вастрадонныя гаршкі, пры вырабе якіх ў гліну дадаваліся дамешкі буйнога пяску і жарствы. Паверхні посуду набывалі штрыхоўку. Найбольш распаўсюджаныя элементы арнаменту складаліся з розных наколаў, адбіткаў лінейнага штампа, насечак-“семечак”, “капыткоў”, тонкіх насечак, пракрэсленых ліній. Арнамент, як правіла, сканцэнтраваны ў верхняй частцы пасудзіны. Пад краем венца часта наносіўся шэраг глыбокіх круглых ямак, якія ўтваралі “жамчужыны” на супрацьлеглай паверхні. Зрэз венца часта арнаментаваўся.

*Крамянёвы інвентар.* На раннім этапе неаліту з’явіліся трохвугольныя наканечнікі стрэл. Сякеры мелі асіметрычныя профілі, іх лёзы часта фармаваліся бакавым сколам. У позненеаліычны час атрымала распаўсюджанне практыка прышліфоўкі ляза і бакавых граняў сякер.

*Гаспадарка.* Пра важную ролю рыбалоўства ў гаспадарцы нёманскага неалітычнага насельніцтва сведчыць размяшчэнне паселішчаў на асабліва рыбных участках рачных далін. Як мяркуюць даследчыкі, асноўнымі рыбацкімі прыстасаваннямі былі не сеткі, больш прыдатныя для шырокіх узбярэжжаў азёр, а розныя лавушкі-пасткі з прутоў або жэрдак з нацягнутымі невялікімі сеткавымі палотнамі.

*Паходжанне***.** Гэта пытанне дыскусійнае. Паводле распаўсюджанага меркавання, ранні этап культуры сфарміраваўся на аснове янілавіцкай мезалітычнай культуры. У сярэдзіне неаліту на захадзе Беларусі з’явілася неалітычнае насельніцтва Заходняга Пабужжа, а ў познім неаліце ў рэгіён пачалі пранікаць носьбіты іншых культурных традыцый (культуры шарападобных амфар, культуры шнуравой керамікі). Складаныя працэсу культурнага ўзаемадзеяння і абумовілі фарміраванне нёманскай культуры.

*Гістарычны лёс* дакладна не вядомы. Нёманская культура праіснавала да бронзавага веку. У III тыс. да н.э. яе носьбіты адчувалі ўздзеянне з боку мігрантаў, якія прыйшлі на тэрыторыю Панямоння.

Найбольшае значэнне меў прыход насельніцтва **культуры шарападобных амфар.** Назва культуры паходзіць ад характэрнага тыпу посуду – амфары з шарападобным тулавам і прылепленымі вушкамі.

*Арэал* – ад Одэра і Эльбы на захадзе да Падняпроўя на ўсходзе. На тэрыторыі Беларусі помнікі культуры вядомы на Панямонні.

*Час існавання* – канец IV – канец II тыс. да н.э., на тэрыторыі Беларусі – другая чвэрць III тыс. да н.э.

*Помнікі.* Найбольш характэрным тыпам паселішчаў з’яўляюцца сезонныя стаянкі. На Беларусі яны не выяўлены. Самай даследаванай катэгорыяй помнікаў з’яўляюцца пахаванні. Сваіх нябожчыкаў носьбіты культуры шарападобных амфар хавалі на невялікіх могільніках у неглыбокіх ямах, абкладзеных камянямі. Адзін з найбольш значных могільнікаў культуры выяўлены ў Сярэднім Пароссі на тэрыторыі Краснасельскіх шахтаў. Адна магіла захавалася амаль поўнасцю. У ёй знаходзілася рытуальнае пахаванне свойскай жывёлы – дзевяці быкоў, двух авечак або коз, частак свінні і каня. Жывёліны былі забітыя ўдарам у лоб, адзін з быкоў – двума стрэламі, наканечнікі якіх былі знойдзены сярод костак грудной клеткі. У суседняй магіле знаходзіліся і паўабпаленыя чалавечыя косткі і амфара.

*Гаспадарка.* Насельніцтва займалася жывёлагадоўляй і земляробствам. Аснову статка складала буйная рагатая жывёла, свінні. Сярод зернявых культур вядомы пшаніца і ячмень. Шарападобнікі валодалі таямніцамі здабычы крэменю ў падземных выпрацоўках. Яны сталі першымі шахцёрамі на Беларусі, пачаўшы горназдабыўную працу ў сярэднім Пароссі.

*Гістарычны лёс* Культура шарападобных амфар аказала моцы ўплыў на культуры позняга неаліту і пачатковага этапу бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі.

Згодна з прынятымі меркаваннямі, носьбіты культуры былі індаеўрапейцамі.

## 3.4. Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху неаліту

Асновай дзейнасці чалавеку эпохі неаліту з’яўляліся прысвойваючыя формы гаспадаркі – паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва.

Археалагічнымі сведчаннямі існавання палявання з’яўляюцца косткі жывёл і птушак, выяўленыя на тых помніках, дзе добра захоўвалася арганіка. Так, жыхары поўначы Беларусі (стаянкі Крывінскага тарфяніку) палявалі на ласёў і дзікоў, здабывалі таксама мядзведзяў. Большасць дзічыны здабывалі на мяса. Аднак знаходкі костак баброў, куніц, выдраў указваюць і на тое, што старажытны чалавек паляваў і для вырабу футры. На поўдні Беларусі ў неалітычны час палявалі ў асноўным на дзіка, лася, высакароднага аленя, баброў і зуброў. Менш здабывалі мядзведзяў, казуль, а таксама – чарапах.

Аб існавані рыбалоўства сведчаць такія археалагічныя даныя, як знаходкі рыбалавецкіх прыладаў: касцяных гарпуноў і кручкоў, грузілаў і паплаўкоў ад сетак, фрагменты чаўноў і вёсла. Частымі знаходкамі з'яўляюцца косткі і лускавінкі рыб. Аснову рыбнага промыслу складалі шчупак, окунь, карась, сом і інш. віды рыб, характэрныя і для сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Доказамі збіральніцтва з'яўляюцца шкарлупінне вадзяных і лясных арэхаў, абпаленыя жалуды, ракавіны малюскаў, знойдзеныя на тарфянікавых стаянках на поўначы Беларусі.

Доўгі час даследчыкі меркавалі, што пераход да вытворчай гаспадаркі (земляробства, жывёлагадоўлі) адбываўся ў бронзавым веку і быў звязаны з прыходам новага насельніцтва. Аднак сучасныя даныя сведчаць, што першыя формы земляробства пачалі распаўсюджвацца на паўднёвым захадзе Беларусі ўжо ў раннім неаліце. Першай пасяўной культурай быў ячмень. Сведчанні жывёлагадоўлі пазнейшыя. З часам вытворчыя формы гаспадарання пашырыліся на поўнач краіны. Там іх першыя сляды прасочваюцца ў матэрыялах усвяцкай культуры.

Першай археалагічнай культурай на тэрыторыі Беларусі, носьбіты якой займаліся пераважна вытворчай гаспадаркай, з'яўлялася культура шарападобных амфар. Аснову статка складала буйная рагатая жывёла, свінні. Сярод зернявых культур вядомы пшаніца і ячмень.

Асноўным матэрыялам для вырабу прыладаў працы па-ранейшаму з'яўляўся крэмень. Яго, як і ў папярэднія часы, збіралі на паверхні, на берагавых размывах. Аднак такі крэмень не заўсёды падыходзіў для вытворчасці некаторых прыладаў, перадусім сякер і долат. Таму ў неалітычную эпоху чалавек пачаў здабываць крэмень з глыбінь крэйдавых адкладаў шляхам распрацовак шахт. Вялікі цэнтр па здабычы і апрацоўцы крэменю знойдзены ў басейне р. Рось – каля пас. Краснасельскі, в. Карпаўцы і Навасёлкі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

Станаўленне горназдабыўнай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі было звязана з носьбітамі культуры шарападобных амфар. Яшчэ ў пачатку III тыс. яны ўжо валодалі навыкамі шахтавай здабычы крэменю і вырабу з яго чатырохбаковых сякер і далот. У другой чвэрці III тыс. гэтае насельніцтва пачало распрацоўку краснасельскіх крэйдавых лінзаў.

На тэрыторыі Беларусі вядомы некалькі відаў шахтавых выпрацовак. Найбольш простыя – т.зв. шахты-калодзежы. Шахты ўяўлялі сабой вертыкальныя калодзежы, паглыбленыя да крэмененоснага ўчастку. Глыбіня шахтаў залежыла ад глыбіні залягання крэмененоснага пласта,

найбольшая глыбіня шахтаў гэтага тыпу не перавышала 5 м. Дыяметр вусцевай часткі шахты, як правіла, дасягаў 1,5–1,6 м. Здабыча крэменю ажыццяўлялася непасрэдна ў межах шахты, звычайна з яе “падлогі”. Крэйдавы друз ссыпаўся альбо на паверхню каля вусця шахты, альбо ў суседнюю, папярэдне выбраную распрацоўку. Вывучаныя і больш складаныя канструкцыі – шахты з падбоямі; шахты з падбоямі і штрэкамі; шахты з падбоямі, штрэкамі і камерамі. Такія шахты мелі вертыкальны ствол, звычайна паглыблены да крэмененоснага пласта. Ад калодзежа, па яго перыметру, адыходзілі нішы. Іх гакірунак і форма залежылі ад характару залягання крэменю. Шахцёр спачатку здабываў крэмень з “падлогі” шахты, а пасля паглыбляўся ў сценкі па ходу праслою альбо скапленню канкрэцый, у выніку чаго ўзнікалі нішы (падбоі). Крэйдавы друз не падымаўся на дзённую паверхню, а ссыпаўся ў папярэдне распрацаваныя нішы.

Сценкі шахтаў захавалі шматлікія сляды шахцёрскіх інструментаў. Для выкопвання шахтаў і вымання з пароды крамянёвых канкрэцый выкарыстоўваліся разнастайныя кіркі, матыкі, капачы і інш., вырабленыя з рагоў аленя і лася. На сценках шахт захаваліся таксама сляды ад гарэлых лучын, якія асвятлялі выпрацоўкі.

Першапачатковая апрацоўка сыравіны ажыццяўлялася непасрэдна ў шахце. Далейшая і асноўная праца вялася ў крэмнеапрацоўчых майстэрнях, размешчаных альбо ў непасрэднай блізкасці ад шахт, альбо на пэўнай адлегласці ад іх. Крэмнеапрацоўчыя майстэрні спецыялізаваліся на вытворчасці сякер і далот. Старажытныя майстры выраблялі ў майстэрнях толькі нарыхтоўкі прыладаў. Канчатковая апрацоўка вырабаў – шліфаванне – адбываліся ў іншых месцах, па-за межамі крэмнездабыўных і крэмнеапрацоўчых помнікаў.

Значныя аб’ёмы прадукцыі, безумоўна, перавышалі запатрабаванні мясцовых груповак шахцёраў. Даследчыкі мяркуюць, што крамянёвыя сякеры, вырабленыя ў Краснасельскім крэмнездабыўным цэнтры, экспартаваліся на адлеглыя тэрыторыі – у Паўднёва-Усходнюю Прыбалтыку, у рэгіёны сучаснай паўночнай, усходняй і цэнтральнай Польшчы.

Пазней эксплуатацыя шахтаў працягвалася носьбітамі кола культуры шнуравой керамікі, тшцінецкага культурнага кола.

## 3.5. Духоўная культура насельніцтва эпохі неаліту

Нераўнамернае развіцце неалітычнага насельніцтва ў розных рэгіёнах знайшло свае адлюстраванне і ў сферы ідэалогіі і мастацтва. Так, калі ў земляробчых культурах Пярэдняй Азіі, Егіпта і Міжземнамор'я ўжо існавала вера ў багоў, якія паміраюць і ўваскрасаюць, то ў лясной паласе Еўразіі рэлігійныя вераванні ўсе яшчэ вызначаліся паляўніча-рыбавалецкім укладам. Гэтыя погляды знайшлі сваё адлюстраванне ў розных творах мастацтва, найбольш яскравым з якіх з'яўляюцца петрогліфы (наскальныя малюнкі) і скульптуркі людзей і жывел. Лічыцца, што наскальныя малюнкі былі цесна звязаны з магіяй, а таксама з вытворчай дзейнасцю людзей.

Варта больш падрабязна спыніцца на духоўнай культуры неалітычнага насельніцтва сучаснай тэрыторыі Беларусі. Даследчыкі мяркуюць, што мастацтва неаліту, як і ўсё першабытнае мастацтва, з'яўлялася ўвасабленнем і адлюстраваннем рэлігійных вераванняў. Аднак рэканструкцыя светапогляду старажытнага чалавека, натуральна, з'яўляецца вельмі складанай і дыскусійнай справай.

У неаліце заняпала мезалітычная традыцыя арнаментавання касцяных вырабаў. Параўнальна рэдка сустракаюцца матыкі альбо пласціны з простымі наразнымі ўзорамі. Асноўнай сферай арнаментальнага мастацтва стаў гліняны посуд, які з'явіўся менавіта ў неалітычны час. Спецыялісты лічаць, што арнаменты, верагодна, маглі мець магічны сэнс, але таксама задавальнялі эстэтычныя патрэбы чалавека і выступалі ў якасці своеасаблівага паказчыка яго этнакультурнай і інш. прыналежнасці. Распаўсюджанымі элементамі арнаментаў былі адбіткі грабеньчатага штампа, разнастайныя наколы, насечкі, ямкавыя ўціскані, пракрэсленыя рысы і інш., якія ўтваралі гарызантальныя паясы, вертыкальныя лініі, касыя і рамбічныя кампазіцыі. Акрамя геаметрычных арнаментаў, для аздаблення посуду (радзей костак) выкарыстоўваліся антрапаморфныя малюнкі (выявы чалавека) і зааморфныя малюнкі (выявы жывёл і птушак). Такія выявы выступалі як паасобку, так і разам.

Найбольш распаўсюджаным персанажам зааморфных малюнкаў з'яўляецца качка. Схематычныя выявы водаплаваючых птушак, воднай стыхіі сустракаюцца на посудзе ўсвяцкай, верхнедняпроўскай, днепра-данецкай культур. Паводле вядомых інтэрпрэтацый, у гэтых малюнках адлюстраваны вельмі старажытны і шырока распаўсюджаны ў свеце міф аб стварэнні Сусвету з яйка, знесенага чароўнай качкай.

Неалітычны гаршчок, знойдзены ў арэале днепра-данецкай культуры (на помніку Юравічы Калінкавіцкага раёна), упрыгожаны выявай

мужчыны і качкі. Яшчэ адна выява чалавека – мужчыны, які скача з узнятымі рукамі – прысутнічае на костцы, знойдзенай на беразе воз. Вячэра (г.зн. у арэале той жа культуры). На думку спецыялістаў, у гэтай кампазіцыі знайшоў адлюстраванне папулярны міфалагічны сюжэт позненеалітычнага часу. У якасці аднаго з асноўных герояў міфу выступаў узброены сякерай мужына – адмысловы бог-абаронца ў чалавечым абліччы.

На поўначы Беларусі на помніках Крывінскага тарфяніку знойдзены прадметы дробнай пластыкі – касцяныя і драўляныя зааморфныя і антрапаморфныя скульптурныя выявы, частка з якіх можа адносіцца і да позненеалітычнага часу. Старажытныя майстры выраблялі фігуркі качкі, змяі, радзей сустракаюцца выявы чалавека – мужчыны еўрапеоіднага аблічча.

Параўнальна часта на помніках Паўночнай Беларусі трапляюцца ўпрыгожанні – разнастайныя пацеркі з зубоў альбо костак жывёл, у меншай ступені – бурштыну. Даследчыкі мяркуюць, што такія вырабы неслі эстэтычны (прыгажосць), сацыяльны (паказчык месца ў грамадстве) і сакральны (абярэгі) змест.

Найбольш выразнымі, але і рэдкімі археалагічнымі крыніцамі для вывучэння духоўнай культуры чалавека эпохі неаліту з’яўляюцца пахавальныя комплексы. На тэрыторыі Беларусі да неалітычнага часу адносяцца толькі пахаванні культуры шарападобных амфар, знойдзеныя на Панямонні. Сваіх нябожчыкаў носьбіты культуры шарападобных амфар хавалі на невялікіх могільніках у неглыбокіх ямах, абкладзеных камянямі. На тэрыторыі Беларусі вядомы пахаванні па абраду трупаспалення і трупапакладання. У пахавальную камеру змяшчалі пахавальны інвентар (посуд, крамянёвыя і каменныя вырабы, упрыгожанні і інш.). У пахаванні часта знаходзяцца рэшткі буйных рагатых жывёл і свінні. Сустракаюцца асобныя рытуальныя пахаванні жывёл. Як адзначаюць даследчыкі, носьбіты гэтай культуры практыкавалі культы сонца і жывёл, а таксама – своеасаблівыя вытворчыя культы, звязаныя са здабычай крэменю і вырабам сякер.

# ТЭМА 2. ЭНЕАЛІТ І БРОНЗАВЫ ВЕК

## План

1. Агульная характарыстыка перыяду. Паняцці “металургія”, “металаапрацоўка”. Значэнне каляровай металургіі ў развіцці культуры і грамадства
2. Раннеземляробчыя археалагічныя культуры энеалітычнага часу
3. Стэпавыя культуры энеаліту – бронзавага веку
4. Кола культуры шнуравой керамікі
5. Тшцінецкае культурнае кола
6. Позні перыяд бронзавага веку.
7. Гаспадарчая дзейнасць чалавека на тэрыторыі Беларусі ў бронзавым веку
8. Духоўная культура насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў бронзавым веку
9. Праблема з‘яўлення і распаўсюджання першых індаеўрапейцаў на тэрыторыі Еўропы.

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 3.*

## 1. Агульная характарыстыка перыяду. Паняцце “металургія”, “металаапрацоўка”. Значэнне каляровай металургіі ў развіцці культуры і грамадства

Энеаліт і бронзавы век – гэта перыяды, звязаныя са з’яўленнем, станаўленнем і развіццём каляровай металургіі і металаапрацоўкі. Гэтыя перыяды часта характарызуюцца як “эпоха палеаметалаў”.

*Металургія* – вобласць навукі і тэхнікі, якая ахоплівае працэсы атрымання металаў з руд, а таксама працэсы, звязаныя са зменай хімічнага складу, структуры, уласцівасцяў металічных сплаваў. Старажытныя металургіі валодалі навыкамі атрымання металаў з прыроднай сыравіны (выплаўкі металаў), атрымання сплаваў.

*Металаапрацоўка* – тэхналагічны працэс змены формы, памераў і якасцяў металаў і сплаваў. Метал апрацоўваюць як у гарачым, так і халодным стане Старажытнымі майстрамі выкарыстоўваліся параўнальна нешматлікія спосабы апрацоўкі металаў: механічная апрацоўка (напр., аббіўка), коўка, ліццё і інш.

Каляровая металургія прайшла ў сваім развіцці 4 этапы:

1) Выкарыстанне самароднай медзі, якую, напэўна, лічылі каменем і адпаведна спрабавалі апрацоўваць з дапамогаю аббіўкі. Выпрацоўваліся метады халоднай коўкі.

2) Плаўка медзі і адліўка вырабаў у адкрытых формах.

3) Выплаўка медзі з руды. З’яўленне ліцця ў раздымных двухбаковых формах.

4) З’яўленне сплаваў на меднай аснове – бронзы.

Некаторыя даследчыкі першыя тры этапы аб’ядноўваюць у энеаліт альбо меднакаменны век (ад лат. “энэус” – медзь і “літас” – камень). Можна сустрэць і назву “халкаліт” (ад грэч. слоў “медзь” і “камень”). Часам гэтыя перыяды адносяць да позніх этапаў неалітычнай эпохі. Чацвёрты этап супадае з бронзавым векам.

Распаўсюджанне каляровай металургіі і металаапрацоўкі, пераход да бронзавага веку – працэсы, якія не з’яўляліся адначасовымі, раўнамернымі і ўсеагульнымі. У розных рэгіёнах яны праходзілі па-рознаму. Таму адной з праблем вывучэння эпохі ранніх металаў з’яўляецца праблема датавання перыядаў і вызначэння іх храналагічных межаў і гаспадарча-тэхнічных і культурна-гістарычных асаблівасцяў. Агульныя межы еўрапейскага бронзавага веку – каля 2350/1950 – 1300/700 гг. да н.э.

Складаным з’яўляецца і пытанне паходжання каляровай металургіі. Згодна з прынятым сёння меркаваннем, першасны цэнтр яе зараджэння размяшчаўся ў Азіі, у рэгіёне Урадлівага паўмесяца (тэрыторыя ад заходніх схілаў горнага масіва Загорас да Усходняй Анатоліі і далей да Паўднёвага Леванта). Такім чынам, першыя металургічныя веды з’явіліся ў тым жа рэгіёне, дзе ўзнікла вытворчая гаспадарка.

Найбольш старажытныя вырабы з медзі былі знойдзены ў Чайюню-Тэпесі. Яны датуюцца IX тыс. да н.э. У VIII – VII тыс. да н.э. навыкі вырабу рэчаў з медзі распаўсюдзіліся па іншых раёнах Пярэдняй Азіі.

Першапачаткова людзі выкарыстоўвалі выключна самародную медзь – г.зн. медзь, якая сустракаецца ў прыродзе ў чыстым выглядзе. Такі метал быў параўнальна мягкім, і ён лічыўся каменем з асаблівымі ўласцівасцямі. Апрацоўвалі самародную медзь метадам халоднай коўкі, калі прымянялі вядомыя і звыклыя ўдарныя тэхнікі. Аднак у выніку такой апрацоўкі медзь станавілася вельмі крохкай. Такія недахопы можна выправіць з дапамогай награвання. Таму ўжо на самых ранніх этапах выкарыстання металу чалавек пачаў падвяргаць медзь і тэрмічнай апрацоўцы – т.зв. прамежкаваму адпалу. Удасканаленне гэтай тэхнікі прывяло да адкрыцця такіх спосабаў апрацоўкі металу, як плаўка і ліццё. Найбольш

старажытнымі вырабамі з медзі з’яўляліся пацеркі, выраблены з тонкіх пласцін, а таксама простыя прылады (рыбалоўныя кручкі, шылы і г.д.).

Аднак самародная медзь трапляецца параўнальна рэдка. Значна часцей метал сустракаецца ў прыродзе ў выглядзе руды. Дакладна не вядома, дзе і калі чалавек пачаў выплаўляць медзь з руды. Аднак даследчыкі ўпэўненыя, што каляровая металургія не пачалася з выпадковасці, таму што атрыманне металу – даволі складаны працэс. Для выплаўкі медзі з руды патрэбныя высокія тэмпературы (каля 1100º С) і асаблівыя хімічныя ўмовы, калі амаль цалкам адсутнічае доступ кіслароду. Такія ўмовы забяспечвае закрытая прастора, адным з найбольш простых тыпаў якой магла з’яўляцца яма, пакрытая слоем драўніннага вугалю, а таксама тыглі (тоўстасценныя плавільныя пасудзіны).

Самыя старажытныя кавалкі меднай руды са слядамі награвання паходзяць з паселішча Чатал-Гуюк і датуюцца VII тыс. да н.э. Даследчыкі адзначаюць, што гэтыя знаходкі не з’яўляюцца доказамі наўмыснай металургічнай дзейнасці чалавека. Магчыма, руда проста трапіла ў вогнішча.

Дакладныя сведчанні аб атрыманні металу з руды адносяцца да VI тыс. да н.э. Гэтым часам датуецца свінцовы бранзалет, знойдзены на помніку Ярыш Тэпе. Свінец у самародным выглядзе не сустракаецца, ён мог быць атрыманы толькі пры аднаўленні руды. Такім чынам, з сярэдзіны VI тыс. да н.э. распаўсюдзілася практыка атрымання металаў з руды.

Цягам VI—V тыс. да н. э. веданне ўласцівасцяў медзі распаўсюдзілася на абшары ўсёй Пярэдняй Азіі, паўночнай Афрыцы, Закаўказзя, паўднёвай Еўропы. У IV–III тыс. да н.э. пачалі распрацоўваць радовішчы на тэрыторыі Паўднёвай і Цэнтральнай Еўропы, найбольш значным з якіх з’яўлялася Балкана-Карпацкае. У канцы III – пачатку II тыс. да н.э. метал распаўсюдзіўся і ў лясной зоне Усходняй Еўропы. З атрыманай медзі выраблялі ўпрыгожанні, зброю (сякеры, кінжалы), некаторыя прылады працы (напр., шылы, нажы і інш).

Чыстая медзь – параўнальна мягкі метал. Прылады, выраблены з такой сыравіны, не заўсёды былі практычныя ў выкарыстанні. Старажытны чалавек вырашыў гэтую праблему вынаходніцтвам бронзы. Бронза – гэта сплаў на меднай аснове. Найбольш старажытная бронза прадстаўляла сабой сплаў медзі і цынку (аптымальны склад – 90% і 10% адпаведна). Замест цынку маглі выкарыстоўваць і мыш’як. У выніку развіцця металургіі распаўсюджанне набыла “класічная” алавяністая бронза – сплаў медзі з волавам.

Бронзаліцейная справа ўзнікла на тэрыторыі Блізкага Усходу ў V тыс. да н.э. У IV тыс. да н.э. навыкі атрымання бронзы распаўсюдзіліся ў Малой Азіі, Усходнім Міжзімнамор'і. У III тыс. да н.э. з бронзай пазнаёмілася і насельніцтва Цэнтральнай Еўропы. Першапачаткова даследчыкі меркавалі, што з'яўленне бронзы на еўрапейскіх абшарах было звязана з запазычаннем блізкаўсходніх дасягненняў. Сёння спецыялісты сцвярджаюць, што развіццё металургіі бронзы на тэрыторыі Еўропы адбывалася ў розных месцах (ва Усходнім Міжзімнамор'і, на Балканах, у Карпатах, у прыальпійскім рэгіёне), і ва ўсіх рэгіёнах працэс гэты меў незалежны характар.

Атрыманне і апрацоўка бронзы – шэраг складаных тэхналагічных працэсаў. Спачатку ажыццяўлялася здабыча руды. Яе збіралі на паверхні, з цягам часу перайшлі на шахтавы спосаб. Старажытныя капальні знойдзены ў Іберыі, Ціролі, у раёне Зальцбурга і інш. Горныя пароды награвалі, гарачыя пласты палівалі вадой, у выніку чаго яны растрэсківаліся. У расколіны забівалі драўляныя ці рагавыя кліны, адбівалі кускі пароды і руды. Руду драбілі, падымалі на паверхню, расціралі ў парашок, прамывалі, абпальвалі і, нарэшце, плавілі, звычайна ў тыглях. Для атрымання бронзы патрэбная тэмпература каля 700–900° С. Расплаўлены метал залівалі ў ліцейныя формы. У старажытнасці выкарыстоўваліся шматразовыя каменныя формы і аднаразовыя гліняныя формы. Апошнім, неабавязковым этапам вытворчасці вырабаў была дадатковая механічная апрацоўка рэчы (напр., шліфаванне ліцейных швоў).

Раннія металічныя вырабы ўжываліся разам з каменнымі і крамянёвымі прыладамі. Выкарыстанне новых матэрыялаў выклікала прыкметныя змены ў жыцці тагачасных людзей і спрыяла асабліва паскоранаму развіццю грамадства. Наступленне новай эпохі ў першую чаргу адзначалася зрухамі ў гаспадарчай, сацыяльнай і духоўнай сферах жыцця.

Самыя старажытныя, медныя, вырабы былі вельмі мягкімі і, адпаведна, не маглі мець практычнага значэння. Яны выконвалі пэўныя сімвалічныя функцыі – падкрэслівалі высокі сацыяльны статус сваіх уладальнікаў. З цягам часу метал перастаў быць толькі "прэстыжным" складнікам культуры. Адкрыццё бронзы дало надзвычай прыдатны матэрыял для вырабу зручных прыладаў працы. Вынаходніцтва плаўкі і ліцця дазволіла атрымоўваць вырабы складаных формаў, якія было немагчыма атрымаць з каменю ці крэменю. Практычнасць металічных прыладаў была абумоўлена таксама цвёрдасцю і/ці вастрынёй іх

працоўных частак. Распаўсюджанне металаў вяло да ўдасканалення многіх галін гаспадарчай дзейнасці старажытных людзей, напр., дрэваапрацоўкі і домабудаўніцтва. Выкарыстанне металічных прыладаў садзейнічала таксама далейшаму распаўсюджанню земляробства і жывёлагадоўлі.

У эпоху палеаметалаў актывізаваўся працэс нераўнамернага развіцця грамадства. Паглыблялася спецыялізацыя асобных відаў гаспадарчай дзейнасці (металургіі, ганчарства, каменеапрацоўкі, крэмнеапрацоўкі і інш). Рамяство было аддзеленае ад іншых відаў гаспадаркі. Адбывалася далейшая сацыяльная дыферэнцыяцыя грамадства, ішоў працэс вылучэння мясцовых эліт. Металічныя вырабы звыкла выкарыстоўваліся для падкрэслівання высокага сацыяльнага статуса чалавека альбо пэўнай супольнасці. .

Павялічвалася нераўнамернасць у развіцці асобных тэрыторый Цэнтрамі культурных і сацыяльна-эканамічных’ змен з’яўляліся цэнтры развіцця каляровай металургіі і металаапрацоўкі. Тыя рэгіёны, якія не мелі радовішчаў металаноснай руды, займалі перыферыйнае становішча. Сацыяльныя і эканамічныя зрухі на такіх тэрыторыях адбываліся ў больш павольным тэмпе. Разам з тым, нераўнамернасць у развіцці асобных раёнаў садзейнічала развіццю абменных зносін паміж рознымі групамі насельніцтвам. Аб’ектам абмену з’яўляліся як зліткі металаў, так і металічныя вырабы. Удасканальваліся сродкі зносін. Важным дасягненнем новай эпохі стала вынаходніцтва кола. З’явіліся караблі на вёслах і ветразях, колавыя павозкі. Вынікам складаных сацыяльна-эканамічных працэсаў стала павялічэнне колькасці ваенных канфліктаў. З’явіліся новыя віды спецыялізаванай зброі (металічныя мячы, кінжалы і г.д.), была вынайдзена калясніца.

Развіццё вытворчай гаспадаркі, развіццё каляровай металургі садзейнічала паступоваму змяненню і светапогляду старажытнага насельніцтва. Узніклі і распаўсюджваліся культы сонца і агню, земляробчыя і жывёлагадоўчыя культы і інш.

**Бронзавы век Беларусі** вывучаны параўнальна слаба. Згодна з сучаснымі ўяўленнямі, на тэрыторыі Беларусі медныя і бронзавыя вырабы пачынаюць выкарыстоўвацца ў канцы III тыс. да н.э. Заканчэнне бронзавага веку прыпадае на канец II тыс. да н.э. – пачатак I тыс. да н.э. Спецыфіка бронзавага веку Беларусі заключаецца ў тым, што металічных вырабаў было вельмі мала (на нашай тэрыторыі няма радовішчаў металу), і асноўнай сыравінай для вырабу прыладаў працы па-ранейшаму заставаліся крэмень, камень, костка.

У познім неаліце – пачатковым перыядзе бронзавага веку тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў зону распаўсюджання кола культуры шнуравой керамікі, у раннім бронзавым веку – у арэал культуры тшцінецкага культурнага кола, у познім бронзавым веку (найменш даследаваным перыядзе) – лебядоўскай культуры і лужыцкай культуры. .

**2. Раннеземляробчыя археалагічныя культуры энеалітычнага часу**

У энеаліце адбываліся істотныя змены ў гаспадарчай дзейнасці людзей. Атрымалі шырокае распаўсюджанне вытворчыя формы гаспадаркі. Удасканальваліся земляробчыя прылады працы. Развіцце металаапрацоўкі садзейнічала замацаванню спецыялізацыі асобных груп насельніцтва, пашырэнню міжпляменнога абмену. Складаваліся ўстойлівыя гандлевыя шляхі.

Росквіт культур эпохі энеаліту на поўдні Усходняй Еўропы прыпадае на IV тыс. да н.э. Адной з самых яскравых культур гэтага часу з’яўлялася **трыпольская культура,** якая атрымала назву ад с. Трыполле Кіеўскай вобл.

*Арэал* культуры ахопліваў вялізкую тэрыторыю, якая ўключала Малдавію, частку Румыніі і Правабярэжную Украіну.

*Храналагічныя межы* існавання трыпольскай культуры – канец V–пачатак III тыс. да н.э.

На раннім этапе (канец V – сярэдзіна IV тыс. да н.э.) трыпольскія *паселішчы* размяшчаліся па краях тэрасы рэк. Яны займалі параўнальна невялікую плошчу, як правіла, былі неўмацаванымі, зрэдку з напольнага боку акружаліся ровам. Паселішчы забудоўваліся хаатычна, прадуманая планіроўка адсутнічала. Пабудовы былі двух тыпаў: зямлянкі і наземныя глінабітныя хаты. Аснову сцен жытла складаў пляцень, які быў абмазаны глінай. Пабудовы складаліся з аднаго ці двух памяшканняў, у якіх знаходзіліся печ ці адкрыты ачаг. У некаторых рэгіенах дамы былі двухпавярховымі. Побач з жытламі размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы. Пазней (пачынаючы з другой паловы IV тыс. да н.э.) з’явіліся паселішчы плошчай звыш 350 га. Такія паселішчы часам называюць “протагарадамі”. Яны ўмацоўваліся землянымі валамі і ровамі. Паселішчы мелі ўпарадкаваную радыяльную ці канцэнтрычную забудову: жытлы размяшчаліся канцэнтрычнымі шэрагамі, у цэнтры кола заставалася вольная прастора, якая выкарыстоўвалася ў якасці загону для жывёлы. На апошнім этапе існавання культуры паселішчы-гіганты зніклі, выкарыстоўваліся невялікія па плошчы пасяленні.

*Пахаванні.* На раннім этапе існавання культуры пахаванні нешматлікія, часта размяшчаліся на паселішчах. На пазнейшых этапах пахавальныя комплексы характарызаваліся значнай разнастайнасцю. Вядомы як грунтовыя могільнікі, так і курганы. Носьбіты трыпольскай культуры хавалі сваіх памерлых па абраду і крэмацыі, і інгумацыі (трупапакладанне). У магілы змяшчалі багаты пахавальны інвентар. У пахаваннях мужчын археолагі знаходзяць разнастайныя прылады працы. Жаночыя пахаванні суправаджаюцца праселкамі. Частыя знаходкі ў дзіцячых пахаваннях – гліняныя антрапаморфныя фігуркі.

*Прылады працы, узбраенне.* Выраблялiся пераважна з крэменю, сланца, косці і рога. На помніках часта сустракаюцца крамянёвыя скрабкі, скоблі для апрацоўкі дрэва, свердзелы і праколкі, укладышы сярпоў. Сланцавыя прылады выкарыстоўваліся для працы па дрэву (сякеры, цесла, долаты, стамескі), а таксама пры сельскагаспадарчых працах у якасці матык. Касцяныя вырабы – шылы, гарпуны, кручкі, матыкі. Зброя прадстаўлена каменнымі сякерамі.

Медныя вырабы нешматлікія: прылады працы (шылы, рыбалоўныя кручкі, долаты, зубілы); упрыгожванні (пярсцёнкі, пацеркі, бранзалеты). Надзвычай цікавай знаходкай з'яўляецца Карбунскі скарб. У яго склад уваходзіла звыш 850 прадметаў, сярод іх – медныя сякеры, пацеркі, бранзалеты, падвескі, антрапаморфныя фігуры. У скарбе знаходзіліся і каменныя вырабы, у т.л. мармуравая сякера, якая, верагодна, была парадной зброяй.

*Кераміка* падраздзяляецца на тры групы: кухонную, сталовую і парадную. Кухонны посуд выкарыстоўваўся для захавання прыпасаў і гатавання ежы. Гэта былі гаршкі, талеркі на паддоне, міскі. Арнаментацыя гэтай керамікі бедная (наколкі, насечкі). Сталовы посуд выраблены значна лепей. Сустракаюцца акруглыя ці баканічныя гаршкі, вялікія збанападобныя пасудзіны, кубкі, чарпакі. Парадны посуд выраблены вельмі старанна. Кераміка заўседы загладжаная, часта заглянцаваная. Значную частку пасудзін гэтай групы складаюць талеркі, грушападобныя гаршкі, вазы. Большасць пасудзін арнаментаваная ўзорамі у выглядзе стужак, пятлі ці спіралі. На позніх этапах існавання культуры распаўсюдзілася кераміка, упрыгожаная размалеўкай, якую наносілі на сырую пасудзіну трыма фарбамі: белай (крэйда), чырвонай (вохра) і чорнай (попел). Найбольш тыповым быў арнамент у выглядзе спіралей.

*Гаспадарка.* Аснову заняткаў насельніцтва складала земляробства і жывёлагадоўля. Зямлю апрацоўвалі з дапамогай матык. Вырошчвалі

збожжавыя (пшаніца, ячмень, проса), бабовыя. Істотная роля ў жыццезабеспячэння насельніцтва належала і жывелагадоўлі. Разводзілі дробную і буйную рагатую жывёлу, свіней. Было вядома ткацтва. Насельніцтва займалася і каляровая металаапрацоўкай (выкарыстоўвалі тэхнікі халоднай коўкі, ліцця з выкарыстаннем адкрытых форм і інш.).

*Мастацтва.* На паселішчах, у пахаваннях археолагі знаходзяць вялікую колькасць жаночых гліняных статуэтак, фігурак жывёл. У гліну, з якой выраблялі фігуркі, часам дадавалі зярняты. Верагодна, фігуркі былі звязаныя з культам урадлівасці. Частай знаходкай з'яўляюцца дзіўныя вырабы, якія па сваёй форме нагадваюць біноклі. Функцыі гэтых прадметаў дакладна не вызначаны.

*Паходжанне.* Асноўны ўплыў на фарміраванне трыпольскай культуры аказалі неалітычныя культуры Балкана-Дунайскага рэгіёну.

*Гістарычныя лёсы.* Дакладна не вызначаны. Значная разнастанасць матэрыяльнай культуры, пахавальнай абраднасці сведчыць аб тым, што носьбіты трыпольскай культуры актыўна кантактавалі з іншымі групамі насельніцтва. Не выключаецца, што трыпольская культура аказала пэўны ўплыў на фарміраванне жывёлагадоўчых культур бронзавага веку.

### 3. Стэпавыя культуры энеаліту – бронзавага веку

Стэпавая зона Еўразіі – гэта рэгіён, абмежаваны лясной паласой Усходняй Еўропы, Чорным морам і Каспійскім морам, Каўказскімі гарамі, гарыстымі раёнамі Сярэдняй і Цэнтральнай Азіі. Кліматычныя умовы, флора і фауна гэтых абшараў істотна адрозніваліся ад прыродных асаблівасцяў іншых рэгіёнаў Еўропы. Таму, калі ў VII–V тыс да н.э. на паўднёвых тэрыторыях паступава распаўсюджвалася вытворчая гаспадарка, стэпавае насельніцтва ўспрымала пераважна адну новую форму гаспадарання – жывёлагадоўлю. У залежнасці ад умоў практыкавалася і стацыянарная, і – у большай ступені – качавая жывёлагадоўля. Толькі нешматлікія супольнасці, якія жылі ў адпаведных экалагічных умовах (напр., на узбярэжак рэк), займаліся земляробствам.

Такая гаспадарчая спецыялізацыя ўплывала на фарміраванне своесаблівай матэрыяльнай культуры, ідэалогіі і светапогляду, сацыяльнай арганізацыі грамадства. Стэпавае насельніцтва вяло мабільны лад жыцця. Паселішчы былі нешматлікія, яны часта функцыянавалі цягам параўнальна кароткага часу. Цэнтрам, які аб'ядноўваў супольнасць, быў не дом, але пахаванне. Узводзіліся курганы з вялікімі насыпамі, часта з дадатковымі каменнымі, драўлянымі канструкцыямі.

Гаспадарка мела экстэнсіўны характар (для выпасу жывёл было неабходна павялічваць плошчу асвоеных тэрыторый), што садзейнічала павялічэнню колькасці канфліктаў сярод розных груп насельніцтва.

У новых умовах ўзмацнялася сацыяльная роля мужчын. Іх сацыяльны статус, гаспадарчая і ваенная дзейнасць знаходзілі сваё адлюстраванне ў пахавальных рытуалах. Звыклым складнікам пахавальнага інвентару з'яўлялася каменная, крамянёвая, металічная зброя. У магілы часам змяшчалі павозкі альбо іх часткі.

Стэпавыя супольнасці аказалі вялікі ўплыў на развіццё насельніцтва Усходняй і часткова Цэнтральнай Еўропы. Рассяляючыся на вялікіх абшарах, перамяшчаючыя на значныя адлегласці і сутыкаючыся з рознымі культурнымі, этнічнымі, сацыяльнымі і інш. групамі людзей, стэпавыя жыхары садзейнічалі распаўсюджанню найбольш важных дасягненняў сваёй эпохі.

Даследчыкамі вылучаецца шэраг археалагічных культур, якія існавалі ў энеаліце – бронзавым веку ў стэпавай зоне.

Адной з найбольш значных культурных з'яў позняга энеаліту была **ямная культурна-гістарычная супольнасць,** якая існавала ў сярэдзіне IV – сярэдзіне III тыс. да н.э. і займала тэрыторыю ад Паўднёвага Прыўралля на ўсходзе да Балкан на захадзе.

Назва культуры паходзіць ад характэрнай рысы *пахаванняў:* пад вялікім земляным курганным насыпам знаходзілася простая яма (часам накрытая драўляным насцілам), у якой хавалі нябожчыка. Шкілеты знаходзіліся ў скурчаным на баку стане. Яны часта былі пасыпаныя вохрай. Пахавальны інвентар даволі сціплы. У магілу змяшчалі крамянёвыя стрэлы, нажы, скрабкі, касцяныя шылы, кручкі, гарпуны, булаўкі, пацеркі. Медныя вырабы нешматлікія, пераважна шылы, нажы, некаторыя віды зброі.

*Кераміка* мела кругладонную ці яйкападобную форму. Яна ўпрыгожвалася грабеньчатым ці шнуравым арнаментам.

*Паселішчы* старажытнаямнай супольнасці нешматлікія. На раннім этапе існавання культуры паселішчы былі неўмацаваныя, на познім этапе з'явіліся буйныя, часта моцна ўмацаваныя паселішчы. Жытлы – глінабітныя паўзямлянкі і наземныя дамы.

*Гаспадарка* старажытных плямен была жывелагадоўчай. У статку пераважалі коні і авечкі. На паселішчах ямнай супольнасці знойдзены матыкі, зерняцеркі, серпы, крамяневыя сярпы, што сведчыць і аб занятках земляробствам.

На змену ямнай прыйшла **катакомбная культурна-гістарычная супольнасць,** якая існавала цягам III – пачатку II тыс. да н.э. Яе *арэал* ахопліваў тэрыторыю ад Дняпра да Сярэдняй Волгі.

Назву культуры далі своеасаблівыя *пахаванні.* Нябожчыкаў хавалі не ў звыклых ямах, але ў спецыяльных нішах-выступах (катакомбах), якія былі зроблены ў сценках магільных ям. Дно катакомбы пакрывалі вохрай, вапнай, высцілалі чаротам. Памерлага размяшчалі ў скурчаным стане, побач клалі посуд, упрыгожванні, прылады працы, зброю. Уваход у катакомбу завальвалі камянямі.

*Паселішчы* неўмацаваныя, размяшчаліся ў пойме рэк. Жытлы – наземныя пабудовы і паўзямлянкі, унутры якіх размяшчаліся агнішчы.

*Прылады працы.* Большасць інвентару выраблялiся з крэменю і каменю. Вядомы наканечнікі стрэл і дроцікаў, скрабкі, нажы, каменныя свідраваныя сякеры. Шмат прадметаў выраблялі з бронзы: лістападобныя нажы, сякеры, шылы, упрыгожванні.

*Кераміка.* Асноўны тып посуду – гаршкі з плоскім дном, арнаментаваныя нарэзкамі, грабеньчатым штампам, ямкамі, наколамі і інш., што ўтваралі разнастайныя кампазіцыі, найбольш распаўсюджанымі з якіх былі зігзагі, канцэнтрычныя колы і спіралі.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадаркі складала жывелагадоўля і земляробства. Гадавалі дробную і буйную рагатую жывёлу, свіней, каня. Заняткі земляробствам падцвярджаюцца знаходкамі керамікі з адбіткамі зярняткаў проса, каменных матык, крамянёвых сярпоў. Насельніцтва займалася і металаапрацоўкай.

У канцы III – першай палове II тыс. да н.э. тэрыторыя стэпавых і лесастэпавых зон ад Волгі, Дона да Дуная і ад Крыма да сярэдняга Падняпроўя была заселеная носьбітамі **культуры шматвалікавай керамікі.** Назва культуры паходзіць ад характэрнага элементу ўпрыгожання посуду – вялікай колькаці наляпных валікаў.

*Паселішчы* размяшчаліся на поймавых узвышшах і берагах рэк. Насельніцтва будавала наземныя жытлы і паўзямлянкі.

*Пахаванні* курганныя. Памерлага змяшчалі ў простыя ямы, каменныя скрыні, зрубы і інш. канструкцыі у скурчаным стане. Побач з нябожчыкам пакідалі разнастайны пахавальны інвентар: кераміку (плоскадонныя гаршкі, слоікі, міскі), касцяныя вырабы (шылы, рыбалоўныя кручкі, спражкі і інш), каменныя і крамянёвыя вырабы (наканечнікі стрэл, дроцікаў, скрабкі, нажы і і г.д.), металічныя рэчы (сякеры, цяслы, далоты), фаянсавыя пацеркі.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадаркі складала качавая жывелагадоўля.

Помнікі культуры шматвалікавай керамікі вядомы і на тэрыторыі Беларусі. Нешматлікія прадстаўнікі гэтай стэпавай культуры дасягалі Гомельскага Палесся.

У першай палове ІІ тыс. да н.э. у стэпавай паласе склалася чарговая культурна-гістарычная супольнасць – **зрубная**. Яе носьбіты засялялі тэрыторыю ад Урала на ўсходзе да Дняпра і Буга на захадзе.

Назва культуры паходзіць ад спосабу будовы пахаванняў. Носьбіты культуры хавалі сваіх памерлых у курганах, пры гэтым у насыпах рабілі зрубы вышыней у 1–2 венца і перакрывалі іх накатам. Нябожчыкаў хавалі ў скурчаным стане, побач з імі змяшчалі гліняны посуд, бронзавыя і каменныя рэчы.

*Паселішчы* зрубнай культуры размяшчаліся на берагах рэк. Жыллём служылі доўгія зрубныя паўзямлянкі, унутры якіх знаходзілася некалькі ачагоў. Не выключаецца, што частка такой пабудовы выкарыстоўвалася для зімовага ўтрымання жывёлы.

*Гаспадарка* носьбітаў зрубнай супольнасці была комплекснай. Яна ўключала ў сябе адгонную жывелагадоўлю і матыжнае земляробства. Адметнай рысай культуры з’яўляецца высокая ступень развіцця каляровай металургіі. Старажытныя металургі выкарытоўвалі метал, які паступаў з Паўночнага Каўказа, з Казахстана і Урала. Выраблялі разнастайныя прылады працы, зброю (частыя знаходкі – утулкавыя наканечнікі дзідаў, кінжалы, сякеры-кельты), упрыгожанні. У зрубнай супольнасці адбываўся працэс вылучэння бронзаліцейнай вытворчасці ў самастойную галіну, аб чым сведчаць шматлікія скарбы бронзавых рэчаў і пахаванні бронзаліцейшчыкаў (пахаванні, у якіх былі знойдзены пахавальны інвентар у выглядзе бронзавых вырабаў, нарыхтовак, спецыялізаваных прыладаў працы).

## 4. Кола культуры шнуравой керамікі

Для еўрапейскай археалогіі адной з ключавых культур неаліту – пачатку бронзавага веку з’яўляецца культура шнуравой керамікі. Яе назва ўзнікла ад звычая арнаментаваць посуд адбіткамі шнура.

Культура вывучаецца цягам каля 150 год. За гэты час была выпрацавана вялікая колькасць канцэпцый культуры шнурвой керамікі. На сучасным этапе даследаванняў навукоўцы адзначаюць істотную разнастайнасць комплексаў са “шнуравымі рысамі”, таму разглядаюць культуру ў двух аспектах. У вузкім сэнсе культура шнуравой керамікі –

гэта толькі класічныя групы Сярэдняй і Заходняй Еўропы, Скандынавіі і часткова Усходняй Прыбалтыкі. У шырокім сэнсе гаворка вядзецца пра кола культуры шнуравой керамікі – культуры і культурныя комплексы, якія існавалі на вялікіх абшарах Еўропы ад Рэйна на захадзе да Верхняга Паволжа на ўсходзе і ад Скандынавіі на поўначы да Сярэдняга Падняпроўя на поўдні.

У развіцці культуры шнуравой керамікі (у вузкім сэнсе) вылучаюць тры этапы: “агульнаеўрапейскі гарызонт”, “сярэднееўрапейскі гарызонт”, “гарызонт лакальных груп”. Час існавання “класічнай” культуры – каля 3000 – 2000 гг. да н.э.

Носьбіты культуры займаліся пераважна вандроўнай жывёлагадоўляй. Не выключаецца, што частка насельніцтва вяла і аседлае жыццё, але пры гэтым будавала такія жытлы, ад якіх амаль не засталося слядоў, даступных археалагам. Сваіх памерлых “шнуравікі” хавалі ў курганных ці грунтавых магілах па абраду трупапалажэння, зрэдку трупапакладання. Нябожчыка змяшчалі ў пахаванне ў скурчаным стане, на баку. Побач з ім пакідалі пахавальны інвентар (посуд, каменныя і крамянёвыя прылады працы, зброю). Характэрнымі рысамі матэрыяльнай культуры насельніцтва з’яўляюцца: параўнальна высокія кубкі, упрыгожаныя адбіткамі шнура і лінейнага штампа, амфары з двума ці чатырма вушкамі (ручкамі), лодкападобныя каменныя свідраваныя сякеры, касцяныя шылы і долаты, касцяныя пацеркі і падвескі з зубоў жывёл.

Самыя раннія “шнуравыя” прыкметы зафіксаваныя на тэрыторыі пераважна Цэнтральнай Еўропы. Нешматлікія знаходкі “агульнаеўрапейкага гарызонту” адзначаюцца і на тэрыторыі Беларусі. “Агульнаеўрапейскі гарызонт", на думку некаторых навукоўцаў, мог утварыцца ў выніку вельмі хуткага распаўсюджання пэўных груп насельніцтва са старажытнымі "шнуравымі” рысамі.

Шматлікія культуры пазнейшых “шнуравікоў” (кола культуры шнуравой керамікі ў шырокім сэнсе) адзначаюцца на вялікіх прасторах Сярэдняй і Усходняй Ёуропы, у тым ліку і на Беларусі. У цэлым, яны існавалі ў перыяд ад першай паловы III тыс. да н.э. да прыкладна 1700 г. да н.э. Гэтыя культуры мелі шэраг агульных “шнуравых” рысаў (напр., падабенства ў формах і арнаментацыі посуду, тыпах каменных і крамянёвых вырабаў, пахавальнай абраднасці і г.д.), пры гэтым адрозніваліся шматлікімі лакальнымі асаблівасцямі. Да ліку найбольш вывучаных культур шнуравога кола адносяцца прыморская, злоцкая, сярэднедняпроўская, фацьянаўская і інш. Згодна з найбольш

распаўсюджаным меркаваннем, фарміраванне гэтых культур адбывалася ў выніку вельмі складаных доўгачасовых працэсаў (акультурацыі, асіміляцыі, інфільтрацыі і інш.), у якіх прымалі ўдзел як нашчадкі "агульнаеўрапейскага гарызонту", так і мясцовыя групы насельніцтва.

Археолагі неаднаразова звярталі ўвагу на праблему этнічнай прыналежнасці носьбітаў "шнуравых" традыцый. У розныя часы гэта насельніцтва адносілі да індагерманскіх плямёнаў, праславян, старажытных балтаў. На сучасным этапе даследаванняў навукоўцы імкнуцца адыходзіць ад вывучэння этнічнай праблематыкі ў дачыненні да перыядаў каменнага – ранняга бронзавага вякоў. Большасцю спецыялістаў сцвярджаецца, што арэал культуры шнуравой керамікі адпавядаў тэрыторыі рассялення паўночнай групы індаеўрапейкіх плямёнаў, у склад якой уваходзілі продкі славян, балтаў, германцаў.

Асобныя "шнуравыя" культурныя комплексы адзначаюцца і на тэрыторыі Беларусі. Найбольш вывучанай з іх з'яўляецца **сярэднедняпроўская культура,** назва якой паходзіць ад аднаго з рэгіёнаў распаўсюджання.

*Арэал* – Верхняе і Сярэдняе Падняпроўе, Цэнтральнае Палессе. Асобныя помнікі вядомы ў вярхоўях Заходняга Буга і Віслы. Уплыў культуры распаўсюджваўся на просторы Падзесення, Падзвіння, Заходняга Палесся і Верхняга Панямоння.

*Час існавання* культуры – каля 2500 – 1700 гг. да н.э.

*Паселішчы* размяшчался на поймавых узвышшах, па краі тэрас рэк. На некаторых помніках выяўлены рэшткі наземных слупавых жытлаў з ямамі-агнішчамі. Насельніцтва таксама ўзводзіла заглыбленыя ў зямлю будынкі з ямамі-агнішчамі каля сцяны альбо ў цэнтры. Побач з жытламі размяшчаліся гаспадарчыя ямы. На паселішчах знаходзяць кераміку, крамянёвыя і каменныя вырабы.

*Пахавальныя помнікі* вывучаны лепш за паселішчы. Насельніцтва сярэднедняпроўскай культуры здзяйсняла пахаванні ў курганных і грунтовых пахаваннях. Курганы прадстаўлялі сабой паўсферычныя насыпы вышынёй да 3 м. Некаторыя насыпы абводзіліся кругавымі ровікамі. Пахаванні знаходзіліся ў ямах. Пахавальны абрад у курганах – трупапакладанне ў скурчаным стане. Адзначаюцца і падкурганныя пахаванні з трупаспаленнем. На дно ям маглі змяшчацца попельна-вугальныя рэшткі, вохра, падсцілка з дрэва, бяросты, чароту. Ямы часта перакрываліся драўлянымі плахамі, над імі ўзвозілія слупавыя збудаванні, побач паліліся вогнішчы, прыносіліся рэчавыя і жывёльныя ахвяры.

Грунтовыя пахаванні здзяйсняліся па абраду і трупапакладання, і трупаспалення. Над некаторымі ямамі ўзводзіліся слупавыя збудаванні, асобныя групы пахаванняў абводзіліся кругавымі раўкамі, у якіх знойдзены сляды ўкапаных слупоў.

Як правіла, пахавальны інвентар быў вельмі багаты. У яго склад уваходзіў керамічны посуд, крамянёвыя вырабы (сякеры, наканечнікі стрэл, дроцікаў, дзідаў, скрабкі, нажы і г.д.), каменныя вырабы (сякеры, шліфавальныя пліткі), радзей – бурштыновыя падвескі, фаянсавая і шкляная пацеркі, металічныя рэчы (сякеры, наканечнікі дзідаў, шылы, нажы і г.д.). У пахаваннях часта знаходзяць косткі жывёл.

*Кераміка* прадстаўлена разнастайнымі тыпамі – гаршкі, кубкі, міскі, банкі, амфары. Сярод керамікі пераважаюць гаршкі з акруглым тулавам і дном, радзей плоскім дном. Посуд багата ўпрыгожаны – насечкамі, уціскаммі, адбіткамі шнура, наразнымі лініямі і г.д. Найбольш тыповы для сярэднедняпроўскай культуры т.зв. “паркетны арнамент” – гарызантальныя пасы заштрыхаваных трохвугольнікаў са злучанымі бакамі.

*Прылады працы і зброя.* Пераважная большасць прыладаў выраблена з каменя і крэменю. З каменя выраблялі свідраваныя сякеры, пліты для шліфавання, з крэменю – сякеры, наканечнікі стрэл, дроцікаў, дзідаў, скрабкі, нажы. Металічныя вырабы рэдкія. Яны прадстаўлены сякерамі, наканечнікамі дзідаў, шыламі, нажамі. Большасць вырабаў паходзіць з Паўночнага Каўказа. Частка прыладаў выраблена з прыкарпацкай медзі.

*Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* У пахаваннях былі знойдзены бурштыновыя падвескі – прыбалтыйскі імпарт; фаянсавая і шкляныя пацеркі, якія паходзілі з Прыкарпацкага рэгіёну. Насельніцтва карысталіся нагруднымі ўпрыгожаннямі – лунніцамі (металічнымі ўпрыгожаннямі ў выглядзе паўмесяца), падвескамі з прасвідраваных іклаў жывёл.

*Гаспадарка.* Насельніцтва займалася жывёлагадоўляй і сельскай гаспадаркай. Аснову статка складала дробная і буйная рагатая жывёла, свінні, коні. Аб існаванні земляробства сведчаць знаходкі зерняцёрак, адбіткі пшаніцы на посудзе. Рыбалоўства, збіральніцтва, паляванне мелі другаснае значэнне. Насельніцтва палявала на птушак, бабра, балотную чарапаху, дзікоў. Знойдзены косткі шчупакоў. Носьбіты сярэднедняпроўскай культуры займаліся і металаапрацоўкай.

*Праблема паходжання* дакладна не вырашана. Розныя даследчыкі меркавалі, што культура ўзнікла на аснове: ямнай культуры і трыпольскай культуры; ямнай культуры, сярэднестогаўскай культуры і варыянту

трыпольскай культуры і г.д. У сярэднедняпроўскай культуры адначаюцца рысы, характэрныя для культуры шарападобных амфар, некаторых культур шнуравога кола. Месца складвання культуры таксама дакаладна не вызначана.

*Гістарычныя лёсы.* Культура знікла са з’яўленнем адной са стэпавых культур (культуры шматвалікавай керамікі) і распаўсюджаннем традыцый тшцінецкага культурнага кола.

Лакальныя групы кола культуры шнуравой керамікі існавалі на тэрыторыі Заходняга Паляесся і Панямоння. Поўнач Беларусі была заселена ў познім неаліце – раннім бронзавым веку носьбітамі **паўночнабеларускай культуры**, якая спалучала мясцовыя неалітычныя рысы і “шнуравыя” прыкметы.

*Арэал* – амаль усё Беларускае Паазер'е да Нарачанскіх азёр на захадзе, поўдзень Пскоўшчыны і паўночны захад Смаленшчыны. Асобныя помнікі сустракаліся ў вярхоўях дняпроўскай Бярэзіны і Друці.

*Час існавання* – сярэдзіна III – сярэдзіна II тыс. да н.э.

*Паселішчы* былі неўмацаванымі, яны размяшчаліся на невысокіх пясчаных узбярэжжах азёр пры вусцях або вытоках невялікіх рэк. Вядомы таксама стаянкі на астравах і пясчаных узвышэннях паплавоў. Жыхары будавалі наземныя жытлы выцягнутай формы з двухсхільным дахам. Ад іх захаваліся ніжнія завостраныя часткі жэрдак, абкораных і з карой, якія былі пераважна нахільна ўвагнаныя ў мацярык або торф. У цэнтры жытла па падоўжнай восі размяшчаліся вертыкальныя завостраныя слупы з развілкамі-расохамі наверсе. На расохі мацавалася гарызантальная кладзь, якая і трымала каркас даху. У інтэр'ер жытла ўваходзілі і нейкія элементы з расшчэпленых хваёвых дошак. Часам дошкі былі акуратна абчасаны з двух бакоў. У жытлах знаходзіліся адкрытыя агнішчы, аснову якіх складалі пласты пяску на вымастках з яловай кары.

*Пахаванні* невядомыя.

*Кераміка*. Посуд ляпілі з гліны, у якую дабаўлялі тоўчаныя ракавіны, паверхня керамікі штрыхавалася. Найбольш распаўсюджанымі былі вялікія гаршкі са зведзеным верхам і вострым дном. Пачаў выкарыстоўвацца і пласкадонны посуд. Насельніцтва выраляла гаршкі, міскі, кубкі, у тым ліку мініяцюрныя. Пасудзіны па ўсёй паверхні аздабляліся насечкамі, адбіткамі тонкага грэбеня, ямкавымі і накольчатымі элементамі, адбіткамі тарца лапаткі - лінейным штампам. Быў вядомы і шнуравы арнамент. Вызначана, што гліняны посуд быў розным па

прызначэнні – сталовым, кухонным, а таксама выкарыстоўваўся як начынне для захавання прадуктаў. На кухонных гаршках захаваўся нагар.

*Прылады працы і зброя***.** Беларуская поўнач бедная на крамянёвыя запасы, таму гэта сыравіна трапляла да мясцовых людзей пераважна з суседніх тэрыторый – з вярхоўяў Віліі, Нёмана, Пасожжа і вярхоўяў Волгі. Крэмень берaглі і выкарыстоўвалі эканомна. З крэменю выраблялі наканечнікі стрэл, скрабкі, праколкі, сякеры і г.д. Мясцовае насельніцтва карысталася каменнымі вырабамі – сякерамі, долатамі і цёсламі. З каменю былі выраблены таксама розныя паліравальныя пліты, некаторыя грузілы для рыбалоўных прыстасаванняў. Недахоп крамянёвай сыравіны паспяхова кампенсаваўся рогам і косцю. З гэтых матэрыялаў вырабляліся самыя разнастайныя рэчы - паляўнічая зброя (наканечнікі стрэл, кінжалы), рыбацкія прыстасаванні (кручкі і гарпуны), інструменты штодзённага ўжытку (сякеры, цёслы, долаты, шылы і іголкі, скрабкі для апрацоўкі скуры, рэтушоры для працы па крэменю, інструменты для апрацоўкі паверхні гліняных гаршкоў, лыжкі і г.д.). Шырока выкарыстоўвалася і дрэва, з якога рабілі міскі, калатушкі для расколвання арэхаў, муфты для насаджвання сякер, розныя побытавыя рэчы, а таксама чоўны і дошкі. На апошніх этапах існавання культуры з'явіліся і вырабы з медзі і бронзы – шылы, сякеры.

*Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Яны вырабляліся з косткі, рогу, зубоў жывёл і людзей, бурштыну. Выкарыстоўваліся разнастайныя падвескі, пранізкі, гузікі. Знойдзены таксама *прадметы мастацтва:* статуэткі людзей, звяроў, птушак, змей, музычныя інструменты (флейта).

*Гаспадарка.* Асноўнае значэнне належала прысвойваючым відам гаспадаркі – паляванню, рыбалоўству і збіральніцтву. Заняткі паляваннем і рыбалоўствам вызначаюцца па шматлікім знаходкам паляўнічай зброі і рыбацкіх прыстасаванняў, косткі жывёл, косткі і луска рыб. Пра збіральніцтва сведчыць знойдзеная на помніках шкарлупа арэхаў, шалупінне жалудоў, ракавіны. Насельніцтва было знаёмае і з вытворчай гаспадаркай. На існаванне жывёлагадоўлі і земляробства паказваюць косткі свойскіх жывёл, крамняёвыя серпавідныя нажы, каменныя матыкі.

*Праблема паходжання.* Культура сфарміравалася на мясцовай неалітычнай аснове ў выніку з'яўлення ў рэгіёне мігрантаў – носьбітаў верхнедняпроўскай культуры. Значнае ўздзеянне на развіццё культуры аказала сярэднедняпроўская культура, прыморская культура (адна з культур шнуравой керамікі на тэрыторыі Прыбалтыкі).

*Гістарычныя лёсы* дакладана не высветлены.

## 5. Тшцінецкае культурнае кола

Тшцінецкае культурнае кола – гэта агульнасць помнікаў, якая існавала ў эпоху бронзы на тэрыторыі Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы. У склад гэтага культурнага кола ўваходзяць некалькі археалагічных культур, у арэал некаторых з іх уваходзіла і сучасная тэрыторыя Беларусі.

Назва паходзіць ад паселішча каля в. Тшцінец на тэрыторыі Польшчы.

*Арэал* культуры – Польшча, Україна, на Беларусі помнікі вядомы на Палессі, Падняпроўі, Панямонні.

*Час існавання* – каля 1900 гг. да н.э. – канец II тыс. да н.э., на тэрыторыі Беларусі – каля 1700 гг. да н.э. – канец II тыс. да н.э

*Паселішчы* размяшчаліся на ўскраінах тэрас і на ўзвышшах у поймах рэк. Вядомы доўгатэрміновыя паселішчы, а таксама часовыя стаянкі (выкарыстоўваліся на працягу сезону, кароткатэрміновага знаходжання і г.д.). Жытлы мелі прамавугольную форму, яны былі наземнымі альбо заглыбленымі ў зямлю. Складаліся з аднаго ці двух памяшканняў, унтуры знаходзіліся гліняныя печы і адкрытыя агнішчы. Падлогі часта абмазываліся глінай. Побач жытлаў знаходзіліся гаспадарчыя ямы. На паселішчах выяўляюць рэшткі ям для смецця, загонаў для хатніх жывёл і інш.

*Пахаванні.* Вядомы і курганныя, і грунтовыя пахаванні. Памерлых хавалі па абраду трупаспалення і трупапалажэння. Зрэдку практыкавалася абпальванне і расчляненне цела нябожчыка. Як правіла, пахавальны інвентар быў параўнальна бедны – адзінкавыя пасудзіны, крамянёвыя наканечнікі стрэл, каменныя вырабы і г.д. Сустракаюцца і пахаванні з "багатым" інвентаром, які ўключаў таксама і металічныя вырабы, і ўпрыгожанні.

*Кераміка.* Найбольш характэрны від посуду – гаршкі з выпуклым тулавам і вузкім дном. Знойдзены таксама міскі, посуд накшталт друшлякоў. Арнаментацыя на кераміцы складалася з пракрэсленых ліній, насечак, рысачак, ружанцовых, зубчатых адбіткаў, наколаў, ямак, "вусеняў", лінейнага штампа, шнуравых арнаментаў, адбіткаў трубчатай сцяблінай, кропкавых наколаў, валікападобных патаўшчэнняў.

*Прылады працы і зброя.* Найбольш характэрныя – крамянёвыя чаранковыя наканечнікі стрэл з двухбаковай апрацоўкай і крамянёвыя сярпы, апрацаваныя з двух бакоў. Вядомы крамянёвыя нажы, шліфаваныя сякеры, наканечнікі дроцікаў. Даследчыкі мяркуюць, што некаторыя крамянёвыя прылады ці высакаякасная сыравіна для іх вырабу

імпартаваліся на тэрыторыю Беларусі з Валыні. З каменя выраблялі зерняцёркі, сякеры, булавы і інш. Выкарыстоўваліся металічныя вырабы: зброя (бронзавыя сякеры, кінжалы, наканечнікі дроцікаў, стрэл), прылады працы (сярпы, далоты, шылы і інш.).

*Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Насельніцтва выкарыстоўвала шпількі, бранзалеты, накладкі, нашыйнікі, пярсцёнкі, дыядэмы, падвескі, бляшкі, завушнішы і г.д. Упрыгожанні выраблялі з бронзы, зрэдку сустракаюцца і залатыя вырабы. На тэрыторыі Беларусі такія знаходкі не адзначаюцца.

*Гаспадарка.* Асноўнымі заняткамі тшцінецкага насельніцтва былі земляробства (вырошчвалі пшаніцу, ячмень, авёс, проса) і жывёлагадоўля (паўвандроўная, адгонная). Было вядомае ткацтва, аб чым сведчаць знаходкі прасліц. Яны мелі своеаблівыя абрысы – са шматлікімі выступамі, у сувязі чым іх называюць “рагатымі”. Тшцінецкае насельніцтва было знаёмае з каляровай металургіяй, на што ўказваюць нешматлікія знаходкі ліцейных формаў, адыходаў вытворчасці. Значнае месца ў гаспадарцы належала абмену. Большасць бронзавых вырабаў, сыравіна імпатраваліся з карпата-трансільванскіх і сумежных металургічных цэнтраў.

*Праблема паходжання* канчаткова не вырашана. На думку некаторых даследчыкаў, тшцінецкія культурныя асаблівасці першапачаткова склаліся на тэрыторыі Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы на аснове позніх культур шнуравой керамікі і некаторых іншых. Паступовa тшцінецкія традыцыі распаўсюджваліся ва ўсходнім накірунку і ўспрымаліся мясцовым насельніцтвам, якое мела неалітычны ўклад жыцця.

*Гістарычныя лёсы.* Дакладна не вызначаны. У сувязі з тым, што тшцінецкае культурнае кола займала значныя абшары, тшцінецкія культурныя традыцыі ў розных рэгіёнах сталі адным са складнікаў шматлікіх розных культур позняга бронзавага – ранняга жалезнага веку.

## 6. Позні перыяд бронзавага веку

Позні перыяд бронзавага веку – адзін з самых загадкавых і маладаследаваных этапаў першабытнай гісторыі Беларусі. Распаўсюджанне бронзавых вырабаў вяло да паступовага заняпаду крэмнеапрацоўкі. Па-ранейшаму значнае месца ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва належала вырабу каменных свідраваных сякераў, якімі карысталіся нават у эпоху жалеза. Змяняліся традыцыі керамічнай

вытворчасці, у т.л. арнаментацыі. Набыў распаўсюджанне неарнаментаваны альбо вельмі сціпла арнаментаваны посуд. Верагоднай прычынай гэтага былі пэўныя змены ў рэлігійных уяўленнях старажытнага насельніцтва.

Лічыцца, што ў канцы бронзавага веку скончылася складванне культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры, якія ў наступную эпоху занялі значную частку тэрыторыі Беларусі.

Вялікі ўплыў на плямены Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў канцы эпохі бронзы і ў пачатку жалезнага веку аказала **лужыцкая культура.**

Назва паходзіць ад паселішчаў на тэрыторыі гістарычных абласцей Верхняя і Ніжняя Лужыца (Германія).

*Арэал.* Культура склалася ў міжрэччы Эльбы і Віслы, яе носьбіты засялялі тэрыторыю Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – ад Эльбы да Пабужжа і ад Дуная да Балтыйскага мора. Матэрыялы лужыцкай культуры выяўлены і на тэрыторыі Беларусі – у Заходнім Палессі і Панямонні.

*Час існавання* – каля 1200 г. – 400 гг. да н.э.

*Паселішчы.* Найбольшая колькасць помнікаў даследавана на тэрыторыі Германіі і Польшчы. На раннім этапе ўзводзіліся пераважна неўмацаваныя паселішчы. У самым канцы эпохі бронзы, а галоўным чынам у пачатку жалезнага веку, у лужыцкіх пляменаў з’явіліся гарадзішчы, якія размяшчаліся на мысах ці на пагорках-астанцах. Жытлы былі наземнымі слупавай канструкцыі.

Найбольш поўна вывучана Біскупінскае гарадзішча (Польшча). Яно размяшчалася на востраве, умацаваным па краях некалькімі радамі нахілена забітых у дно возера бярвенцаў. Сама пляцоўка гарадзішча была ўмацаваная моцнай драўлянай сцяной. З вонкавага боку да сцяны прымыкала драўляная маставая, якая ішла па перыметру.

*Пахаванні.* Могільнікі лужыцкай культуры, у асноўным, бескурганныя. Звычайна пахаванні рабіліся ў грунтавых ямах, сустракаюцца таксама пахаванні ў каменных скрынях ці ў вялікіх драўляных зрубах. Дамінаваў абрад трупаспалення, пры гэтым спаленыя косткі ссыпалі ў спецыяльныя гліняныя пасудзіны-урны.

*Кераміка.* Характэрны тып посуду – вазы, амфары, розныя кубкі, збаны, міскі, цюльпанападобныя і яйкападобныя гаршкі. Шмат пасудзін арнаментавана шышкападобнымі выступамі і баразенкамі. На позніх этапах распаўсюдзіліся такія спосабы ўпрыгожання, як каляровая размалёўка, інкрустацыя і г.д.

*Прылады працы і зброя.* Імпартавалі і выраблялі бронзавыя, а на позніх этапах існавання культуры і жалезныя вырабы: сякеры, сярпы, шылы, наканечнікі дзід і стрэл і г.д.

*Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Сустракаюцца шпількі, бранзалеты, накладкі, нашыйнікі, пярсцёнкі, дыядэмы, падвескі, бляшкі, завушнішы і інш., выраблення з каляровых металаў. Адметнасцю культуры з’яўляюцца скарбы залатых вырабаў.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадарчага жыцця складалі земляроства і жывелагадоўля. На гарадзішчы ў Біскупіне былі знойдзены рэшткі двух драўляных рал. Вырошчвалі проса, пшаніцу, ячмень, жыта, гарох, лён, бабы. Сярод хатніх жывел галоўнае месца займала буйная рагатая жывела, авечкі, свінні, коні і сабакі. Высокага развіцця дасягнулі ганчарства, ткацтва, апрацоўка косці і рога, каменю і крэменю. Важную ролю ў гаспадарцы адыгрывала каляровая металургія, якая грунтавалася на прывазной сыравіне. У самым канцы эпохі бронзы пачалі з’яўляцца і вырабы з жалеза, якія імпартаваліся з усходнеальпійскіх абласцей. Пазней, ужо на апошніх этапах існавання культуры, атрымала развіццё і мясцовая чорная металургія. .

*Праблема паходжання.* Культура склалася на аснове перадлужыцкай і тшцінецкай культр, з удзелам культурных традыцый насельніцтва басейна р. Дунай.

*Гістарычныя лёсы.* Дакладна не вызначаны. Згодна з распаўсюджаным меркаваннем, носібіты лужыцкай культуры прадстаўлялі сабой галіну індаеўрапейскіх плямён, якія адыгралі важую ролю ў гісторыі Еўропы і прынялі ўдзел у фарміраванні гістарычных славян, кельтаў, ілірыйцаў і інш. народаў.

## 7. Гаспадарчая дзейнасць чалавека на тэрыторыі Беларусі ў бронзавым веку

На тэрыторыі Беларусі адсутнічаюць радовішчы руды, неабходныя для атрымання медзі і бронзы, што прымушала насельніцтва імпартаваць сыравіну і металічныя вырабы з іншых рэгіёнаў. Вырабы з металу былі вельмі дарагімі і рэдкімі, яны падкрэслівалі высокі сацыяльны статус чалавека і родавай групы, да якой ён належаў.

Найбольш старажытныя металічныя вырабы (мяжа III–II тыс. да н.э.) знойдзены ў пахаваннях сярэднедняпроўскай культуры на Верхнім Падняпроўі. У склад пахавальнага інвентару ўваходзілі прылады працы

(нажы, шылы), зброя (наканечнікі дзідаў, сякеры), упрыгожанні (дыядэмы – т.зв. лунулы, трубчастыя пранізкі, скроневыя колцы, бранзалеты і інш.).

Гэтыя рэчы рабіліся з розных відаў металу. Асноўная частка вырабаў імпартавалася – з Балкана-Карпацкага рэгіёну (вырабы з амаль чыстай медзі) і Каўказу (вырабы з медна-мыш'яковістых сплаваў). Аднак некаторыя рэчы былі выраблены з сыравіны, атрыманай у выніку пераплаўкі розных відаў металу. Такія знаходкі сведчаць аб тым, што мясцовае насельніцтва займалася ўласнай металаапрацоўкай.

Знаёмства насельніцтва тэрыторыі Беларусі з металам працягвалася ў наступныя перыяды бронзавага веку. Металічныя вырабы (сякеры, наканечнікі стрэл, цяслы), выраблены з алавяністай бронзы, былі характэрныя для тшцінецкай культуры. Але даныя аб мясцовай металаапрацоўчай дзейнасці гэтых груп насельніцтва не выяўлены. Вырабы імпартавалі з цэнтральнаеўрапейскіх ці прыбалтыйскіх цэнтраў.

У бронзавым веку стаў паўсюдным працэс авалодання вытвараючымі формамі гаспадаркі, які пачаўся яшчэ ў неаліце.

У лясной зоне магло быць перспектыўным толькі падсечна-агнявое земляробства. Яно патрабавала вялікай колькасці сякер. На помніках бронзавага веку знаходзяць шматлікія шліфаваныя крамянёвыя сякеры. Для высечкі лясоў і хмызнякоў пад палі выкарыстоўваліся і шліфаваныя каменныя сякеры-кліны, а таксама, магчыма, і каменныя свідраваныя сякеры, хаця некаторыя даследчыкі іх лічаць зброяй. Зямлю рыхлілі каменнымі матыкамі. Для збору ўраджаю выкарыстоўвалі крамянёвыя серпападобныя нажы, насельніцтва тшцінецкай культуры пачало вырабляць і крамянёвыя сярпы. Для вырабу гэтых прыладаў быў патрэбны якасны крэмень. Сыравіну здабывалі ў Сярэднім Пароссі, а таксама імпартавалі з тэрыторыі Валыні.

Значнае месца ў гаспадарцы займала і жывёлагадоўля. І на паселішчах, і ў пахаваннях былі знойдзены косткі свойскай жывёлы. Насельніцтва разводзіла кароў, свіней, коней, коз і авечак. Памочнікам чалавека ў выпасе жывёлы быў сабака.

Значнае месца ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва па-ранейшаму належала паляванню, збіральніцтву і рыбнай лоўлі. Найбольш сведчанняў аб прысвойваючай гаспадарцы зафіксавана на поўначы Беларусі – у матэрыялах паўночнабеларускай культуры.

На існаванне інтэнсіўнага палявання ўказвае наяўнасць на помніках зброі (наканечнікі стрэл і коп'яў, нажы і кінжалы) а таксама костак дзікіх жывёл. Найбольш распаўсюджанымі аб'ектамі палявання былі лось, дзік,

мядзведзь. Для здабычы пушніны вялося паляванне на куніц, барсука, лісіцу, выдру. Палявалі таксама на птушак, пераважна вадаплаўных.

Шмат сведчанняў рыбалоўства: гарпуны і кручкі, грузілы і паплаўкі да сетак, рэшткі пастак з прутоў і лучынак, пешні, выкарыстанне чоўнаў, а таксама – косткі рыбы і луска. Лавілі акуня, шчупака, ляшча, ліня і г.д.

Збіральніцтва было асноўнай крыніцай расліннай ежы. На помніках з захаваўшайся арганікай знойдзена шмат рэштказ лясных і вадзяных арэхаў, жалудоў і ракавін перлавіцы.

Далейшае эканамічнае развіццё ў эпоху бронзы прыводзіла да фарміравання пэўнай спецыялізацыі асобных раёнаў, груп людзей на вытворчасці тых ці іншых відаў прадукцыі, а гэта спрыяла росквіту абмену.

Прадметам абмену становіцца метал, крэмень (пра гэта гаворка была раней). Важным і прэстыжным прадметам імпарту з’яўляўся бурштын. Бурштынавыя ўпрыгожанні знойдзены на Падзвінні і Верхнім Падняпроўі. Вырабы траплялі на тэрыторыю Беларусі па Заходняй Дзвіне, з Прыбалтыкі, з узбярэжжа Балтыйскага мора.

На Верхнім Падняпроўі, у адным з пахаванняў сярэднедняпроўскай культуры, былі знойдзены шкляная і фаянсавая пацеркі. Гэтыя вырабы, якія таксама мелі вялікае статусавае значэнне, імпартаваліся з Прыкарпацця.

## 8. Духоўная культура насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў бронзавым веку

Духоўная культура насельніцтва, якое ў розныя перыяды бронзавага веку засяляла тэрыторыю Беларусі, характарызавалася працяглым захаваннем традыцый, узнікшых у папярэднія эпохі. Разам з тым, змены культурнай сітуацыі і перамены ў гаспадарцы садзейнічалі паступоваму распаўсюджанню новага светапогляду.

Знаходкамі выяўленчага мастацтва вылучаюцца помнікі паўночнабеларускай культуры. Частымі знаходкамі на тарфянікавых стаянках з'яўляюцца падвескі з прасвідраваных зубоў розных жывёлін. Сустракаюцца касцяныя і рагавыя фігуркі птушак і жывёл. Знойдзена статуэтка змяі, з імітацыяй узору на скуры. Статуэтка мела адтуліну, што сведчыць аб тым, што яна насілася як падвеска, магчыма, талісман. На думку даследчыкаў, гэтыя знаходкі сведчаць аб існаванні ў насельніцтва культу жывёл, а магчыма, і культу хтанічных (г.зн. падземнага свету) божышчаў. Вядомы таксама скульптурныя выявы людзей. З дрэва і рогу

былі выразаныя галовы мужчын еўрапеоіднага аблічча. Напэўна, статуэткі таксама мелі рытуальнае прызначэнне.

Носьбіты паўночнабеларускай культуры былі знаёмыя і з музыкальным мастацтвам: на помніках сустракаюцца жалейкі з костак канечнасцей буйных птушак.

Істотнымі археалагічнымі крыніцамі для вывучэння духоўнай культуры чалавека з’яўляюцца пахавальныя помнікі. У цэнтральнай і паўночнай частках Беларусі пахавальныя абрады насельніцтва бронзавага веку археалагічна не прасочваюцца. Найбольш даследаванымі з’яўляюцца пахаванні сярэднедняпроўскай культуры. Яны часта здзяйсняліся па абраду трупапакладання, аднак атрымоваў распаўсюджанне і звычай спальвання нябожчыкаў. Спаленне адбывалася за межамі могільнікаў, крэміраваныя парэшткі прыносіліся на месца пахавання. Часам памерлых пасыпалі ворай. У шматлікіх выпадках каля магіл разводзілі вогнішчы. Паводле агульнапрынятых меркаванняў, гэтыя абрады з’яўляліся складовай часткай характэрнага для старажытных індаеўрапейцаў культу агню, веры ў ачышчальную сілу полымя і г.д.

У большасці пахаванняў побач з целам памерлага ці каля яго спаленых рэштак змяшчаўся пахавальны інвентар: зброя, прылады працы, посуд, упрыгожанні. Знаходзяць таксама косткі дзікіх і свойскіх жывёл. Гэтыя адметнасці сведчаць аб існаванні ў людзей ідэй “працягу існавання” чалавека на тым свеце і неабходнасці стварэння нябожчыку камфортных умоў для “вечнага жыцця”. Пасудзіны часта ставіліся ў магілу ўверх дном. Гэты пахавальны звычай мог таксама сімвалізаваць пераход чалавека ў іншы, супрацьлеглы зямному, свет.

Былі распаўсюджаныя традыцыі ўзвядзення курганаў. Вакол насыпа рабіўся кругавы ровік, які меў пэўнае сімвалічнае значэнне – напрыклад, размежавання прасторы жывых і памерлых.

На тэрыторыі Беларусі вядомы і пахаванні тшцінецкай культуры. Гэта былі грунтовыя пахаванні па абраду крэмацыі. У магілы змяшчаўся нешматлікі пахавальны інвентар: посуд, прылады працы. Тшцінецкае насельніцтва іншых рэгіёнаў практыкавала больш разнастайныя пахавальныя і рытуальныя абрады. На помніках на тэрыторыі Украіны былі знойдзены рэшткі культавых пабудоў круглай форму. Унутры некаторых пабудоў знаходзіліся вогнішчы, ахвярнікі і пахаванні па абраду крэмацыі. Вядома таксама збудаванне, у цэнтры якога размяшчалася канаўка, запоўненая абломкамі зерняцёрак, косткамі жывёл, крамянёвых вырабаў, у т.л. сярпа, фрагментамі посуду з адбіткамі зярнятак. Паводле

распаўсюджаных меркаванняў, гэтыя пабудовы адлюстроўваюць існаванне ў тшцінецкага насельніцтва культу памерлых, а таксама земляробчых культаў. На помніках гэтай культуры, у т.л. на тэрыторыі Беларусі, сустракаюцца “рагатыя” праселкі. Не выключаецца, што гэтыя знаходкі таксама з’яўляліся культавымі прадметамі.

У перыяд познй бронзы і пачатку жалезнага веку паўднёва-заходнія раёны Беларусі аказаліся ў сферы ўплыву лужыцкай культуры, для насельніцтва якой была характэрная параўнальна развітая рэлігія, значнага ўзроўню дасягнулі розныя сферы першабытнага мастацтва, у т.л. музыка.

## 9. Праблема з‘яўлення і распаўсюджання першых індаеўрапейцаў на тэрыторыі Еўропы

Індаеўрапейцы – гэта народы, якія размаўляюць на індаеўрапейскіх мовах. Сам тэрмін “індаеўрапейскія мовы” ўзнік у пачатку XIX ст. для акрэслення роднасных паміж сабой еўрапейскіх і некаторых іншых моў. У тым жа стагоддзі лінгвісты прыйшлі да высновы, што падабенства паміж мовамі тлумачыцца наяўнасцю агульнага продка – т.зв. “праіндаеўрапейскай мовы”. Гэта старажытная мова была рэканструявана на падставе вывучэння агульных элементаў сучасных моў. Даследчыкі вызначылі спіс дрэў і раслін, якія былі вядомыя непадзеленай праіндаеўрапейскай супольнасці, і на падставе гэтага пачалі шукаць яе “калыску”. Аднак хутка высветлілася, што адных лінгвістычных даных для вырашэння гэтай праблемы недастаткова, і на рубяжы XIX–XX ст. пачалося супрацоўніцтва мовазнаўства і археалогіі.

За два стагоддзі даследаванняў было агучана шмат меркаванняў адносна лакалізацыі індаеўрапейскай прарадзімы. Найбольшай папулярнасцю карысталіся 5 гіпотэз:

1) Прарадзіма індаеўрапейцаў змяшчаецца ў *Індыі.* Індская цывілізацыя лічыцца індаарыйскай. У якасці доказа выступае сцверджанне, што найбольш старажытнай мовай з’яўляецца санскрыт.

Гіпотэза ўзнікла ў пачатку XIX ст., з цягам часу страціла сваю ўплывовасць. Сёння яе падтрымліваюць нешматлікія індыйскія ўльтрапатрыёты.

2) Прарадзіма індаеўрапейцаў змяшчаецца на *поўначы Еўропы.* Аўтары гэтай гіпотэзы зыходзілі з наступных меркаванняў: прарадзіму трэба шукаць там, дзе жыве большасць індаеўрапейскіх народаў; даныя лінгвістыкі, палеабатанікі, палеазаалогіі, гістарычнай геаграфіі сведчаць аб

тым, што экалагічнай нішай праіндаеўрапейцаў з’яўлялася менавіта Еўропа.

У падтрымку паўночнаеўрапейскай гіпотэзы выступалі параўнальна шматлікія даследчыкі, пры гэтым розныя спецыялісты прапаноўвалі лакалізаваць прарадзіму індаеўрапейцаў у розных рэгіёнах. У сваіх разважаннях яны часам абапіраліся не толькі на навуковыя дасягненні, але і на пэўныя палітычныя запатрабаванні.

У канцы XIX – пачатку XX ст. немецкія лінгвісты і археолагі шукалі індаеўрапейскую прарадзіму на тэрыторыі Скандынавіі і/ці Германіі. Яны зыходзілі з неперарыўнасці антрапалагічнага тыпу ў гэтым рэгіёне пачынаючы з каменнага веку. Індаеўрапейцы атаясамліваліся з блакітнавокімі і светлавалосымі арыямі. Першыя індаеўрапейцы (іх прыхільнікі гэтай тэорыі часцей называлі “індагерманцамі” і лічылі больш развітымі ў параўнанні з іншымі народамі) звязваліся з культурай шнуравой керамікі. Сцвярджалася, што носьбіты гэтай культуры ў выніку некалькіх хваляў міграцый ва ўсходнім кірунку рассяліліся на тэрыторыі Еўропы, распаўсюджваючы дасягненні культуры. З гэтых разважанняў германскія нацыяналісты выводзілі вучэнне аб расавай чысціні немцаў і іх перавазе над іншымі людзьмі.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны і знішчэння нацыянал-сацыялістычнага рэжыму ў Германіі крайнія праявы згадаганай гіпотэзы былі асуджаныя і выйшлі з ужытку.

3) Прарадзіма індаеўрапейцаў змяшчаецца на *поўдні Еўропы* – у басейне р. Дунай, Балкана-Карпатскім рэгіёне. Прыхільнікі гіпотэзы (лінгвісты, археолагі, гісторыкі) прыводзілі наступныя аргументы: Дунай знаходзіцца бліжэй да цэнтра той тэрыторыі, якую займаюць індаеўрапейскія народы; у гэтым рэгіёне адзначаюцца найбольш старажытныя для тэрыторыі Еўропы развітыя неалітычныя культуры (лінейна-стужкавай керамікі і маляванай керамікі); Падунаўе з’яўлялася першым еўрапейскім цэнтрам земляробства. Такім чынам, у межах гэтай гіпотэзы мінімізаваліся міграцыі старажытных індаеўрапейцаў.

Крытыкі звярталі ўвагу на слабыя бакі гіпотэзы: культуры, якія вылучаюцца ў басейне Дуная, не маюць прыкмет, характэрных для індаеўрапейскіх культур (адсутнічаюць умацаванні і сведчанні сутыкненняў і канфліктаў, насельніцтва вяло аседлае жыццё). Таму частка даследчыкаў лічыць носьбітаў дунайскіх культур даіндаеўрапецамі.

4) Прарадзіма індаеўрапейцаў змяшчаецца *ва ўсходнееўрапейскіх стэпах*. Гіпотэзу высунулі ў першай палове XX ст. некаторыя філолагі,

якія займаліся рэканструкцыямі праеўрапейскай мовы. На падставе асаблівасцяў лексікі яны сцвярджалі, што першыя індаеўрапейцы павінны былі засяляць раўнінныя ландшафты, а істотнымі складнікамі іх дзейнасці з'яўляліся конегадоўля і ваенныя сутыкненні з выкарыстаннем калясніц. Зараджэнне конегадоўлі натуральна было звязаць са стэпавай паласой Еўразіі. На карысць гіпотэзы выступалі і даныя міфалогіі і гісторыі аб значнай ролі калясніц у распаўсюджанні індаеўрапейцаў.

Згаданую гіпотэзу падтрымалі шматлікія археолагі з розных краін (у т.л. Германіі, Велікабрытаніі, Польшы, СССР і пазней Расіі, США і інш.). Аднак разважанні ў розных аўтараў былі адменнымі. Некаторыя даследчыкі выяўлялі археалагічныя сведчанні даместыкацыі каня і фарміравання каляснічнай справы ў стэпавых культурах бронзавага веку (перадусім ямнай культуры) і рабілі спробы рэканструяваць экспансію стэпавых качэўнікаў у іншыя рэгіёны Еўропы і Азію. Такі падыход супрацьстаяў нацыяналістычным ідэям канцэпцыі паўночнаеўрапейскай прарадзімы індаеўрапейцаў.

Іншыя матывы выступалі ў гіпотэзы т.зв. "курганай культуры". Гэтым тэрмінам некаторыя даследчыкі акрэслівалі шматлікія археалагічныя культуры стэпавай паласы Усходняй Еўропы, носьбіты якіх здзяйснялі экспансію на захад. У межах канцэпцыі прымалася, што даіндаеўрапейская Еўропа была заселеная земляробчым насельніцтвам, якое пакланялася сваім багіням. Гэта мірная матрыярхальная цывілізацыя была знішчаная агрэсіўнымі стэпавымі качэўнікамі-індаеўрапейцамі.

На сучасным этапе развіцця навукі даследчыкамі прызнаецца штучнасць вылучэння "курганай культуры", аднак сама канцэпцыя стэпавай прарадзімы індаеўрапейцаў застаецца адной з найбольш папулярных.

5) Прарадзіма індаеўрапейцаў змяшчаецца ў *Малой Азіі.* Самая маладая з усіх гіпотэз. Філолагі, пачынаючы з канца XIX ст., выяўлялі сувязь праіндаеўрапейскай мовы з каўказскімі і семіцкімі мовамі. Археолагі неаднаразова адзначалі, што вытворчыя формы гаспадаркі і метал распаўсюдзіліся на тэрыторыі Еўропы з краін Блізкага Усходу. Некаторыя генетыкі прыйшлі да высновы, што насельніцтва Еўропы не з'яўляецца цалкам аўтахтонным, яго значная частка – мігранты з блізкаўсходніх тэрыторый. У канцы XX ст. дасягненні розных навук былі абагульнены. Згодна з новай гіпотэзай, індаеўрапеізацыя Еўропы адбывалася паралельна з яе неалітызацыяй, і зыходным ачагом новых з'яў

была менавіта Малая Азія. Гэта ідэя не знайшла істотнай падтрымкі ў спецыялістаў.

Такім чынам, праблема вызначэння прарадзімы індаеўрапейцаў, часу, кірунку і шляхоў іх распаўсюджання на тэрыторыі Еўропы дагэтуль канчаткова не вырашана.

# ТЭМА 3. ЖАЛЕЗНЫ ВЕК

## План

1. Агульная характарыстыка эпохі. Паняцце "чорная металургія". Значэнне чорнай металургіі і металаапрацоўкі ў развіцці грамадства і гаспадаркі.
2. Жалезны век Цэнтральнай Еўропы.
3. Жалезны век стэпу і лесастэпу.
4. Жалезны век лясной паласы Усходняй Еўропы.
5. Археалагічныя культуры жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.
6. Гаспадарчыя заняткі насельніцтва Беларусі ў жалезным веку.
7. Духоўная культура насельніцтва Беларусі ў жалезным веку.

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 4.*

## 1. Агульная характарыстыка эпохі. Паняцце "чорная металургія". Значэнне чорнай металургіі і металаапрацоўкі ў развіцці грамадства і гаспадаркі.

Жалезны век – археалагічная эпоха, якая характарызуецца з'яўленнем і шырокім распаўсюджаннем металургіі жалеза і вырабаў з яго прылад працы і зброі.

Найбольш раннія жалезныя вырабы выраблялiся з метэарытнага жалеза. Гэты метал, які час ад часу падае з неба, змяшчае вялікую колькасць нікеля (каля 8–10%) і таму падлягае апрацоўцы толькі ў халодным выглядзе. Старажытнае насельніцтва абыходзілася з метэарытным жалезам як са звыклым матэрыялам – каменем. Найбольш раннія знаходкі з метэарытнага жалеза адзначаюцца ў Іране (VI–IV тыс. да н. э), Іраке (V тыс. да н.э.), Егіпце (IV тыс. да н.э).

Аднак метэарытнае жалеза з-за сваіх уласцівасцяў было мала прыдатнае для шырокай вытворчасці ўпрыгожанняў і прыладаў працы. Акрамя таго, натуральнае "чыстае" жалеза сустракаецца даволі рэдка, і

таму метэарытны метал не мог задаволіць патрэбнасці насельніцтва. У прыродзе жалеза часцей за ўсё ўваходзіць у склад разнастайных рудных мінералаў (ліманіт, гематыт, сідэрыт і інш.). Менавіта такі метал – атрыманы з руды – і пачалі выкарыстоўваць у старажытнасці.

Найменш працаёмкай справай была здабыча руды, якая залягала блізка да паверхні. У месцах, багатых на жалеза, такую руду атрымоўвалі шляхам паверхневых збораў альбо шляхам капання неглыбокіх ям. Старажытныя жалезныя руднікі вядомыя на тэрыторыі сучаснай Англіі, Францыі, Украіны і інш. Аднак гэтыя, параўнальна нешматлікія, радовішчы былі даволі хутка распрацаваныя.

Затое паўсюдна распаўсюджанымі з’яўляліся т.зв “балотныя”, “лугавыя”, “азёрныя” руды. Падчас забалочвання старажытных вадаёмаў адбываліся складаныя хімічныя рэакцыі, і жалеза ў складзе розных мінералаў асядала на дне азёр, рэк і балот, на лугах і на іншых адкрытых месцах. Менавіта такія руды былі асноўнай крыніцай для атрымання жалеза ў старажытнасці.

Найбольш раннія знаходкі, выробленыя з жалеза, атрыманага з руды, паходзяць з помнікаў Месапатаміі, Анатоліі, Егіпта і датуюцца другой паловай III тыс. да н.э. Ва ўсходняй Еўропе першыя жалезныя рэчы вядомыя з другой паловы II тыс. да н.э., аднак металургія жалеза шырока распаўсюджвалася не раней рубяжу VIII – VII стст. да н.э.

Такім чынам, хоць жалеза і сустракаецца ў прыродзе значна часцей, чым медзь і волава, яго выкарыстанне пачалося пазней. Тлумачыцца гэта наступным. Сутнасць каляровай металургіі заключаецца ў атрыманні металаў у вадкім выглядзе. Аднак калі медзь плавіцца пры тэмпературы 1084°С, то жалеза – пры тэмпературы 1528°С. Тагачасны ўзровень тэхнічных ведаў чалавека не дазваляў дасягнуць такую высокую тэмпературу.

Чорная металургія стала магчымай толькі дзякуючы вынаходніцтву т.зв. сырадутнага спосабу атрымання жалеза. Старажытныя металургі падавалі ў печы атмасфернае (“сырое”) паветра, што і абумовіла назву. Чыстае жалеза канцэнтравалася ў цвёрдым стане (т.зв. “крыца”).

Сутнасць сырадутнага працэсу заключалася ў наступным. У печ загружалі слаі здробненай руды і вугалю (у старажытнасці выкарыстоўваўся толькі драўняны вугаль). Для таго, каб атрымаць патрэбную высокую тэмпературу, металургі стваралі ўмовы для інтэнсіўнага натуральнага прытоку паветра альбо выкарыстоўвалі спецыяльныя прылады, якія забяспечвалі прымусовую падачу паветра.

Пасля таго як тэмпература ў печы дасягла 1200–1300˚С, розныя мінеральныя дамешкі, якія ўваходзілі ў склад руды, плавіліся і ўтваралі шлак. Адначасова ішло ўтварэнне кропель жалеза, якія паступова апускаліся на дно печы і спякаліся ў цягучую цестападобную масу. Яна, астываючы, пераўтваралася ў цвёрды порысты матэрыял – крыцу, якая змяшчала, акрамя жалеза, яшчэ і дамешкі шлака і вугля.

Жалезную крыцу, вага якой у старажытныя часы не перавышала 1–2 кг, выцягвалі з печы, награвалі і пракоўвалі малаткамі. У выніку гэтага выдалялася частка непажаданых дамешак, а кавалак металу набываў патрэбную форму (бруска, прута і г.д.). Менавіта такія падрыхтаваныя, таварныя крыцы паступалі да кавалёў .

Найбольш просты і, адпаведна, самы старажытны спосаб забяспячэння сырадутнага працэсу – выкарыстанне печаў у выглядзе простых ям (т.зв. “воўчыя ямы”). У яму, абмазаную глінай, ставілі гаршчкі з рудой і вуглём і разводзілі вялікае вогнішча. Такую яму абавязкова выкопвалі ў месцах інтэнсіўнага натуральнага руху паветра – на пагорках, просеках і г.д. Паступова людзі сталі заўважаць, што найбольш эфектыўным спосабам падачы паветра з’яўляецца ўзвядзенне над ямай своеасаблівага надбудавання. Так на змену архаічным прыстасаванням прыйшоў сырадутны горан.

Археолагам вядомыя сырадутныя горaны самых розных канструкцый. Асновай старажытных горнаў былі ямы, абмазаныя глінай. Да іх падводзіліся каналы для падачы паветра (бакавыя гліняныя трубкі – саплы), у якія ўстаўляліся спецыяльныя прыстасаванні для нагнятання паветра – скураныя мяхі. Над ямамі ўзводзілі канічныя збудаванні са сплеценых прутоў, іх пакрывалі вогнестойкай глінай, дадаткова абкладвалі камянямі. У ніжняй частцы печы пакідалі канал для выхаду шлака. Вышыня горанаў, як правіла, не перавышала 1–1,5 м.

Пасля папярэдняй апрацоўкі крычнае жалеза паступала ў кузню. Прылады, якія выкарыстоўваліся ў першабытных кузнях, амаль не адрозніваліся ад прыстасаванняў, вядомых па этнаграфічных даных. Старажытныя майстры карысталіся кавальскімі горанамі, кувалдамі, малаткамі, разнастайнымі напільнікамі, клешчамі, прабойнікамі і інш.

Крычнае жалеза было параўнальна мягкім, таму ўжо ў старажытнасці былі вынайдзены спосабы паляпшэння спажывецкіх уласцівасцяў металу. Найбольш распаўсюджанымі прыёмамі з’яўляліся загартоўка і цэментацыя жалезных рэчаў.

Загартоўка заключалася ў тым, што жалезны выраб награвалі да тэмпературы 800–1000˚С і адразу пасля гэтага апускалі ў ваду альбо алей. У выніку правядзення такой аперацыі, якая магла паўтарацца некалькі разоў, лязо вырабу набывала неабходную цвёрдасць. Цэментацыя прадугледжвала утварэнне на паверхі жалезнай прылады своеасаблівай плёнкі, якая змяшчала значную колькасць вугляроду. Сутнасць аднаго з найбольш старажытных спосабаў цэментацыі заключалася ў працяглай вытрымцы жалезнага вырабу ў кантакце з драўняным вугалем пры тэмпературы каля 1000˚С. У выніку складаных хімічных рэакцый трываласць і цвёрдасць прылады істотна павялічвалася.

Найбольш старажытны сырадутны горан для атрымання жалеза быў знойдзены на паселішчы каля возера Урмія (ў Іране). Ён датуецца прыкладна 2800 г. да н.э. Лічаць, што сырадутны працэс больш ці менш быў распаўсюджаны ў хетаў у XV ст. да н.э. У Еўропе вытворчасць жалеза з’явілася не раней 1000 г. да н.э., спачатку ў Грэцыі і на Эгейскіх астравах. Шырокае распаўсюджанне чорнай металургіі і металаапрацоўкі пачалося пасля рубяжу VIII – VII стст. да н.э. На тэрыторыі Беларусі жалезны век пачаўся ў канцы VII–VI ст. да н.э. і працягваўся да V ст. н.э.

Жалеза выкарыстоўвалася ў вытворчасці разнастайных вырабаў. Даследчыкі мяркуюць, што першапачаткова з жалеза выраблялі рэчы рытуальнага ці параднага прызначэнння. Напрыклад, у грабніцы фараона Тутанхамона былі знойдзены ўпрыгожанні, інкруставаныя жалезнымі ўстаўкамі. Пастурова жалеза пачалі выкарыстоўваць і для вырыбу прыладаў працы і зброі. На першых этапах станаўлення кавальскай справы жалезныя рэчы часта капіравалі форму бронзавых узораў. Пачынаючы з VI ст. да н.э., жалезным прадметам надавалі абрысы, абумоўленыя ўласцівасцямі менавіта чорнага металу. Аднак на працягу ўсяго жалезнага веку каляровая металургія і металаапрацоўка па-ранейшаму заставаліся важнай галіной гаспадаркі. Медзь і бронза ішлі пераважна на выраб прэстыжных і рытуальных рэчаў (упрыгожанняў, посуду і інш.).

Распаўсюджанне жалеза выклікала тэхнічны пераварот. Жалезныя прылады працы (сякеры, сярпы, косы і інш.) былі больш эфектыўнымі, чым іх бронзавыя аналагі. З’явілася рала з жалезным наканечнікам, што істотна спрасціла апрацоўку зямлі і дазволіла павялічыць сельскагаспадарчыя плошчы. Усе рамеснікі атрымалі больш якасныя прылады. Да пачатку новай эры з’явіліся ўсе асноўныя віды сучасных інструментаў, за выключэннем вінтоў і шарнірных нажніц. У жалезным веку актыўна развіваліся шматлікія галіны рамёстваў, асабліва кавальскага

і збройнага. Палепшылся апрацоўка дрэваў для домабудаўніцтва, вытворчасці сродкаў перамяшчэння (караблёў, каляніц і г.д.). Прадукцыя сельскай гаспадаркі і рамёстваў ішла на абмен, што спрыяла развіццю кантактаў паміж рознымі групамі насельніцтва. Узмацнялася нераўнамернасць эканамічнага і сацыяльнага развіцця асобных рэгіёнаў, што вяло да ўзнікненя ўзброеных канфліктаў. Таму паўстала патрэба ў арганізацыі абароны паселішчаў. У жалезным веку распаўсюдзілася практыка будаўніцтва ўмацаваных паселішчаў – гарадзішчаў. Гэта быў новы тып пасяленняў, размешчаных на высокіх, цяжкадаступных участках рэльефу – прыродных альбо мэтанакіравана ўзведзеных. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы размяшчаліся на пляцоўцы гарадзішча. Само паселішча было ўмацаванае сістэмай абарончых збудаванняў – частаколам, валам, ірвом. З цягам часу асноўнай формай паселішчаў сталі неўмацаваныя селішчы, а гарадзішчы выкарыстоўваліся ў якасці часовых сховішчаў.

## 2. Жалезны век Цэнтральнай Еўропы

У канцы II тыс. да н.э. у Верхнім і Сярэднім Падунаўі сталі складвацца своеасаблівыя формы матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія атрымалі найбольшае распаўсюджанне і развіццё каля 750 – 700 гг. да н.э.

Гэты пераходны час ад бронзавага да жалезнага веку на тэрыторыі Заходняй і Сярэдняй Еўропы называюць гальштацкай эпохай і звязваюць з **гальштацкай культурай** (назва – па могільніку каля г. Гальштат у Аўстрыі). Культура, займаючы значныя тэрыторыі, не была цалкам уніфікаваныя, у сувязі з чым яе падзяляюць на шэраг лакальных культур. Падставай вылучэння гальштацкай культуры з’яўляецца распаўсюджанне своеасаблівага стылю, для якога характэрны геаметрычны арнамент. У такім шырокім разуменні арэал гальштацкай культуры ахопліваў вялікую тэрыторыю ад Сярэдняга Падунаўя да Пірэнэйскага паўвострава і ад Адрыатычнага мора да басейнаОдэра і Эльбы. У вузкім сэнсе гальштацкая культура займала толькі прыдунайскую і адрыятычную тэрыторыі.

Агульны час існавання культуры – VIII–V ст. да н.э.

Пераход ад бронзавага да жалезнага веку адбываўся паступова. Для ранніх этапаў існавання культуры характэрны слабаўмацаваныя паселішчы з правільнай планіроўкай. Будаваліся наземныя дамы слупавой канструкцыі і паўзямлянкі. На позніх этапах насельніцтва ўзводзіла паселішчы, добра ўмацаваныя драўлянымі і каменнымі сценамі.

Змяняўся і пахавальны абрад. Першапачаткова носьбіты гальштацкай культуры хавалі сваіх памерлых на грунтовых могільніках па абраду ўрнавай крэмацыі. Пазней распаўсюдзіліся курганыя могільнікі з трупапакладаннем. У пахаванні змяшчалі разнастайны пахавальны інвентар, які адлюстроўваў маёмасную і сацыяльную дыферэнцыю насельніцтва.

Найбольш добра вывучанымі помнікамі з'яўляюцца помнікі вытворчага характару – саляныя копі, руднікі, майстэрні і інш.

Тыповы інвентар гальштацкай культуры – зброя, перадусім мячы. Для ранніх этапаў характэрны кароткія колючыя мячы, дзяржальна якіх мела наверша ў выглядзе конуса. На позні этапах распаўсюдзіліся кароткія колючыя кінжалы, дзяржальна якіх мела наверша ў выглядзе завіткоў ці рагоў. Выкарыстоўваліся таксама дзіды, баявыя сякеры і г.д. Першапачатова былі распаўсюджаны і бронзавыя, і жалезныя вырабы. З цягам часу пры гэтым колькасць апошніх пастаянна павялічвалася. Вядомы таксама бронзавыя шлемы, панцыры  г.д.

Часта сустракаюцца ўпрыгожанні, выробленыя з каляровых металаў, шкла, бурштыну, слановай косткі: фібулы, шэйныя грыўны, бранзалеты, пацеркі і інш. Прылады працы вельмі рэдкія.

Кераміка даволі аднастайная – ляпныя акруглыя пасудзіны, паверхня якіх мела чорны бляск. Кераміка аздаблялася рознакаляровым лінейным геаметрычным арнаментам.Посуд часта выраблялі з бронзы. Характэрнымі знаходкамі з'яўляюцца бронзавыя катлы з ручкамі, вёдры (сітулы і цысты), упрыгожаныя рэльефнымі арнаментамі і выявамі, у т.л. сцэнамі бытавога і ваеннага характару.

Асновай гаспадаркі было ворыўнае земляробства. Вырошчвалі авёс, жыта, пшаніцу і г.д. Разводзілі буйную і дробную рагатую жывёлу, свіней, коней. Насельніцтва займалася каляровай металургіяй. З гальштацкай культуры звязваюць пачатак развіцця чорнай металургіі. Некаторыя групы насельніцтва актыўна займаліся здабычай і экспартам солі.

Рэлігійныя ўяўленні слаба рэканструяваныя. У носьбітаў гальштацкай культуры існаваў культ сонца, быў сфарміраваны пэўны антрапаморны пантэон.

Адрозненні ў матэрыяльнай культуры, якія праяўляліся ў розных рэгіёнах, большасць даследчыкаў тлумачыць розніцай у этнічнай прыналежнасці насельніцтва. Гэтыя адрозненні паглыбіліся ў другой палове I тыс. да н.э. У заходніх абласцях адбыўся пераход да латэнскай культуры – кельцкай культуры. Усходнегальштацкая вобласць належала да

ілірыйскіх плямёнаў. У пазнейшыя часы кельты не засялілі гэтыя землі цалкам, і лакальная культура працягвала развівацца на ранейшай гальштацкай аснове.

У другой палове I тыс. да н.э. моцнае ўздзеянне на жыццё іншых народаў Заходняй, Цэнтральнай і часткова Усходняй Еўропы аказала **латэнская культура.** Яе назва паходзіць ад назвы паселішча Ла-Тэн у Швейцарыі.

Латэнская культура склалася на рубяжы VI – V стст. да н.э. на тэрыторыі сучаснай Швейцарыі, Германіі і Францыі, адкуль распаўсюдзілася практычна па ўсей Заходняй Еўропе. Даследчыкі падзяляюць гэтую тэрыторыю на тры вобласці: 1) тэрыторыя фарміравання і росквіта латэнскай культуры, якая адпавядае зямлі гістарычных кельтаў; 2) тэрыторыя, якая стала аб'ектам кельцкай экспансіі, дзе атрымала распаўсюджанне кельцкая культура, аднак самі кельты складалі этнічную меньшасць; 3) тэрыторыя, якая межавала з латэнскай культурай і падвяргалася пэўнаму культурнаму ўплыву. Найбольш блізкія да тэрыторыі Беларусі помнікі латэнскай культуры вядомы ў Закарпацкай вобласці Украіны. Разам з помнікамі Славакіі старажытнасці Закарпацця складаюць найбольш аддаленную групу сярэдняеўрапейскага латэна.

Латэнская культура – перадусім культура шматлікіх кельцкіх плямёнаў: галаў, брытаў і інш. Яна ўзнікла на аснове мясцовых плямён гальштацкага перыяду пад моцным уплывам антычнай цывілізацыі. Індыкатарам перахода ад гальштацкай да латэнскай культуры з'яўляецца распаўсюджанне новага стылю мастацтва – т.зв. "латэнскага" стылю. Для гэтага стылю быў характэрны складаны арнамент з раслінными, зааморфнымі, антрапаморфнымі і геаметрычнымі матывамі.

Культура існавала ў V ст. да н.э. – рубеж н.э. У I ст. н.э. кельтская тэрыторыя была заваяваная Рымам. Гэта спрыяла актыўнай культурна-эканамічнай раманізацыі кельтаў, і ў выніку латэнская культура замянілася правінцыяльна-рымскай культурай.

Вядомы паселішча і пахаванні латэнскай культуры. Паселішчы ўмацаваныя. Першапачаткова ўмацаваннямі з'яўляліся земляныя валы ці драўляна-каменныя сцены. Пазней вынайшлі т.зв. "гальскую сцяну" – канструкцыю з драўляных клецяў, запоўненых зямлёй і камянямі, са знешняга боку дадаткова абкладзеных камянямі ці цэглай. У межах гэтых умацаванняў узводзіліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы, функцыянавалі свяцілішчы, адбываўся выпас жывёлы. Жытлы прадстаўлялі сабой

наземныя дамы і паўзямлянкі плецянёвай ці слупавой канструкцыі, збудаванні з падвойнымі сценамі, выкладзенымі з камянёў.

Пахавальныя помнікі прадстаўлены пераважна бескурганнымі пахаваннямі. Практыкавалася як крэмацыя, так і інгумацыя. У пахаванні змяшчалі багаты інвентар: зброю, посуд, упрыгожанні. Рэчы часта ламалі ў рытуальных мэтах. Найбольш багатых і знатных прадстаўнікоў хавалі ў калясніцах, якія і змяшчалі ў магілу.

Для латэнскай культуры характэрны кароткія мячы без скрыжавання і доўгія мячы (каля 80 см) з выгнутым скрыжаваннем і багата арнаментаванымі похвамі (рус. ножны). На позніх этапах існавання культуры атрымалі распаўсюджанне вельмі доўгія (звыш 1 м) мячы без скрыжавання Вядомы таксама кінжалы, дзіды, баявыя сякеры  і г.д. Уся зброя была выраблена з жалеза. Похвы аздабляліся дэкаратыўнымі элементамі, вырабленымі з бронзы.

Частымі знаходкамі з’яўляюцца ўпрыгожанні. Найбольш тыповае латэнскае ўпрыгожанне – грыўна (т.н. тарквес), вырабленая з бронзы, золата, срэбра. Шырока распаўсюджаныя бранзалеты, фібулы і г.д.

Кераміка была вырабленая на ганчарным коле. Посуд часта ўпрыгожвалі выявамі людзей і жывёл, складанымі арнаментамі. Сустракаліся таксама бронзавыя пасудзіны.

Асновай гаспадаркі было ворыўнае земляробства. Вырошчвалі авёс, жыта, пшаніцу і г.д. Разводзілі буйную і дробную рагатую жывёлу, свіней, коней. Насельніцтва займалася таксама чорнай і каляровай металургіяй. Кельты перанялі ў грэкаў і рымлянаў практыку чаканкі манет. Першыя манеты былі грубымі імітацыямі антычных рэчаў, з цягам часу кельты навучыліся вырабляць уласныя манеты з тыповымі кельцкімі выявамі, імёнамі правадыроў, запісанымі лацінскімі літарамі.

Рэлігійныя ўяўленні носьбітаў латэнскай культуры рэканструяваныя на падставе вывучэння пісьмовых і археалагічных крыніц. Насельніцтва ўзводзіла свяцілішчы ў выглядзе драўляных, каменных храмаў з ідаламі ў цэнтры. Вядомыя і сакральныя месцы, абнесеныя агароджай. Даследчыкі мяркуюць, што кельты практыкавалі культ мёртвай галавы, салярны культ, культ хтанічнай (падземнай) багіні і г.д.

### 3. Жалезны век стэпу і лесастэпу

У перыяд жалезнага веку рэгіён стэпаў і лесастэпаў быў заселены новымі, не вядомымі раней народамі. Адной з першых такіх супольнасцяў была **кімерыйская.** Кімерыйцы жылі на поўдні ўсходняй Еўропы, у

паўночна-прычэрнаморскім стэпу ў IX – пачатку VII ст. да н.э. Гэта быў ваяўнічы народ, вядомы грэкам з часоў Гамера. Кімерыйцы ажыццяўлялі ваенныя паходы на тэрыторыях ад Закаўказзя да заходніх раёнаў Малой Азіі. Даследчыкі мяркуюць, што кімерыйскае насельніцтва размаўляла на іранскіх мовах.

У VII ст. да н.э. кімерыйцы былі заваяваны **скіфамі.** Першы ўспамін аб іх адносіцца да VII ст. да н.э. З Паўночнага Прычэрнамор’я скіфы пранiклі ў Малую Азію, потым прайшлі праз Месапатамію, Сірыю, Палясціну і дасягнулі Егіпта. Пасля гэтых падзей асноўная частка скіфаў вярнулася ў Паўночнае Прычэрнамор’е. З гэтага моманту пачалося станаўленне скіфскай культуры.

Паходжанне скіфаў дакладна не высветлена. Паводле распаўсюджанага меркавання, скіфская культура склалася на аснове зрубнай культуры. Скіфы былі іранамоўнымі.

Скіфія распаўсюджвалася ад Ніжняга Дунаю і Карпат да Дону. На поўдні яна даходзіла да Чорнага і Азоўскага марэй, а на поўначы – да лясной паласы. Гэтую тэрыторыю насялялі этнічна неаднародныя плямены і народы, якія адрозніваліся гаспадаркай і складам жыцця. На тэрыторыі стэпаў, ад нізоўя Дуная да берагоў Дона, у Паўночным Прыазоў’і жылі скіфы-царскія, якія лічылі ўсе астатнія плямены сваімі рабамі. Паміж Днястром і Дняпром жылі скіфы-араты.

Скіфы былі качавым народам, аснову іх гаспадаркі складала качавая жывелагадоўля. Гадавалі коней, буйную і дробную рагатую жывелу. Да канца V ст. да н.э. скіфы-качэўнікі не мелі ні гарадоў, ні ўмацаваных паселішчаў, свае дамы яны перавозілі на чатырохкалёсных кібітках. У канцы V ст. да н.э. на сярэднім Дняпры пачалі з’яўляцца ўмацаваныя паселішчы. Найбольш вядомае – Каменскае гарадзішча каля г. Нікапаля, плошча якога складала 1200 га. Пасяленне мела акропаль, дзе ў каменных дамах пражывала скіфская знаць. Звычайныя жыхары жылі ў наземных дамах і паўзямлянках. Мяркуюць, што тут знаходзілася сталіца скіфаў. Каменскае гарадзішча было буйным цэнтрам скіфскай металургіі. Таксама высокага развіцця дасягнулі касцярэзная, ганчарная і шавецкая вытворчасці.

Росквіт культуры скіфаў прыпадае на IV ст. да н.э. Гэты час даследаваны пераважна па пахавальных помніках, найбольш вядомымі з якіх з’яўляюцца курганы, так званыя “царскія”. Пад курганнымі насыпамі знаходзіліся катакомбы і магільныя ямы, куды клалі нябожчыка. Побач з памерлым змяшчалі задушаных наложніцу, віначэрпія, повара, конюха,

іншых слуг, разнастайную жывелу, а таксама быгаты пахавальны інвентар – зброю, посуд, часта залаты, упрыгожанні. Прылады працы сустракаюцца вельмі рэдка. У некаторых пахаваннях рэчы складвалі ў спецыяльныя прыбудовы да магільнай ямы. Найбольшую вядомасць набылі раскапаныя курганы Мельгуноўскі (каля г. Кіраваград), Чартамлыкскі (каля г. Нікапаль), Тоўстая магіла (каля г. Арджанікідзэ).

Важнай рысай скіфскай матэрыяльнай культуры з’яўлялася зброя. Знатныя воіны былі ўзброеныя кароткімі калючымі мячамі – акінакамі, аднак самай важнай зброяй скіфа быў лук і стрэлы. Наканечнікі стрэл – бронзавыя, утулкавыя, трохгранныя ці трохлапастныя.

Гліняны посуд разнастайны. Рабілі яго ўручную і ўпрыгожвалі арнаментам з зашчыпаў, насечак, нарэзных ліній. Пераважаюць добра прафіляваныя гаршкі з плоскім дном.

Адной з яскравых рысаў скіфскай культуры з’яўляецца мастацкі стыль, які называецца“звярыным”. “Звярыны” стыль разам са зброяй і конскай збруяй складае скіфскую трыяду. “Звярыны” стыль прадстаўляе выявы розных жывел у стылізаванай манеры. Галоўнай тэмай мастацтва была выява бягучага аленя. У яго звыкла ногі падагнутыя, морда выцягнутая ўперад, а галіністыя рогі закінутыя за спіну. Іншыя драпежнікі паказаныя ў момант раздзірання здабычы ці скурчанымі ў кола. Іх кіпцюры, хвасты і лапаткі часта афармляліся ў выглядзе галоў драпежнай птушкі. “Звярыны” стыль атрымаў распаўсюджанне на тэрыторыі, большай за тэрыторыю рассялення скіфаў (ад Кубані да Сібіры), і ў розных рэгіёнах меў свае асаблівасці.

У III ст. да н.э. на тэрыторыю скіфаў уварваліся **сарматы,** якія жылі ў прыволжскім стэпу. У II ст. да н.э. яны канчаткова выцеснілі скіфаў, і скіфскае насельніцтва захавала толькі невялікія плошчы ў Паўночным Прычарнамор’і. Адным з найбольш вядомым помнікам гэтага часу з’яўляецца паселішча Неапаль-на-Салгіры (каля г. Сімферопаль). Гэта гарадзішча, якое стала новай сталіцай скіфаў. Неапаль-на-Салгіры меў вялікія вароты з двума вартаўнічымі вежамі і каменныя сцены. За сценамі знойдзена пахаванне ў склепе. Сцены склепа былі размаляваныя, а ў пахавальнай камеры знаходзілася звыш 70 касцякоў. Даследчыкі мяркуюць, што гэты было пахаванне “цара”.

На працягу III – II ст. да н.э. прышлыя сармацкія плямены падпарадкоўвалі мясцовае скіфскае насельніцтва. У выніку яны занялі вялізную тэрыторыю, якая распаўсюджвалася ад Табола на ўсходзе да Дуная на захадзе.

Найбольш вядомыя сармацкія помнікі – пахаванні. У сарматаў былі распаўсюджаны курганы, якія часта ўтваралі вялікія могільнікі з сотняй і большай колькасцю насыпаў. У пахавальную камеру побач з памерлым змяшчалі мячы, наканечнікі стрэл, пацеркі, бронзавыя люстэркі, посуд, часткі туш коней і авечак. У некаторых пахаваннях знаходзяць вырабы з золата і серабра: бранзалеты, флаконы для духмяных рэчываў, дыядэмы і інш.

Адной з характэрных рысаў сармацкай культуры з’яўляецца зброя. У адрозненне ад скіфаў, выкарыстоўваўся доўгі сякучы меч, жалезныя чаранковыя наканечнікі стрэл.

Посуд сарматаў быў ляпны, прадстаўлены рознымі формамі. Знойдзены разнастайныя гаршкі, збаны, міскі, кружкі. Шырока распаўсюджаны бронзавы посуд, у прыватнасці, катлы. Вядомыя таксама знаходкі антычнай ганчарнай керамікі.

Яскравай прыкметай мастацтва сарматаў з’яўляецца інкрустацыя, калі розныя рэчы ўпрыгожвалі каляровымі камянямі.

Сарматы – саюз пляменаў, якія неаднаразова ўзгадваюцца ў антычных крыніцах (аланы, раксаланы і інш.). Паходжанне сарматаў дакладна не вядомае, не выключаецца, што яно было ў пэўнай ступені звязана са зрубнай культурай. Росквіт сармацкай культуры адзначаўся ў III ст. да н.э. – II ст. н.э., а яе канчатковы заняпад наступіў у IV ст. н.э., калі сарматы былі разгромлены гунамі. Пэўная колькасць сарматаў-аланаў былі цалкам вынішчана, але некаторыя плямёны аб’ядналіся з гунамі і рушылі далёка на захад. Асобныя рысы сармацкай культуры захаваліся ў культурах еўразійскіх качэўнікаў да VIII ст. н.э.

## 4. Жалезны век лясной паласы Усходняй Еўропы

У лясной паласе Усходняй Еўропы ў эпоху ранняга жалезнага веку склаліся новыя своеасаблівыя археалагічныя культуры, якія даследчыкі звязваюць з разнастайнымі групамі насельніцтва.

Тэрыторыя Эстоніі і ўсходніх абласцей Цэнтральнай Расіі была заселеная насельніцтвам, якое вырабляла сеткавую кераміку. Такую назву посуд атрымаў ад таго, што на яго паверхні захаваліся адбіткі грубай тканіны тыпу рагожы. Распаўсюджанне такой керамікі звыкла звязваецца з фіна-ўгорскім насельніцтвам.

Сярод культур, у якіх была распаўсюджана сеткавая кераміка, найбольш буйной была **дзякаўская культура.** Сваю назву яна атрымала ад Дзякава гарадзішча ў Расіі. Культура існавала ў VIII ст. да н.э. – IV ст.

н.э. Арэал культуры ахопліваў Волга–Окскае міжрэчча, Верхняе Паволжжа і Валдайскае ўзвышша.

Асноўны тып *паселішчаў* – гарадзішчы, якія размяшчаліся на павышаных участках рачнога ўзбярэжжа. Аснову іх умацаванняў складалі частаколы ці доўгія шматкамерныя пабудовы, які размяшчаліся па перыметру пляцоўкі. Асноўны тып жытлаў – наземныя шматкамерныя пабудовы, якія размяшчаліся па перыметру пляцоўкі. Пахаванні не вядомыя.

*Кераміка.* Выкарыстоўваліся слоікавыя, усечана-канічныя і моцнапрафіляваныя гаршкі, міскі, патэльні, каганцы.

*Прылады працы.* Значная іх частка выраблялася з косткі. Гэта наканечнікі стрэл, шматзубыя гарпуны, праколкі, шпількі, рукаяткі нажэй і г.д. Жалезныя прылады працы з'яўляюцца толькі к канцу I тыс. да н.э., а пачынаюць пераважаць у пачатку I тыс. н.э. Сярод жалезных прадметаў вядомы нажы з гарбатай спінкай, кельты, сярпы, іголкі, шылы, рыбалоўныя кручкі, наканечнікі стрэл і г.д.

Вядомы *ўпрыгожанні і дэталі вопраткі:* шпількі, фібулы, спражкі, падвескі, шкляныя і паставыя пацеркі.

Характэрнай рысай культуры з'яўляюцца гліняныя грузікі дзякава тыпу. Яны мелі, як правіла, грыбападобную форму з насечкамі па краю. Іх назначэнне дакладна не вядома. Некаторыя даследчыкі звязваюць іх з ткацтвам, іншыя – з культам.

*Гаспадарка.* Важнае значэнне мелі жывелагадоўля, земляробства, паляванне і рыбная лоўля. Сеялі жыта, пшаніцу, канаплю. Насельніцтва займалася каляровай і чорнай металургіяй і металаапрацоўкай.

*Паходжанне* дзякаўскай культуры не высвятлена. Хутчэй за ўсе, культура склалася на мясцовай аснове. Не высветлены і лёс культуры. Некаторыя даследчыкі дапускаюць, што дажыла яна да X ст. – да прыходу летапісных славян.

На тэрыторыі Беларусі жалезны век пачаўся ў канцы VII–VI ст. да н.э. і працягваўся да V ст. н.э. Тэрыторыя Беларусі ў эпоху жалезнага веку была заселена плямёнамі, якія даследчыкі адносяць да шэрага археалагічных культур. Міжрэчча сярэдняга цячэння Дзвіны і вярхоўяў Дняпра было заселена носьбітамі днепра-дзвінскай культуры. У Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі, а таксама на тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Літвы адзначаецца існаванне культур штрыхаванай керамікі (назва паходзіць ад характэрнага спосабу апрацоўкі знешняй паверхні посуду). На поўдзень ад гэтых культур – на тэрыторыі Беларускага

Палесся і лесастэпавай зоне Падняпроўя – пражывалі плямёны мілаградскай культуры, якіх з цяга часу змянілі носьбіты зарубінецкай культуры. Праблемы этнічнай прыналежнасці згаданых груп насельніцтва выклікаюць пэўныя дыскусіі. Найменш спрэчным з’яўляецца пытанне этнічнай прыналежнасці носьбітаў культур штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай. Традыцыйна іх адносяць да культур балцкага насельніцтва. У ІІ ст н.э. у Заходнім Палессі з’явіліся параўнальна нешматлікія групы германскіх плямёнаў – готаў, што адзначаецца па наяўнасці помнікаў вельбарскай культуры. З’яўленне гэтых груп на тэрыторыі Беларусі тлумачыцца перамяшчэннем готскіх плямёнаў з нізоўяў Віслы ў Пабужжа, Падняпроўе і Падунаўе.

## 5. Археалагічныя культуры жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі

**Мілаградская культура** атрымала сваю назву ад. в. Мілаград Гомельскай вобл.

*Арэал* культуры ахопліваў тэрыторыю ад сярэдняга цячэння р. Беразіны на поўначы да р. Рось на поўдні, ад вярхоўяў Заходняга Буга на захадзе да басейна р. Сож на усходзе.

*Час існавання* – VII – пачатак ІІ ст. да н.э.

*Паселішчы* прадстаўлены 2 тыпамі: гарадзішчамі і селішчамі. Для мілаградскай культуры характэрныя такія тыпы жытлаў, як зямлянкі, полуземлянкі, наземныя хаты. Пабудовы мелі прамавугольную форму. Характэрнай прыкметай жытлаў быў выступ у адным з вуглоў.

*Пахавальныя помнікі* прадстаўлены курганамі і грунтовымі могільнікамі. Пахавальны абрад даволі разнастайны. Курганныя пахаванні часта здзяйсняліся па абраду трупапакладання ў ямах, драўляных скрынях. Пахавальны інвентар вельмі багаты, прадстаўлены гаршкамі, наканечнікамі дзідаў, залатой завушніцай скіфскага тыпу і інш. Пахавальны абрад грунтвых могільнікаў – трупаспаленне. У магілу змяшчалі параўнальна бедны інвентар: некалькі фрагментаў посуду, зубы свойскіх жывёл.

*Кераміка.* Галоўная асаблівасць керамікі – кругладоннасць гаршкоў Арнамент бедны, найбольш тыповы матыў – т.зв. “перліны” (уціскані, нанесеныя палачкай з унутранага боку, у выніку чаго звонку ўтвараліся выпукліны).

*Прылады працы.* Жалезныя вырабы з’явіліся ўжо на раннім этапе існавання культуры. Многія прылады звязаны з земляробствам: сярпы з

кручкамі на пятках, матыжкі, сякеры і інш. Вядомы таксама жалезныя нажы, шылы, іголкі, прабойнікі. *Зброя.* Для мілаградскай культуры характэрныя жалезныя плоскія наканечнікі рамбічнай, трохвугольнай, лістападобнай формы. Выкарыстоўваліся таксама бронзавыя скіфскія трохгранныя ўтулкавыя наканечнкі стрэл.

*Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Выкарыстоўваліся булаўкі, завушніцы, падвескі, пранізкі і г.д. Завушніцы з грыбападобным навершыям, паставыя і шкляныя бусіны з'яўляліся скіфскім імпартам. Браслеты выраблялiся з жалеза, бронзы, серабра. На гарадзішчы Гарошкаў Лоеўскага раёна быў знойдзены скарб бранзалетаў. Такія бранзалеты выкарыстоўваліся кельтамі, і да носьбітаў мілаградскай культуры упрыгожанні трапілі праз скіфаў.

*Гаспадарка.* Аб земляробчай дзейнасці насельніцтва сведчыць характэрны інвентар: сярпы, матыжкі, зерняцёркі і інш. Вырошчвалі проса, пшаніцу, ячмень, бабовыя. У складзе статку дамінавала буйная рагатая жывёла, былі вядомыя лошадзі, дробная рагатая жывёла, сабакі. Значная роля ў харчаванні насельніцтва належала паляванню. Аб занятках ткацтвам сведчаць гліняныя грузікі (прасліцы). Вядомы таксама прасліцы, форма якіх нагадвае форму кругладонных мілаградскіх пасудзін. Шырокае распаўсюджанне атрымалі чорная металургія і металаапрацоўка, бронзаліцейная вытворчасць.

*Праблема паходжання* канчаткова не высветленая. Большасць даследчыкаў мяркуе, што мілаградская культура склалася на базе лебядоўскай культуры позняга бронзавага веку. *Гістарычныя лёсы.* У канцы III – пачатку II ст. да н.э. носьбіты мілаградскай культуры былі асіміляваныя насельніцтвам зарубінецкай культуры.

*Праблема этнічнай прыналежнасці* носьбітаў. У археалагічнай літаратуры носьбіты мілаградскай культуры традыцыйна атаясамліваліся з неўрамі Герадота. Сёння гэта меркаванне разглядаецца як памылковае. Этнічная прыналежнасць мілаградскага насельніцтва не высветленая. На думку некаторых даследчыкаў, мілаградская культура – славянская культура. Іншыя спецыялісты лічаць культуру балцкай.

**Зарубінецкая культура.** Назва культуры паходзіць ад в. Зарубінцы Кіеўскай вобл.

*Арэал* культуры ахопліваў тэрыторыю Сярэдняга Падняпроўя, Палессе і Верхяне Падняпроўе да г. Быхава. Помнікі зарубінецкай культуры вядомыя таксама ў Падзесянні, Паўднёвым Пабужжы.

*Час існавання.* Культура склалася на мяжы III – II ст. да н. э. і праіснавала ў розных рэгёнах да сярэдзіны I – канца II ст. н. э.

*Паселішчы* прадстаўлены гарадзішчамі і селішчамі. У Сярэднім Падняпроўі былі распаўсюджаныя полузямлянкавыя жытлы з пляцёна-каркаснай канструкцыяй сцен. На Палессі дамінавалі паўзямлянкі зрубнай канструкцыі. На Верхнім Падняпроўі будавалі наземныя жытлы слупавой канструкцыі. Ацяпляліся пабудовы адкрытымі вогнішчамі, якія былі абкладзеныя камянямі.

*Пахавальныя помнікі* – выключна грунтавыя. Асноўны тып пахавальнага абраду – трупаспаленне. Вядомыя таксама кенатафы – пахаванні без парэшткаў чалавека, аднак з пахавальным інвентаром. Побач з памерлым змяшчалі гаршчок, міску, кубак, радзей – прылады працы і зброю..

*Кераміка* падзяляецца на кухонную і сталовую. Першы тып – грубалепны посуд, які сустракаецца на паселішчах, другі тып – глянцаваны посуд, які пераважае ў пахаваннях. Па функцыянальнаму прызначэнню кераміка падзяляецца на гаршкі, міскі і кубкі (невялікія пасудзіны з ручкай).

*Прылады працы.* Для зарубінецкай культур характэрны жалезныя сякеры-кельты, сярпы з кручком на пятцы, нажы; каменныя зерняцёркі. На гарадзішчы Уваравічы была знойдзена працоўная частка рала з жалезным наканечнікам. *Зброя* прадстаўлена жалезнымі ўтулкавымі наканечнікамі дзідаў і двушыпнымі наканечнікамі дроцікаў. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Часта выкарыстоўваліся т.зв. фібулы зарубінецкага тыпу. фібулы трохвугольныя са шчытком на ножцы, якія упрыгожваліся ўцісканнямі.

*Гаспадарка.* Гаспадарчая дзейнасць носьбітаў зарубінецкай культры была цесна звязаная з земляробствам і жывёлагадоўляй. Насельніцтва вырошчвало пшаніцу, проса, ячмень, гарох, лён і інш. У склад статка ўваходзіла буйная і дробная рагатая жывёла, свінні, коні. Нязначная роля належала паляванню і рыбалоўству. Паляванне вялося на кабана, лася, аленя, касулю, зайца. Аб'ектамі рыбнай лоўлі былі шчупак, сом, лешч.

*Праблема паходжання* культуры. Згодна з найбольш распаўсюджаным тлумачэннем, на тэрыторыю Палесся, Верхняга і Сярэдняга Падняпроўя з тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы прыйшлі плямёны культуры падклашовых пахаванняў. Мігранты змяшаліся з мясцовым насельніцтвам і ўспрынялі іх лакальныя традыцыі. Зарубінецкае насельніцтва падтрымлівала сувязь са скіфскімі, сармацкімі, кельцкімі плямёнамі, гарадамі Паўночнага Прычарнамор'я.

*Праблема этнічнай прыналежнасці* носьбітаў застаецца канчаткова не высветленай: некаторыя даследчыкі адносяць іх да балтаў, некаторыя – да славянаў . *Гістарычныя лёсы* дакладна не вядомы.

**Культуры штрыхаванай керамікі.** Назва паходзіць ад своасаблівага прыему апрацоўкі посуду: знешнія паверхні гаршкоў загладжваліся саломай, у выніку чаго заставаліся штрыхі, вертыкальна ці дыяганальна накіраваныя.

*Арэал* культур ахоплівае тэрыторыю Усходняй Літвы, Паўднёва-Заходняй Латвіі, Паўночна-Заходняй і Цэнтральнай Беларусі. *Час існавання.* Традыцыя штрыхавання посуду існавала вельмі працяглы час, і даследчыкі вылучаюць 2 культуры: культуру ранняй штрыхаванай керамікі (пачатак I тыс. да н.э. – мяжа эр), культуру позняй штрыхаванай керамікі (мяжа эр – III ст. н.э).

*Паселішчы.* Асноўны тып паселішчаў – гарадзішчы. Селішчы нешматлікія, сустракаюцца толькі на познім этапе існавання культуры. Жытлы, як правіла, размяшчаліся па перыметру жылой пляцоўкі. Цэнтральная частка паселішча заставалася неўмацаванай. Найбольш распаўсюджаны тып жытлаў – наземныя пабудовы слупавой канструкцыі. Жылыя памяшканні ацяпляліся вогнішчамі. Яны былі ўтвораныя акруглай лінзай пяску, абкладзенай камянямі і абмазанай глінай.

*Пахавальныя помнікі* не вядомыя (дагэтуль не выяўлены).

*Кераміка.* У I тыс. да н.э. выкарыстоўваліся гаршкі, цалкам пакрытыя штрыхоўкай. У канцы I тыс. да н.э. з’яўляюцца рабрыстыя гаршкі, верхняя частка якіх гладкая, а ніжняя – заштрыхаваная. Частка посуду арнаментавалася ямкавымі ўцісканнямі, зашчыпамі, пракрэсленымі лініямі.

*Прылады працы.* У I тыс. да н.э. сыравінай для вырабу прыладаў з’яўляліся камень, рог, костка. У канцы I тыс. да н.э. пачынаюць распаўсюджвацца жалезныя вырабы. Шырока прадстаўлены нажы, сярпы, чаранковыя серпападобныя нажы. *Зброя.* Выкарыстоўваліся наканечнікі стрэл, кінжалы, якія выраблялiся з трубчастых костак. У канцы I тыс. да н.э. дамінуюць наканечнікі дзідаў, дроцікаў, выробленыя з жалеза. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Найбольш распаўсюджаныя посахападобныя булаўкі і падвескі разнастайных форм (трапецыяпадобныя, ачкападобныя і інш.). Зрэдку сустракаюцца фібулы.

*Гаспадарка.* Насельніцтва займалася вытворчай гаспадаркай. Носьбіты культур штрыхаванай керамікі вырошчвалі пшаніцу, жыта, бабовыя, гарох. У склад статка ўваходзілі буйная і дробная рагатая

жывёла, свінні, лошадзі. Палявалі на дзіка, тура, лася, бабра, зайца, куніцу і інш. Знаходкі каменных грузіл для сетак сведчаць аб занятках рабылоўствам. Сярод хатніх рамёстваў вядучая роля належала апрацоўцы косткі і рога, каменя. Значнае развіццё атрымала бронзаліцейная справа. У канцы І тыс. да н.э. распаўсюджваецца чорная металургія і металаапрацоўка.

*Праблема паходжання.* У сувязі з невывучанасцю эпохі бронзы ў рэгіёне пытанне не высветленае. *Гістарычныя лёсы***.** У сярэдзіне V ст. н.э. культура позняй штрыхаванай керамікі спыняе сваё існаванне. На тэыторыі Беларусі гэта насельніцтва было асіміляванае носьбітамі банцараўскай культуры. *Праблема этнічнай прыналежнасці.* Пераважная большасць даследчыкаў адносіць культуры да балцкіх старажытнасцяў.

**Днепра-дзвінская культура.** Назва паходзіць ад месца лакалізацыі культуры.

*Арэал* культуры ўключаў Смаленскае Падняпроўе, паўночную частку Магілёўскай вобласці, Полацка-Віцебскае парэчча Заходняй Дзвіны.

*Час існавання культуры* сінхронны часу існавання культур штрыхаванай керамікі. Помнікі днепра-дзвінскай культуры ўзніклі ў пачатку І тыс. да н.э., а знікалі каля V ст. н.э.

*Паселішчы.* Асноўны тып паселішчаў – гарадзішчы. Селішчы нешматлікія, сустракаюцца толькі на познім этапе існавання культуры. На ранніх гарадзішчах сустракаліся паўзямлянкі, аднак найбольш распаўсюджаным тыпам збудаванняў былі доўгія наземныя пабудовы слупавой канструкцыі, якія размяшчаліся па перыметру пляцоўкі. На мяжы эр пачалі распаўсюджвацца аднакамерныя пабудовы слупавой канструкцыі. Жылыя памяшканні ацяпляліся вогнішчамі, якія былі ідэнтычныя вогнішчам культур штрыхаванай керамікі.

*Пахавальныя помнікі* не вядомыя.

*Кераміка.* Для днепра-дзвінскай культуры характэрны гладкасценны посуд. Па форме кераміка падзяляецца на гаршкі баначныя і слабапрафіляваныя. Кераміка, як правіла, неарнаментаваная.

*Прылады працы.* На ранніх этапах існавання культуры для вырабу прыладаў працы выкарыстоўвалі костку і камень. Шматлікую групу прыладаў складаюць каменныя свідраваныя сякеры, сякеры-кліны, зернацёркі. З косткі выраблялі вастрыі, праколкі, шылы і інш. Каля VI–IV ст. да н.э. у інвентары з’явіліся жалезныя прылады працы – сякеры, сярпы, нажы, серпападобныя нажы, іголкі, шылы. *Зброя* прадстаўлена наканечнікамі стрэл і дзідаў. На ранніх этапах існавання культуры яны

выраблялiся з трубчастых костак, на познiх – з жалеза. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Частай знаходкай на гарадзішчах з’яўляюцца касцяныя і жалезныя булаўкі. Касцяныя булаўкі маюць посахападобную шляпку і вушка на ігле, прылады імітуюць бронзавыя вырабы, вядомыя ў паўднёвых рэгіёнах. Жалезныя булаўкі, як правіла,маюць посахападобную форму.

*Гаспадарка.* Значнае месца ў гаспадарцы належала падсечнаму земляробству і жывёлагадоўлі. Насельніцтва днепра-дзвінскай культуры вырошчвала пшаніцу, роса, лён. Аснову статка складала буйная рагатая жывёла. Лошадзі і дробная рагатая жывёла мелі другаснае значэнне. Паляванне вялося на тура, лася, аленя, кабана, лісіцу, куніцу і інш. Аб’ектамі рыбнай лоўлі былі шчупак, сом, лешч. Сярод хатніх рамёстваў значная роля належала апрацоўцы каменя і косткі. Каля другой паловы I тыс. да н.э. распаўсюдзілася чорная металургія. На гарадзішчах часта знаходзяць крыцы, шлак, печы-домніцы. Аб ткацтве сведчаць прасліцы, аднак яны з’яўляюцца параўнальна рэдкай катэгорыяй знаходак.

*Праблема паходжання.* У сувязі з невывучанасцю эпохі бронзы ў рэгіёне пытанне не высветленае. *Гістарычныя лёсы.* У III–V ст. н.э. у арэал днепра-дзвінскай культуры пранiклi носьбiты кiеўскай культуры. У выніку кантактаў насельніцтва фарміраваліся новыя культуры – банцараўская, тушамлінская. *Праблема этнічнай прыналежнасці.* Пераважная большасць даследчыкаў адносіць культуру да балцкіх старажытнасцяў.

**Кіеўская культура.** *Арэал* культуры ахопліваў Беларускае Падняпроўе, Усходняе Палессе, поўнач Сярэдняга Падняпроўя, Падзесенне.

*Час існавання культуры* – канец II – сярэдзіна V ст. н.э.

*Паселішчы.* Вядомы выключна селішчы. Паселішчы часта размяшчаліся “гнёздамі” па 3–5 у кожным. На тэрыторыі Беларусі вядомы два тыпы жытлаў: паўзямлянкі і наземныя дамы. Жытлы мелі слупавую канструкцыю, у цэнтры катлавана прасочваліся сляды ад апорнага слупа, якi падтрымоўваў дах. Пабудовы ацяпляліся вогнішчамі ці пячамі-каменкамі. Побач з жытламі размяшчаліся гаспадарчыя ямы.

*Пахавальныя помнікі* выключна грунтавыя. Спаленыя парэшткі памерлага разам з рэшткамі вогнішча ссыпаліся на дно ямы. Пахавальны інвентар вельмі бедны: звычайна ў пахаваннях знаходзіліся толькі фрагменты пасудзін, радзей – яшчэ і адзінкавыя ўпрыгожанні і дэталі вопраткі.

*Кераміка* падзяляецца на сталовы і кухонны посуд. Вядучы тып кухоннага посуду – вялікія гаршкі, слабапрафіляваныя ці рабрыстыя.

Пасудзіны зрэдку арнаментаваліся насечкамі, пальцавымі ўціскannямі. Сталовая кераміка прадстаўлена міскамі і гаршкападобнымі пасудзінамі. Частка сталовага посуду глянцаваная.

*Прылады працы* выраблялiся з жалеза. У інвентары адзначаюцца сярпы, нажы, шылы, свердзелы і інш. Вядомы асялкі, каменныя зерняцёркі. Упершыню на тэрыторыі Беларусі выяўлены каменныя жорны. *Зброя* прадстаўлена жалезнымі наканечнікамі стрэл, рыштункам конніка. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Носьбіты кіеўскай культуры карысталіся касцянымі грэбнямі, бронзавымі і жалезнымі спражкамі, фібуламі, пінцэтамі. Характэрнай прыкметай кіеўскай культуры з'яўляліся рэчы з эмалямі, у т.л. лунніцы-падвескі, на канцах якіх меліся эмалевыя ўстаўкі. Гэтыя ўстаўкі выраблялі з імпартных пацерак: іх расплаўлялі, а атрыманую масу залівалі ў гнёзды на ўпрыгожаннях. Такім чынам, лунніцы мелі мясцовае паходжанне.

*Гаспадарка.* Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рыбалоўствам. Добра былі развітыя чорная і каляровая металургія, ткацтва.

*Праблема паходжання культуры* канчаткова не вырашана. Большасць спецыялістаў лічыць, што кіеўская культура склалася на аснове позніх зарубінецкіх старажытнасцяў пры ўплыве заходніх (пшэворская) і паўночных культур. *Гістарычныя лёсы.* На працягу V ст. н.э. на аснове кіеўскай культуры склаліся раннесярэдневяковыя помнікі калочынскай і чарняхоўскай культур. Насельніцтва кіеўскай культуры прымала ўдзел у фарміраванні пражскай і банцараўскай культур. *Праблема этнічнай прыналежнасці.* Пераважная большасць даследчыкаў адносяць кіеўскую культуру да кола славянскіх культур.

**Вельбаркская культура** атрымала сваю назву ад назвы могільніка Вельбарк у вярхоўях Віслы.

*Арэал культуры***.** Культура сфарміравалася ў сярэдзіне І ст. н.э. на Польскім Памор'і і ў вярхоўях Віслы. У другой палове ІІ ст. н.э. носьбіты культуры мігравалі ў паўднёва-заходнім накірунку, займаючы Падляшша, Люблiншчыну, Валынь, беларускае Пабужжа, Турава-Пінскае Палессе.

*Час існавання культуры* ў асноўным арэале – І–V ст. н.э., на тэрыторыі Беларусі – ІІ–IV ст. н.э.

*Паселішчы.* Вядомы выключна неўмацаваныя паселішчы – селішчы. Найбольш характэрным тыпам пабудоў з'яўляюцца двухкамерныя (падзеленыя нажылую і гаспадарчую частку) наземныя жытлы слупавой

канструкцыі – т.зв “доўгія дамы”. Сутракаюцца таксама паўзямлянaчныя жытлы, гаспадарчыя пабудовы.

*Пахавальныя помнікі.* Вядомы выключна грунтавыя пахаванні па абраду крэмацыі і інгумацыі (трупапакладання). Менавіта пахаванні – найбольш вывучаныя помнікі вельбарскай культуры. Найбольш вядомы вельбарскі помнік на тэрыторыі Беларусі – могільнік Брэст-Трышын. На ім было даследавана 75 пахаванняў з трупаспаленнем. Рэшткі памерлых ссыпаліся ў ўрны альбо проста на дно пахавальнай ямы. У пахаваннях змяшчаўся багаты інвентар: кераміка, праслiцы, іголкі, фібулы, спражкі і інш.

*Кераміка.* Посуд прадстаўлены гаршкамі, вазападобнымі пасудзінамі, кубкамі, міскамі, мініяцюрнымі пасудзінкамі. Гаршкі звычайна таўстасценныя, іх паверхня няроўная і шурпатая. Іншыя віды посуду зроблены больш якасна, іх паверхня добра загладжаная.

*Прылады працы* на помніках вельбаркскай культуры сустракаюцца вельмі рэдка. Прылады прадстаўлены іглaмі, праселкамі, асялкамі. Выкарыстоўваліся сярпы, косы, ручныя жорны. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі.* Прадстаўлены бронзавымі фібуламі, спражкамі, наканечнікамі паясоў. Упрыгожанні рэдкія: гэта бранзалеты, падвескі ў выглядзе нажа, ключа і сякеркі, рамскія манеты з адтулінай для падвешвання, пацеркі са шкла, буртштына, срэбра. Выкарыстоўваліся касцяныя грэбені.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадаркі складалі ворнае земляробства і чорная металургія. Сярод зернявых перавага аддавалася аўсу, ячменю, просу, пшаніцы. Склад статкаў характарызуецца значным пагалоўем авечак і коз. Важная роля ў гаспадарчай дзейнасці належала гандлю. Насельніцтва вельбаркскай культуры кантралявала ключавыя ўчасткі “бурштыновага” і балтыйска-чарнаморскага гандлёвых шляхоў, якія злучалі народы Прыбалтыйскага рэгіёну з Рымскай Імперыяй.

*Праблема этнічнай прыналежнасці.* Насельніцтва культуры атаясамліваецца з германскімі плямёнамі – готамі. *Гістарычныя лёсы.* У другой палове IV ст. н.э. протадзяржавы готаў у Паўночным Прычарнамор’і былі зруйнаваныя гунамі. Пасля гэтага помнікі вельбаркскай культуры на большай частцы арэалу, як і ў Беларусі, спынілі сваё існаванне.

### 6. Гаспадарчыя заняткі насельніцтва Беларусі ў жалезным веку

Асновай гаспадаркі з’яўляліся земляробства і жывёлагадоўля. Насельніцтва займалася падсечна-агнявым (лядным) земляробствам,

сутнасць якога заключалася ў наступным. На пэўным участку высякалі дрэвы, пасля таго, як яны падсыхалі, іх выпальвалі. Попел – добрае ўгнаенне, таму такі падрыхтаваны ўчастак быў прыдатны для сельскагаспадарчага выкарыстання. Поле апрацоўвалі і засявалі некалькі гадоў, пакуль глеба радзіла. Пасля яго пакідалі, каб глеба магла аднавіць сваю ўрадлівасць. Такі спосаб вядзення гаспадаркі быў даволі прадукцыйным, аднак патрабаваў частай змены дзялянак, таму агульная эфектыўнасць была параўнальна нізкая. Для падсекі выкарыстоўвалі каменныя сякеры, з цягам укаранення чорнай металургіі і металаапрацоўкі распаўсюдзіліся і жалезныя сякеры. Глебу апрацоўвалі драўлянымі ворнымі прыладамі – раламі. Старажытнейшая на тэрыторыі Беларусі ворная прылада працы – крываградзільнае рала, зробленае з дубовай расохі, – было знойдзена на гарадзішчы Капланавічы (Нясвіжскі раён). Для збору ўраджаю выкарыстоўвалі бронзавыя, жалезныя сярпы. Старажытнае насельніцтва вырошчвала проса, пшаніцу, ячмень. Найбольш распаўсюджаным відам гародніны была рэпа. Вырошчвалі таксама тэхнічныя культуры (лён і каноплі). У статку дамінавала буйная рагатая жывёла, дробная рагатая жывёла, конь, свіння. Такі склад статка сведчыць аб прысядзібным характары жывёлагадоўлі.

Старажытнае насельніцтва Беларусі займалася і прысвойваючымі відамі гаспадаркі. Аб'ектамі палявання былі шматлікія дзікія жывёлы. Паляванне вялося па двум асноўным напрамкам: для атрымання мяса (лось, зубр, тур, алень, кабан і мядзведзь) і для атрымання футра (астатнія віды, перш за ўсё бабёр).

Знаходкі рэшткаў рыбы і рыбалоўных прыладаў малалікія, аднак яны сведчаць аб тым, што старажытнае насельніцтва лавіла сама, акуня, плотку, ляшча, ліня. Для лоўлі выкарыстоўвалі кручкі, астрогі, гарпуны.

Істотнае значэнне для чалавека жалезнага веку захоўвала таксама збіральніцтва, здабыча мёду і воску лясных пчол.

Выключнае значэнне ў гаспадарцы належала хатнім рамёствам, перадусім чорнай металургіі і металаапрацоўцы. На поўдні Беларусі людзі сталі выкарыстоўваць жалезныя прылады працы з VII–VI стст да н.а, а ў цэнтральнай і паўночнай яе частках краіны – толькі на мяжы эр.

Жалеза атрымоўвалі сырадутным спосабам. Сыравінай для такой вытворчасці з'яўлялася жалезная (балотная) руда. На шматлікіх археалагічных помніках былі знойдзены рэшткі сырадутных печаў. Насельніцтва паўднёвай ускраіны Беларусі вытворчасцю жалеза займалася за межамі гарадзішчаў, у мэтах супрацьпажарнай бяспекі.

З жалеза выраблялі асноўныя прылады працы (сякеры, сярпы, цёслы, нажы), узбраенне (коп'і, дроцікі, наканечнікі стрэл), упрыгожанні (шпількі, бранзалеты, кольцы, фібулы), прадметы побыту (шылы, іголкі). Даследчыкі мяркуюць, што першымі кавалямі з'яўляліся майстры-металургі. Археалагічныя матэрыялы сведчаць, што молаты і накавальні ў такіх металургаў-кавалёў былі каменныя, аднак старажытныя майстры валодалі складанымі тэхналогіямі вытворчасці дабраякасных прыладаў (загартоўка, цэментацыя і інш.).

На помніках археолагі знаходзяць бронзавыя рэчы, перадусім упрыгожанні (бранзалеты, грыўні, завушніцы, пярсцёнкі, скроневыя кольцы, шпількі, фібулы і г.д.). Частка вырабаў імпартавалася. Аднак і насельніцтва Беларусі займалася бронзаліцейнай справай. Аб гэтым сведчаць знаходкі тыгляў – невялікіх керамічных пасудзін для плаўкі металу, льячак – невялікіх гліняных лыжачак для іх разліўкі, абломкі ліцейных форм.

Насельніцтва займалася таксама апрацоўкай каменю, рога, косткі, прадзеннем.

У эпоху жалезнага веку актыўна развіваліся міжплемянныя абмен і гандаль. У раннім жалезным веку жыхары Паўднёвай Беларусі (носьбіты мілаградскай культуры) падтрымлівалі кантакты з плямёнамі скіфскай культуры. На помніках знойдзены шматлікія прадметы ўзбраення: бронзавыя наканечнікі стрэл і рыштунку конніка і баявога каня, прылады працы вырабы паўсядзённага ўжытку, у тл. бронзавыя люстэркі. Пасля знікнення скіфскай культуры ўсталяваліся сувязі з латэнскім светам. На поўдні і ўсходзе Беларусі знойдзены імпартныя фібулы, бранзалеты. У рымскі час (у пачатку н.э.) інтэнсіўнасць знешніх сувязяў павялічылася. На Беларусь трапляў імпарт з грэка-рымскіх гарадоў Прычарнамор'я. Праз тэрыторыю Беларусі праходзілі старажытныя бурштынавыя шляхі, якія злучалі Прыбалтыку і паўднёвыя рэгіёны.

## 7. Духоўная культура насельніцтва Беларусі ў жалезным веку

Істотнымі археалагічнымі крыніцамі для вывучэння духоўнай культуры чалавека з’яўляюцца пахавальныя помнікі. Для мілаградскай культуры характэрны курганныя і бескурганныя могільнікі. Пахаванні пад курганнымі насыпамі адбываліся па абраду трупапакладання. Пахаванні ў грунтовых магілах здзяйсняліся па абраду трупаспалення. Крэмацыя адбывалася за межамі могільніка. Ачышчаныя кальцыніраваныя косткі ссыпаді на дно ямы. У пахаванні змяшчалі пахавальны інвентар: кераміку,

прылады працы і побыту, зброю, упрыгожванні. У некаторых пахаваннях былі знойдзены кавалкі чырвонай і жоўтай вохры.

Для зарубінецкай культуры на тэрыторыі Беларусі характэрны грунтовыя пахаванні па абраду трупаспалення. Выяўлены таксама кенатафы – магілы без пахавання (парэшткі нябожчыка адсутнічалі). Кенатафы рабіліся, калі памерлага было немагчыма пахаваць (напр., загінуў на чужыне). Звыклы пахавальны інвентар складаўся з посуду, упрыгожанняў, прыладаў працы, зброі, костак свойскіх жывёл.

Пахавальныя помнікі насельніцтва культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры невядомыя.

Пахавальны абрад носібітаў кіеўскай культуры – трупаспаленне ў грунтовых могільнікаў. Рэшткі спалення змяшчалі ў ямы альбо ўрны, у якасці якіх выкарыстоўвалі ляпныя гаршкі. Некаторыя з іх накрываліся перавернутым уверх дном гаршком. У пахаванні змяшчалі цэлы посуд ці яго фрагменты, праслiцы, пацеркі, жалезныя фібулы і інш.

Для вельбарскай культуры характэрны грунтовыя могільнікі па абраду крэмацыі, урнавай і безурнавай. Пахаванні суправаджаліся разнастайнымі рэчамі, якія, у большасці выпадкаў, былі пашкоджаныя агнём.

Даследчыкі мяркуюць,што ў старажытнага насельніцтва, якое жыло на тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку, існаваў культ сонца і агню. Яго адлюстраваннем звыкла лічыцца абрад трупаспалення, а таксама арнамент на посудзе, праслiцах, іншых прадметах у выглядзе канцэнтрычных кольцаў і наразных ліній, якія праменямі разыходзяцца ад цэнтральнай адтуліны. У пачатку нашай эры на тэрыторыі Беларусі з’явіліся і выявы свастык. Праслiца і іншыя прадметы са свастыкамі знаходзяць на гарадзішчах насельніцтва культур штрыхаванай керамікі, днепра-дзвінскай і кіеўскай. Амаль усе гэтыя свастыкі, у адрозненне ад больш позніх, правабаковыя, г.зн. павернутыя канцамі па гадзіннікавай стрэлцы.

У жалезным веку існаваў і культ жывёл. Напрыклад, на мілаградскіх гарадзішчах Паўднёвай Беларусі знойдзена вялікая колькасць фігурак жывёл: каня, буйной рагатай жывёлы, бабра. У мілаградцаў сустракаліся таксама ахвярныя пахаванні дзікіх і свойскіх жывёл (сабакі, бабра, свінні). Культ жывёл меў распаўсюджанне і ў плямён зарубінецкай культуры: на помніках знойдзены прасвідраваныя іклы ваўка, зубы мядзведзя, бабра. Амулеты з іклаў жывёл выкарыстоўвала і насельніцтва Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі.

Эстэтычныя ідэалы жалезнага веку ўвасабляліся таксама ў дэкоры жалезных і бронзавых упрыгожванняў і прыналежнасцей адзення. Распаўсюджанымі тыпамі ўпрыгожванняў вопраткі, конскай збруі былі разнастайныя бранзалеты, грыўны, шпількі, падвескі, кольцы, накладкі. Вырабы часта арнаментаваліся. У жалезным веку былі распаўсюджаныя разнастайныя скроневыя кольцы і пярсцёнкі, падвескі. Шпількі і фібулы выкарыстоўваліся адначасова і як рэчы ўтылітарнага прызначэння, і як упрыгожванні. Каля II ст. н.э. з'явіліся і пачалі распаўсюджвацца вырабы з каляровымі эмалямі – спражкі, падвескі і інш. Такія рэчы знойдзены на помніках кіеўскай культуры. У пачатку жалезнага веку на поўдні Беларусі былі папулярныя рознакаляровыя пацеркі са шкла, якія крыху пазней распаўсюдзіліся і ў цэнтры і поўначы Беларусі. Упрыгожанні на тэрыторыі Беларусі былі як мясцовай вытворчасці, так і імпартныя, латэнскія або правінцыяльна-рымскія. Аднак, як сведчаць знаходкі тыгляў са слядамі шкляной масы, мясцовае насельніцтва і само ўмела вырабляць шкляныя ўпрыгожанні.

## ТЭМА 4. СЛАВЯНЕ І ІХ СУСЕДЗІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ І ТЫС. Н.Э.

### План

1. Праблема паходжання славян. Першыя славянскія культуры
2. Старажытнасці балтаў другой паловы І тыс. н.э.
3. Усходнеславянскія саюзы пляменаў і іх суседзі

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 5.*

### 1. Праблема паходжання славян. Першыя славянскія культуры

Пытанні этнагенезу і ранняй этнічнай гісторыі славянаў традыцыйна з’яляюцца аднымі з цэнтральных праблем усходнееўрапейскай археалогіі.

Славяне – гэта сучаснае вымаўленне саманазвы народа, а пазней – і групы народаў. Паходжанне гэтага слова, якое захавалася ва ўсіх славянскіх народаў, дакладна не вызначана. Папулярнай з’яўляецца думка, што сэнс гэтага этноніма звязаны са значэннем “слова”, “людзі, якія гавораць” – г.зн., гэтым словам калісьці акрэслівалася насельніцтва, якое размаўляла на адной, зразумелай кожнаму чалавеку, мове.

У пісьмовых крыніцах славяне ўзгадваюцца пачынаючы з VI ст. н.э. як “склавіны” – плямёны, роднасныя антам і спадкаемцы венедаў. Дагэтуль праблема часу і месца паходжання славян канчаткова не вырашаная. Пакаленні даследыкаў разглядалі гэтыя пытанні на падставе лінгвістычных, археалагічных, антрапалагічных, палеагенетычных і інш. даных.

Упершыню на згаданыя пытанні паспрабаваў адказаць яшчэ аўтар “Аповесці часовых гадоў” Нестар (XII ст). Ён лічыў, што найбольш старажытнай тэрыторыяй славянаў былі землі па ніжнім цячэнні Дуная і ў Панонii, адкуль славяне пачалі рассяляцца ў паўночным, усходнім і паўднёвым напрамкам.

На сённяшні дзень існуе некалькі гіпотэз адносна прарадзімы славян (дунайская, вісла-одэрская, дняпроўская, буга-днястроўская і інш.). Не вызначана, калі адбывалася складванне старажытных славянскіх культур. Некаторыя даследчыкі адносяць фарміраване славян да ранняга бронзавага веку, шэраг аўтараў датуе згаданыя культурныя працэсы рознымі перыядамі жалезнага веку. Аднак дакладна вядома, што першай несумненнай славянскай культурай была **пражская культура.**

*Арэал культуры* ахопліваў тэрыторыю ад Эльбы да правабярэжжа Сярэдняга Падняпроўя і ад Пабужжа да адгор’яў Альп. На тэрыторыі Беларусі помнікі пражскай культуры адзначаюцца на ўчастку ад Брэста ла Мозыра.

*Час існавання культуры* – IV–VII ст.

*Паселішчы.* Асноўны тып паселішчаў – неўмацаваныя паселішчы (селішчы). Яны размяшчаліся “гнёздамі” – па 2–4 у групе. Зрэдку сустракаюцца гарадзішчы, якія выкарыстоўваліся ў якасці сховішчаў. На тэрыторыі Беларусі найбольш вядомым помнікам з’яўляецца Хотамельскае гарадзішча, умацаванае валамі. Паселішчы звычайна вельмі бедныя: сустракаецца кераміка, і толькі ў адзінкавых выпадках – прасліцы, наканечнікі стрэл.

Асноўны тып жытла – паўзямлянкі зрубнай канструкцыі плошчай каля 8–16 м². Пабудовы ацяпляліся пячамі з гліны і камянёў. На селішчы Востраў Пінскага раёна была знойдзена печ, выкладзеная жалезным шлакам. Побач з жытламі размяшчаліся гаспадарчыя аб’екты: ямы-зернясховішчы, агароджы і інш.

*Пахавальныя помнікі* прадстаўлены двума відамі: курганнымі і грунтовымі. Часцей сустракаюцца грунтовыя пахаванні па абраду

крэмацыі. Рэшткі трупаспалення ссыпаліся ў урну альбо на дно пахавання. Інвентар вельмі бедны, прадстаўлены выключна керамікай.

*Кераміка.* Вядомы ляпны посуд, прадстаўлены пераважна гаршкамі. Радзей сустракаліся патэльні, міскі, мініяцюрныя пасудзіны. Посуд неарнаментаваны. Параўнальна частай знаходкай на помніках пражскай культуры з'яўляюцца т.зв. "хлябцы" – круглыя, сплюшчаныя з двух бакоў вырабы са слабаабпаленай гліны. Археолагам, як правіла, яны трапляюцца ў развалах печаў. Не вядома, для чаго гэтыя "хлябцы" выкарыстоўваліся. Некаторыя даследчыкі лічаць іх культавымі прадметамі, а некаторыя – проста неабходным будаўнічым элементам пячной канструкцыі.

*Прылады працы* нешматлікія. Усе яны вырабленыя з жалеза. Выкарыстоўваліся нажы, сякеры, пілы, сярпы, шылы, рыдлёўкі. *Зброя* прадстаўлена нешматлікімі экзэмплярамі ўтулкавых і чаранковых наканечнікаў стрэл, наканечнікамі дроцікаў. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі* былі мясцовай вытвочасці і імпартныя (візантыйскія). Яны прадстаўлены фібуламі, спражкамі, завушніцамі, пацеркамі.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадаркі складала земляробства і жывёлагадоўля. У паўднёвых раёнах земляробства было ворным, у паўночных – падсечным. Вырошчвалі пшаніцу, жыта, проса і інш. зернавыя, бабовыя і тэхнічныя культуры. Гадавалі буйную рагатую жывелу, свінняў, коз, авечак і каней. Насельніцтва займалася чорнай і каляровай металургіяй, аб чым сведчаць знаходкі адпаведных прыладаў (разнастайныя ліцейныя формы, льячкі і г.д.). На занняткі ткацтвам указваюць знаходкі прасліц.

*Праблема паходжання культуры* дакладна не вырашана. Большасць вучоных звязваюць яе генэзіс з пшэворскай культурай – культурай, якая ў папярэднюю эпоху існавала на тэрыторыі Вісла-Одэрскага рэгіёна. Некаторыя польскія археолагі спрабуюць знайсці вытокі пражскай культуры на ўсходзе, у асяроддзі носьбітаў кіеўскай культуры.

*Праблема этнічнай прыналежнасці.* Пражская культура – першая даставерная культура славян (яна атаясамліваецца са склавенамі).

*Гістарычныя лёсы.* На аснове пражскай культуры склаліся многія славянскія культуры канца І тыс. н.э.

На заключным этапе свайго існавання пражская культура трасфармавалася ў **Лука-Райкавецкую культуру**, якая атрымала назву па ўрочышчу Лука ля в. Райкі ў Жытомірскай вобл. Гэта культура існавала ў канцы VII – X ст. н.э. і займала прыкладна той жа арэал, што і яе

папярэдніца. Новай культуры былі ўласцівы ўсе асноўныя адзнакі, якія сфарміраваліся ў пражскай культуры.

Падабенства фіксуецца ў тыпах паселішчаў, домабудаўніцтве. Былі шырока распаўсюджаны паўзямлянкі, сустракаліся наземныя пабудовы. Жытлы ацяпляліся глінабітна-каменнымі пячамі.

Узводзіліся грунтовыя і курганыя могільнікі. Пахавальны абрад – крэмацыя. Кальцынаваныя косткі змяшчалі ў урну ці ссыпалі на дно ямы. Пахавальны інвентар, за выключэннем абломкаў посуду, адсутнічаў.

Аснову глінянага посуду складаў ляпны гаршок. Толькі ў самым канцы існавання культуры з’явіліся пасудзіны, якія былі зроблены на ручным ганчарным коле. Яны мелі лінейна-хвалісты арнамент.

Другой буйной археалагічнай культурай V–VII стст. была **пянькоўская культура,** носьбітаў якой звычайна атаясамліваюць з іншай буйной групоўкай славянскіх плямёнаў – антамі. *Арэал культуры* ахопліваў міжрэчча Дняпра і Днястра, ніжняе і Сярэдняе Падунаўе, частку Балгарыі і Венгрыі.

*Паселішчы* – неўмацаваныя (селішчы), якія лакалізаваліся на берагах малых рэк. Яны размяшчаліся групамі па 6–10 у кожнай. Адзіным тыпам жытла ў пянькоўскай культуры была паўзямлянка. Сцены маглі быць як слупавай, так і зрубнай канструкцыі. Пабудовы ацяпляліся печамі-каменкамі. *Пахавальныя помнікі* прадстаўлены грунтовымі магільнікамі з трупаспаленнем. Рэшткі крэмацыі змяшчаліся ў ямы ці ўрны. Пахавальны інвентар адсутнічаў.

*Кераміка.* На большасці паселішчаў быў знойдзены шматлікі ляпны посуд, пераважна гаршкі. Зрэдку сустракалася і ганчарная кераміка: гаршкі, збаны, міскі.

Адной з характэрных асаблівасцей пянькоўскай культуры з’яўляецца вялікая колькасць скарбаў ювелірных вырабаў. Найбольш выдатны скарб быў знойдзены каля в. Мартынаўка на р. Рось. У ім было каля сотні сярэбраных вырабаў: завушніцы, скроневыя кольцы, бранзалеты, пальчатая фібула, шматлікія паясныя бляшкі, дзве сярэбраныя чашы з візантыйскімі клеймамі, 9 фігурак людзей і стылізаваных жывел.

## 2. Старажытнасці балтаў другой паловы I тыс. н.э.

Усходнімі і паўночнымі суседзямі насельніцтва пражскай культуры былі плямёны калочынскай, банцараўскай, тушамлінскай культур. Яны блізкія паміж сабой, аднак маюць і пэўныя адрозненні. Калочынскую,

банцараўскую, тушамлінскую культуры звычайна адносяць да этнакультурнай супольнасці балтаў.

**Калочынская культура.** Назва паходзіць ад гарадзішча каля в. Калочын Рэчыцкага раёна.

*Арэал культуры* – басейн рэк Дзяснна, Сейм, Гомельскае, Магілёўскае і Аршанскае Падняпроўе. *Час існавання культуры* – V–VII ст.

*Паселішчы.* Асноўны тып пасяленняў – невялікія селішчы (плошчай да 1,5 га), размешчаныя на рачных тэрасах і поймавых узвышшах. Многія селішчы існавалі непрацяглы перыяд часу. Нешматлікія гарадзішчы выконвалі функцыі абшчынна-племянных цэнтраў і сховішчаў. У Беларусім Падняпроўі адкрыты гарадзішчы-свяцілішчы. Яны былі акруглыя ў плане, малой плошчы (дыяметр каля 40 м), амаль без знаходак.

На паселішчах будаваліся заглыбленыя ў зямлю чатырохвугольныя ў плане жытлы. Канструкцыя сцен – зрубавая і слупавая. Для абагрэву служылі ачагі, печы-каменкі і печкі-каміны.

*Пахавальныя помнікі* – грунтовыя і курганныя. Пахаванні здзяйснялі па абраду крэмацыі. Крэмацыі адбываліся па-за межамі некропаля, у магілу ссыпалі толькі ачышчаныя ад попелу кальцынаваныя косткі. Пахавальны інвентар, як правіла, адсутнічаў.

*Кераміка* – грубая ляпная, зрэдку выкарыстоўваўся глянцаваны посуд. Асноўны тып посуду – гаршкі, вядомы таксама міскі, патэльні. Кераміка неарнаментаваная.

*Прылады працы* прадстаўлены жалезнымі нажамі, сярпамі, сякерамі, косамі, долатамі, рыбалоўнымі кручкамі, каменнымі зерняцёркамі, асялкамі; глінянымі праселкамі. *Зброя* сустракаецца вельмі рэдка, яна прадстаўлена нешматлікімі экзэмплярамі ўтулкавых наканечнікаў стрэл, наканечнікаў дроцікаў. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі* – паясныя наборы, фібулы, падвескі, шкляныя пацеркі і інш.

*Гаспадарка.* Насельніцтва займалася падсечным земляробствам. На гарадзішчы Калочын было знойдзена спаленае зерне проса і чачавіцы. Значная роля таксама належала жывёлагадоўле, лясным, рачным і хатнім промыслам, апрацоўцы чорнага і каляровага металу.

*Паходжанне* калочынскай культуры звязваецца з папярэдняй – кіеўскай культурай. *Гістарычныя лёсы.* Заняпад культуры быў выкліканы рассяленнем славянскага насельніцтва. *Праблема этнічнай прыналежнасці.* Большасць даследчыкаў адносіць культуру да балцкіх старажытнасцяў.

**Банцараўская культура.** Назва паходзіць ад гарадзішча Банцараўшчына пад Мінскам.

*Арэал культуры* – Верхняе Падняпроўе, Верхняе Панямонне, Верхняе і Сярэдняе Падзвінне. *Час існавання культуры* – V–VIII ст.

*Паселішчы***.** Асноўны тып пасяленняў – селішчы, размешчаныя на рачных тэрасах і поплаўных узвышшах. Шмат селішчаў размяшчалася каля гарадзішчаў папярэдніх часоў, якія дадаткова ўмацоўваліся валамі і пераўтвараліся ў гарадзішчы-сховішчы. Жытлы будаваліся наземныя і паўзямлянычныя. Паўзямлянкі мелі зрубную канструкцыю, наземныя пабудовы былі слупавой канструкцыі. Унутры жытлаў размяшчаліся печы-каменкі круглай альбо авальнай формы, каля дамоў знаходзіліся ямы-скляпы, верагодна, калектыўнага карыстання.

*Пахавальныя помнікі.* Вядомы выключна грунтавыя могільнікі з трупаспаленнем. Крэмацыі адбываліся па-за межамі некропаля, у магілу ссыпаліся толькі ачышчаныя ад попелу кальцынаваныя косткі. Пахавальны інвентар, як правіла, адсутнічаў.

*Кераміка.* Выраблялiся пласкадонныя ляпныя гаршкі разнастайных форм – рабрыстыя, слоікападобныя і інш. Посуд неарнаментаваны.

*Прылады працы і зброя.* Прылады працы прадстаўлены сякерамі, нажамі, косамі, шыламі і інш. Характэрным для банцараўскай культуры былі нажы с валютападобнымі навершамі. Зброя сустракалася рэдка, найбольш частай знаходкай былі ўтулкавыя наканечнікі дзідаў і стрэл. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі,* як правіла, выраблялі з бронзы. Вядомы падвескі, пранізкі, бранзалеты, пярсцёнкі.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадаркі складала падсечнае земляробства і жывёлагадоўля. Вырошчвалі пшаніцу, жыта, ячмень, авёс, бабовыя. Разводзілі буйную і дробную жывёлу, свіней. Палявалі на дзіка, мядзведзя, зайца, лісіцу і інш.

*Праблема паходжання.* Згодна з распаўсюджаным меркаваннем, банцараўская культура сфарміравалася ў выніку пранікнення ў паўночную Беларусь, у асяроддзе днепра-дзвінскай культуры, носьбітаў кіеўскай культуры. *Гістарычныя лёсы***.** Заняпад культуры быў выкліканы рассяленнем славянскага насельніцтва. *Праблема этнічнай прыналежнасці*. Большасць даследчыкаў адносіць банцараўскую культуру да балцкіх старажытнасцяў.

**Тушамлінская культура** атрымала назву ад гарадзішча ля в. Тушамля. *Арэал* гэтай культуры ахопліваў Смаленскае Падняпроўе і Полацка-Віцебскае Падзвінне. *Час існавання* – V–VIII ст.

*Паселішчы.* Найбольш шматлікі тып паселішчаў – селішчы, на якіх узводзілі наземныя слупавыя дамы. Жытлы ацяпляліся ачагамі, якія былі зроблены з камянеў ці абкладзены глінай. Зрэдку ўзводзіліся гарадзішчы, яны служылі ў якасці сховішчаў. Найбольш поўна вывучана гарадзішча Тушамля. Гэта было невялікае мысавае гарадзішча, абароненае двумя зямлянымі валамі з драўлянымі частаколамі. Яшчэ тры такія лініі абарончых збудаванняў прыкрывалі напольны бок. Па перыметру пляцоўкі была выяўлена шматкамерная пабудова слупавай канструкцыі. Цікавай асаблівасцю гарадзішча з'яўлялася ўладкаванне ў яго мысавай часцы паганскага свяцілішча. Яно ўяўляла сабой кола слупоў з антрапаморфнымі выявамі – верагодна, выявамі багоў. Яшчэ адзін слуп знаходзіўся ў цэнтральнай частцы пляцоўкі. Магчыма, ён ўвасабляў сабой галоўнае бажаство.

*Пахавальныя помнікі* культуры прадстаўлены грунтовымі магільнікамі з трупаспаленнем. Інвентар у пахаваннях сустракаецца вельмі рэдка (аплаўленыя ўпрыгожванні з бронзы, дэталі вопраткі і г.д.).

*Кераміка* прадстаўлена ляпнымі гаршкамі цюльпанападобнай, формы, а таксама міскамі.

*Прылады працы і зброя.* Прылады працы прадстаўлены сякерамі, нажамі, косамі, шыламі, крэсівамі і інш. Зброя сустракалася рэдка, найбольш частай знаходкай былі наканечнікі дзідаў і стрэл. Вядомы знаходкі шпор. *Упрыгожанні і дэталі вопраткі,* як правіла, выраблялі з бронзы. Вядомы падвескі, пранізкі, бранзалеты, пярсцёнкі, спражкі, фібулы.

*Гаспадарка.* Аснову гаспадаркі складала падсечнае земляробства і жывёлагадоўля. Вырошчвалі пшаніцу, жыта, ячмень, авёс, бабовыя. Разводзілі буйную і дробную жывёлу, свіней. Палявалі на дзіка, мядзведзя, зайца, лісіцу і інш.

*Праблема паходжання.* Згодна з распаўсюджаным меркаваннем, культура сфарміравалася на аснове днепра-дзвінскай культуры з уключэннем элементаў культуры штрыхаванай керамікі і кіеўскай культуры. *Гістарычныя лёсы***.** Заняпад культуры быў выкліканы рассяленнем славянскага насельніцтва. *Праблема этнічнай прыналежнасці.* Большасць даследчыкаў адносіць банцараўскую культуру да балцкіх старажытнасцяў.

## 3. Усходнеславянскія саюзы пляменаў і іх суседзі

У другой палове I тыс. н.э. на тэрыторыі Усходняй Еўропы адбывалася фарміраванне саюзаў пляменаў ці нават протанароднасцей, што знайшло адлюстраванне ў летапісах. Прыкладную лакалізацыю гэтых усходнеславянскіх груп адзначыў летапісец Нестар, аднак больш дакладныя межы іх рассялення былі вызначаны значна пазней, у выніку правядзення вялікай колькасці археалагічных даследванняў. Яшчэ ў канцы XIX ст. вядомы рускі археолаг А.А. Спіцын паказаў, што для большасці саюзаў пляменаў былі характэрны асаблівыя скроневыя ўпрыгожванні. Гэта думка аб існаванні вызначальных прыкмет была падтрымана шматлікімі (хаця і не ўсімі) навукоўцамі.

Аднім з самых паўночных усходнеславянскіх племенных аб’яднанняў былі **славене наўгародскія**, этнавызначальнай адзнакай якіх з’яўляюцца ромбашчытковыя скроневыя кольцы. Асноўны арэал іх – Прыільменне. Найбольш старажытным помнікаў славенаў лічаць сопкі, побач з якімі звычайна знаходзіліся селішчы. Гэтыя неўмацаваныя пасёлкі размяшчаліся па берагах рэк і азер, у месцах, найбольш спрыяльных для заняткаў падсечным земляробствам, жывелагадоўляй. Жытлы прадстаўлялі сабой зрубныя пабудовы з печамі-каменкамі. У VIII–IX стст. у славен з’явіліся гарадзішчы. Найбольш раннім з іх была Старая Ладага, сярод жыхароў якой сустракаліся як славене, так і прыбалтыйскія фіны. Іншым буйным гарадзішчам славен было Рурыкава гарадзішча ў Ноўгарадзе, якое знаходзілася ў самым цэнтры вобласці рассялення славен. Гэта было значнае гандлёва-рамеснае і ваенна-адміністратыўнае паселішча.

Паўднёвымі суседзямі славен былі **крывічы.** Гэта аб’яднанне ўсходнеславянскіх плямёнаў, якое жыло ў басейне Верхняга Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, на поўдні Чудскага возера. Крывічы неаднаразова ўзгадваліся ў пісьмовых крыніцах.

Дагэтуль дакладна не вызначана, ад чаго паходзіць назва: 1) ад слова “крэўныя”; 2) ад імя легендарнага родапачынальніка Крыва; 3) ад імя легендарнага балцкага язычніцкага першасвятара Крыва-Крывэйтэ; 4) ад узгоркавай (“крывой”) мясцовасці.

Спецыфічнай рысай крывічоў з’яўляюцца бранзалетападобныя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі.

Агульнае племянное аб’яднанне крывічоў даследчыкі падзяляюць на 3 групы: полацкую, смаленскую і пскоўскую (паводле назвы галоўнага для кожнай групы горада).

На тэрыторыі рассялення полацкіх крывічоў археолагамі вывучаліся гарадзішчы і селішчы, курганныя могільнікі.

Для полацкіх крывічоў характэрна культура доўгіх курганаў, у якой захаваліся шматлікія балцкія рысы. У V–IX ст. крывічы будавалі доўгія курганы (насып даўжынёй да 30 м, звычайна 10–20 м). Пахаванні здзяйсняліся па абраду крэмацыі. Кальцынаваныя косткі ссыпаліся ў ўрны альбо ў ямкі. У верхняй частцы насыпу змяшчалася перавернутая дагары пасудзіна. Як правіла, інвентар быў бедны (абломкі посуду) альбо ўвогуле адсутнічаў. Толькі адзінкавыя пахаванні змяшчалі шматлікія ўпрыгожанні.

У IX ст. у крывічоў з'явіліся круглыя альбо паўсферычныя ў плане курганы. Для курганных могільнікаў крывічоў характэрна скучанае размяшчэнне пахавальных насыпаў. Колькасць курганоў у могільніках розная (ад некалькіх дзесяткаў да 1–2 сотень). Курганныя насыпы часта былі акальцаваныя ровікамі рознай шырыні і глыбіні з некалькімі перамычкамі. Мяркуюць, што гэтыя ровікі мелі рытуальнае значэнне. Першапачаткова пахаванні здзяйсняліся па абраду крэмацыі. Трупаспаленне адбывалася на адлегласці ад могільніка. Рэшткі крэмацыі збіраліся і размяшчаліся ў насыпу, ямцы ці на мацерыку. Пахаванні былі бязурнавыя і ўрнавыя. Большасць курганных пахаванняў крывічоў гэтага часу бедныя на інвентар ці ўвогуле не маюць яго. У магілах трапляюцца толькі асобныя расплаўленыя рэчы (перадусім упрыгожанні), а таксама фрагменты ляпной і кругавой керамікі.

На мяжы X–XI ст. з'явіліся першыя пахаванні па абраду трупапакладання. У пачатку XI ст. інгумацыя трывала распаўсюдзілася на крывіцкай зямлі. Першапачаткова насып узводзілі непасрэдна над целам памерлага (у найбольш ранніх курганах па абраду трупапакладання зафіксаваны і рытуал ачышчэння агнём пахавальнага месца). Пазней пахаванні адбываліся у ямах. Найбольш характэрны пахавальны абрад – трупапакладанне на спіне ў выцягнутым стане.

У гэты час пахавальны інвентар быў багатым. У мужчынскіх пахаваннях знаходзяць зброю, дэталі паясных набораў, у жаночых – бранзалетападобныя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі, разнастайныя бранзалеты, падвескі, пярсцёнкі, пацеркі і інш. У пахаванні часта змяшчалі посуд, драўляныя вёдры, язычніцкія амулеты з прасвідраваных іклаў.

У VIII ст. у зямлі крывічоў з'явіліся гарадзішчы. Племянным цэнтрам пскоўскіх крывічоў быў Ізборск. Па перыметру пляцоўкі гарадзішча былі пабудаваны наземныя зрубныя жытлы. Цэнтральная

частка пляцоўкі была прызначаная для пляменных сходаў, культавых і інш. мерапрыемстваў. У IX ст. ўмацаваныя паселішчы існавалі і ў полацкіх крывічоў. На аснове гэтых паселішчаў узніклі такія гарады, як Полацк (862 г.), Віцебск, Лукомль.

Працэс фарміравання крывічоў адбываўся ў другой палове I – пачатку II тыс. н.э. у выніку асіміляцыі славянамі мясцовых балцкіх плямён. Аднак пытанне аб паходжанні крывічоў канчаткова не вырашанае. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што крывічы маюць заходняе паходжанне і роднасныя славянам Вісла-Одэрскага міжрэчча.

**Дрыгавічы**. Гэта аб’яднанне ўсходнеславянскіх плямёнаў, якое ў IX – XIII ст. жыло на тэрыторыі паўднёвай, заходняй і цэнтральнай Беларусі – паміж Прыпяццю і Дзвіной. Дрыгавічы неаднаразова ўзгадваюцца ва ўсходнееўрапейскіх летапісах і нават у візантынскай крыніцы.

Назва “дрыгавічы”, верагодна, паходзіць ад слова “дрыгва” (балота – найбольш характэрная прыкмета мясцовасці).

У якасці этнавызначальнай адзнакі дрыгавічоў разглядаюцца вялікія медныя альбо срэбраныя пацеркі, аздобленыя зерню (напаянымі на паверхню дробнымі па памерах срэбранымі шарыкамі), а таксама дротавыя скроневыя кольцы, на якіх замацаваны па тры невялікія металічныя пацеркі.

На тэрыторыі рассялення дрыгавічоў захаваліся гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі. Менавіта курганныя могільнікі з’яўляюцца найбольш даследаванай катэгорыяй помнікаў дрыгавічоў. Могільнікі складаюцца з 20 – 40, радзей каля 100 курганаў. Курганы маюць насыпы круглай формы, у іх падножжах прасочваюцца кругавыя ровікі. Пахаванні здзяйсняліся па абраду і крэмацыі, і інгумацыі (трупапакладання). Колькасна пераважаюць курганы з трупапакладаннем.

Пры правядзенні абраду крэмацыі спаленне цела памерлага адбывалася як непасрэдна на месцы пабудовы насыпу, так і ў іншым месцы. Абыходзіліся з кальцынаванымі косткамі па-рознаму: іх змяшчалі ў урну, проста ссыпалі на мацерыковую паверхню альбо ў насып.

Пры здзяйсненні трупапакладання нябожчыка хавалі ў труне ў звычайнай падкурганнай яме альбо ўзводзілі над памерлым спецыяльныя зрубныя пабудовы. Парэшткі памерлых маглі таксама размяшчаць непасрэдна пад насыпам ці нават у ім.

Звычайна ў кургане хавалі аднаго нябожчыка, аднак вядомы і падвойныя пахаванні: мужчынскія, жаночыя і змешаныя. Памерлага размяшчалі на спіне, галавой на захад.

Пахавальны інвентар параўнальна бедны, часта ўвогуле адсутнічае. У пахаваннях знаходзяць гаршкі, спражкі, крэсівы, сякеры, нажы, драўляныя вёдры. У мужчынскіх пахаваннях выяўляюць баявыя і гаспадарчыя сякеры, наканечнікі коп'яў і стрэлаў, калачападобныя крэсівы. У жаночых пахаваннях знаходзяць сярпы, нажніцы, праселкі, а таксама шматлікія ўпрыгожанні. Найбольш распаўсюджаная катэгорыя – разнастайныя пацеркі (металічныя, каменныя, бурштыновыя, шкляныя). Як адзначалася, буйназярнёныя бронзавыя ці срэбныя пацеркі, якія часта сустракаюцца ў жаночых пахаваннях, лічацца этнавызначальнай прыкметай дрыгавічоў.

Згодна з распаўсюжаным меркаваннем, дрыгавічы сфарміраваліся на мясцовай аснове – лакальнай групе помнікаў культуры Лукі-Райкавецкай, пражскай культуры, якія былі адасобленыя вялікімі і цяжка праходнымі багнамі. Да IX ст. дрыгавічы жылі на правабярэжжы Прыпяці. У IX ст. пачалася дрыгавіцкая каланізацыя левабярэжных прытокаў Прыпяці. Рассяленне дрыгавічоў ішло двумя шляхамі: 1) па рэках Брагінка – Днепр – Бярэзіна; 2) па левых прытоках Прыпяці: Лані, Пцічы, Случы. Паступова адбываліся працэсы асіміляцыі мясцовых балцкіх плямён прыхаднямі-славянамі.

Дрыгавічы належалі да ліку найбольш развітых усходнеславянскіх плямёнаў, якія мелі сваё “княжанне” яшчэ да ўключэння ў склад Кіеўскай Русі. Займаліся земляробствам, агародніцтвам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам, прадзеенем і ткацтвам. Доказам выслкага ўзроўню эканамічнага і сацыяльага развіцця дрыгавічаў з’яўляецца ранняе ўзнікненне гарадоў (Тураў, Бярэсце, Пінск і г.д.). Племянным цэнтрам з’яўляўся г. Тураў (упершыню ўзгадваецца ў летапісу ў 980 г.)

Усходнімі суседзямі дрыгавічоў былі **радзімічы.** Гэта аб’яднанне ўсходнеславянскіх плямёнаў, якое жыло ў міжрэччы Дняпра і Дзясны па цячэнні Сажа і яго прытокаў. Папярэднікамі радзімічаў з’ўляліся носьбіты калочынскай і раменскай культур.

Паводле летапісу, назва паходзіць ад імя легендарнага ваяра Радзіма, які прывёў плямёны з заходніх (ляшскіх) зямель. Аднак меркаванне аб сувязі радзімічаў і палякаў сёння даследчыкамі не падтрымліваецца. Згодна з дамінуючымі ўяўленнямі, радзімічы прыйшлі ў Пасожжа з тэрыторыі Верхняга Паднястроўя.

Характэрныя племянныя адзнакі радзімічаў – бронзавыя альбо срэбныя сяміпрамянёвыя і сямілапчастыя скроневыя кольцы.

На тэрыторыі рассялення радзімічаў захаваліся гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі. Найбольш шматлікія і даследаваныя археалагічныя помнікі – курганныя могільнікі.

Могільнікі налічвалі ад некалькіх курганаў да 200 і болей насыпаў. Курганныя насыпы былі круглай альбо паўсферычнай формы. У VIII–X ст. пахаванні здзяйсняліся па абраду трупаспалення, у канцы X – XII ст. – па абраду трупапакладання. Пахаванні па абраду трупаспалення нешматлікія. Крэмацыя адбывалася непасрэдна ў кургане на невялікай падсыпцы альбо ў яго аснаванні. Трупапакладанне здзяйснялася альбо ў насыпу кургана, альбо ў яго аснаванні (найбольш распаўсюджаныя), альбо ў падкурганнай яме. Характэрнай рысай радзіміцкіх курганоў з'яўляецца наяўнасць попельна-вугальнай праслойкі ў форме "вогненнага кола", у цэнтр якой і клалі нябожчыка. Пераважаюць пахаванні з заходняй арыенціроўкай, сустракаюцца таксама пахаванні з усходняй арыенціроўкай касцякоў. У курганах трапляюцца нешматлікія знаходкі касцей жывёл: быка, каровы, каня, птушак.

Пахавальны інвентар радзіміцкіх пахаванняў быў вельмі багатым. У магілах знаходзяць шмат упрыгожанняў, прадметаў хатняга побыту. Для мужчынскіх пахаванняў характэрны дэталі паяснога набору, радзей зброя. У жаночых пахаваннях знаходзяць бранзалеты, скроневыя кольцы, спражкі, пацеркі і г.д. У пахавальны інвентары радзімічаў у большай ступені, чым у іншых груп усходніх славян, захаваліся балцкія элементы: шыйныя грыўны, зоркападобныя (прамянёвыя) спражкі, касцяныя прывескі ў выглядзе качак, зааморфныя бранзалеты.

Першыя летапісныя звесткі аб гарадах радзімічаў (Крычаў, Прапойск (суч. Слаўгарад), Гомель, Рагачоў і інш.) адносяца да XII ст. Найбольш верагодым племянным цэнтрам радзімічаў з'яўляўся Гомель. Даследаванні Гомеля паказалі, што ён існаваў ужо ў X–XI ст. і быў добра ўмацаваным цэнтрам.

Асновай гаспадаркі радзімічаў з'яўлялася сельская гаспадарка. Былі добра развітыя разнастайныя рамёствы. Радзімічы вялі ажыўлены гандаль з суседнімі і аддаленымі рэгіёнамі (тэрыторыямі Візантыі, сучаснай Германіі, Скандынавіі).

Усходнімі суседзямі радзімічаў і крывічаў былі **вяцічы.** Для гэтага племяннога саюза, якое займала басейн Акі, было характэрна выкарыстанне такіх упрыгожанняў, як сямілапасныя скроневыя кольцы.

Кіеўскае Падняпроў'е належала **палянам** – аднаму з буйнейшых усходнеславянскіх аб'яднанняў. У палянаў адступнічалі спецыфічныя

ўпрыгожванні, што ўскладняе вызначэнне дакладных межаў іх рассялення. Некаторыя даследсыкі мяркуюць, што зямля палянаў уключала ў сябе тэрыторыю Сярэдняга Падняпроў'я. Фарміраванне палянаў адбывалася на мясцовай аснове – Лука-Райкавецкай культуры. Паляне першымі са славянскіх пляменаў сталі называцца "руссю". Палянам належалі Кіеў, Вышгарад, Васіллеў і Белгарад.

У адрозненне ад іншых рэгіёнаў Беларусі, дзе жыло пераважна аднаэтнічнае насельніцтва, тэрыторыя Беларускага Панямоння была заселеная не толькі славянскімі, але і балцкімі плямёнамі (літоўскімі і яцвяжскімі).

У IV – XII ст. тэрыторыю сярэдняга цячэння Нёмана да вярхоўяў р.Швянтойі на поўначы, воз.Свір на ўсходзе і басейна р.Мяркіс на поўдні засялялі носьбіты **культуры ўсходнелітоўскіх курганаў.** У Беларусі ўсходнелітоўскія курганы сканцэнтраваны галоўным чынам у вярхоўях р.Вілія і на правабярэжжы Нёмана. Культура ўсходнелітоўскіх курганоў існавала ў IV–XIII ст.

Курганныя могільнікі размешчаны каля рэк альбо азёраў. Як правіла, могільнікі складаліся з прыкладна 20 курганаў, зрэдку колькасць насыпаў дасягала 100 і болей. Курганныя насыпы мелі круглую ў плане форму. У аснаванні курганоў часта прасочваліся вянцы з камянёў розных памераў, ямы ці неглыбокія равы.

Для найбольш ранніх усходнелітоўскіх курганаў (IV–V ст.) характэрна інгумацыя. Нябожчыкаў клалі ў падкурганную грунтовую яму. Касцякі размяшчаліся на спіне ў выцягнутым стане, галава была арыентаваная на захад. Пахавальны інвентар быў прадстаўлены ўпрыгожаннямі (характэрнымі для балцкіх плямёнаў шыйнымі грыўнамі, фібуламі, шклянымі пацеркамі, падковападобнымі падвескамі і г.д.), прыладамі працы (сярпы, серпападобныя нажы, праселкі і нажы). У магілу змяшчалі і прадметы ўзбраення (наканечнікі дзідаў, умбоны шчытоў, сякеры).

У V ст. абрад трупапакладання змяніўся абрадам трупаспалення (крэмацыя). Крэмацыя нябожчыкаў адбывалася ў баку ад месца пахавання. Рэшткі спальвання (косткі, пахавальны інвентар, часам вуглі) змяшчалі ў грунтовых ямах, а часцей ссыпалі ў аснаванні курганоў альбо ў насыпах. Пахавальны інвентар, звычайна пашкоджаны агнём, складаўся з прадметаў побыту, упрыгожанняў, узбраення.

У канцы VIII – IX ст. насыпы пачалі акружаць не каменнымі вянцамі, а ямамі альбо неглыбокімі ровамі. Змяніўся склад інвентару: зброю

змяшчалі толькі ў багатых пахаваннях. Шырокае распаўсюджанне атрымаў абрад пахавання каня. Спаленыя ці неспаленыя парэшткі каня звычайна хавалі асобна ад чалавека, як у аснаванні кургана альбо яго насыпу, так і ў падкурганнай яме. Інвентар такіх пахаванняў складаўся з прадметаў конскай вупражы.

Своеасаблівай рысай культуры ўсходнелітоўскіх курганаў з’яўляецца малалікасць керамікі ў пахаваннях.

Культура ўсходнелітоўскіх курганаў адносіцца да кола балцкіх культур. Аднак сучасныя даследчыкі не маюць адзінага меркавання аб тым, якім непасрэдна літоўскім плямёнам належалі згаданыя помнікі: літве, аўкштайтам ці аб'яднанням літоўскіх плямёнаў.

**Каменныя курганы** вядомыя на значнай тэрыторыі Усходняй Польшчы, паўднёва-заходняй Літвы і заходняй Беларусі – у Сярэднім і Верхнім Панямонні і Сярэднім Пабужжы. Каменныя курганы размяшчаліся па берагах рэк, на ўзвышшах. Іх насыпы былі складзены цалкам з камянёў альбо з камянёў і зямлі.

На мяжы IV – V ст. пануючым абрадам стала трупаспаленне. Рэшткі крэмацыі, як правіла, безурнавыя, яны змяшчаліся ў падкурганных ямах ці сярод камянёў насыпу. У пахаваннях пакідаўся інвентар: у мужчынскіх – прадметы ўзбраення і рыштунак баявога каня, у жаночых – перадусім прыгожанні і дробныя прылады працы (іголкі, гліняныя праселкі).

У XI ст. адбыўся пераход ад абраду трупаспалення да абраду трупакладання, які ўтрымліваўся да сярэдзіны XIII ст. Канструкцыя насыпаў не адрознівалася ад ранейшых збудаванняў. Нябожчыкаў клалі ў падкурганную яму на мацерыку і ў насыпе. Большасць шкілетаў размешчана ў выцягнутым стане на спіне. У жаночых пахаваннях інвентар прадстаўлены упрыгожаннямі, у мужчынскіх – узбраенннем, нешматлікімі прыладамі працы.

Сучасныя даследчыкі адзінадушна лічаць раннія каменныя курганы пахавальнымі помнікамі яцвяжскіх плямёнаў. Этнічная прыналежнасць насельніцтва, якое пакінула познія каменныя курганы, дакладна не вызначана.

З каменнымі курганымі звязаныя т.зв. каменныя магілы, якія ўзводзіліся ў XI–XIII ст. Гэтыя магілы прадстаўлялі сабой круглыя, авальныя альбо прамавугольныя ў плане збудаванні з камянёў, якія не вылучаліся над паверхняй. Пахаванні здзяйсняліся па абраду выцягнутага трупапакладання. У магілы змяшчалі багаты пахавальны інвентар. Для

мужчынскіх пахаванняў характэрны дэталі паяснога набору, радзей зброя. У жаночых пахаваннях знаходзяць разнастайныя ўпрыгожанні.

Каменныя магілы звязваюць з яцвягамі альбо нашчадкамі славяназаваных яцвягаў.

## ТЭМА 5. СТАРАЖЫТНАЯ РУСЬ (IX–XIII ст.) ПАВОДЛЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАНЫХ

### План

1. Узнікненне Русі паводле археалагічных даных
2. Старажытнаруская вёска
3. Старажытнарускі горад
4. Раннефеадальныя замкі (XII – XIII ст.)
5. Гандлёвыя сувязі старажытнарускага насельніцтва паводле археалагічных даных
6. Распаўсюджанне пісьменнасці паводле археалагічных даных
7. Рэлігійныя ўяўленні старажытнарускага насельніцтва паводле археалагічных даных
8. Манументальнае дойлідства старажытнарускіх гарадоў
9. Прыкладное мастацтва старажытнарускага насельніцтва паводле археалагічных даных

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 6.*

### 1. Узнікненне Русі паводле археалагічных даных

Адным з найбольш істотных чыннікаў эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага развіцця Старажытнай Русі з’яўляўся т.наз. “шлях з вараг у грэкі”, які звязваў паўночныя землі з Кіеўскім Падняпроў’ем і, такім чынам, аб’ядноўваў усе вобласці ўсходнеславянскіх пляменаў.

Першыя летапісныя ўзгадкі гэтага шляху звязаны з паходамі Аскольда і Дзіра ў 862 г. і Алега ў 882 г. Даследчыкі мяркуюць, што ў той час гэты шлях яшчэ дзейнічаў не пастаянна і не быў гандлёвым. Яго станаўленне адбылося ў X ст. Пераважная частка шляху пралягала па Дняпру. Пэўныя складанасці выклікала неабходнасць пераходу ад Заходняй Дзвіны да Дняпра. Найбольш вузкае месца паміж гэтымі рэкамі, перарэзанае дробнымі рэчкамі, адзначаецца каля в. Гнёздава Смаленскай вобл. Тут у старажытнасці знаходзіўся т.зв. “волак”. “Волакі”

функцыянавалі і ў іншых месцах. Яшчэ адзін шлях, які ў пэўнай ступені дубляваў шлях "з вараг у грэкі", пралягаў па Дзясне. Уздоўж гэтых шляхоў, на волаках ці непадалёк ад іх узнікалі паселеныя пункты, дзе пражывалі рамеснікі, гандляры, людзі, неабходныя для канваіравання і аховы караблёў і інш. . Некаторыя вучоныя лічаць, што гэтыя паселішчы прадстаўлялі сабой протагарадскія фарміраванні і з'яўляліся першапачатковымі месцамі такіх гарадоў, як Смаленск, Яраслаўль, Чарнігаў. Іншыя даследчыкі не згодныя з гэтым меркаваннем і сцвярджаюць, што паселішчы ў былі толькі заставамі, якія кантралявалі найбольш важныя шляхі.

Каля населеных пунктаў, натуральна, паступова ўтвараліся могільнікі. У той час памерлых хавалі пад курганнымі насыпамі. Гэтыя курганы ў археалагічнай літартуры называюць "дружыннымі". Аднак у гэтых курганах былі пахаваныя не толькі прафесійныя воіны (дружыннікі), але і звычайныя людзі – гандляры і інш. Змест назвы курганаў заключаецца ў тым, што гэтыя помнікі узніклі ў той час, калі ішло фарміраванне раннефеадальнай знаці, і роля дружыны ў гэтых працэсах была істотная.

Найбольш буйныя "дружынныя" курганы даследаваны пад Смаленскам, Яраслаўлем, Чарнігавам, Кіевам і інш. Самым вядомым з могільнікаў, у якіх сустракаюцца дружынныя курганы, з'яўляецца Гнёздаўскі комплекс на Дняпры недалека ад Смаленска. Гэта самае буйное скапленне курганаў Старажытнай Русі, якое ўключае каля 3 тыс. курганаў.

У пераважнай большасці дружынных курганаў пахаванне адбывалася па абраду крэмацыі. Толькі ў некаторых выпадках адначаюцца пахаванні з інгумацыяй.

Асноўная частка "дружынных" курганаў належала мясцоваму мірнаму насельніцтву. Толькі ў некаторых курганах знойдзена зброя, якая сведчыць аб тым, што ў гэтых курганах былі пахаваны дружыннікі – прадстаўнікі феадалізаванай знаці. Некаторыя рэчы, якія знаходзіліся ў пахаваннях, былі тыпова скандынаўскімі. Менавіта гэта і звязана з найбольш складанай і вострай праблемай, якая закранае дружынныя курганы, – праблемай паходжання дзяржавы на Русі.

Частка даследчыкаў, спасылаючыся на летапісы, у якіх гаворыцца аб закліканні варагаў на Русь, мяркуе, што і сама дзяржава была створана нарманамі. Пры гэтым яны ў якасці доказаў прыцягваюць і дружыныя курганы, у якіх сустракаюцца скандынаўскія рэчы і некаторыя адметнасці пахвальнага абраду. Скандынаўскім рытуалам лічыцца пахаванне ў ладдзі,

змяшчэнне жалезнай грыўны з малаточнамі бога Тора на рэшткі пахавальнага вогнішча ці урну, звычай утыкаць зброю ў рэшткі крэмацыі, а таксама жаночыя пахаванні з двумя шкарлупападобнымі фібуламі – абавязковай прыналежнасцю скандынаўскага жаночага ўбора. Такія пахаванні ёсць на Гнёздаўскім могільніку, аднак, як лічаць некаторыя спецыялісты, варагі маглі складаць не больш за 5% насельніцтва Гнёздава. Большасць рэчаў скандынаўскага паходжання фіксуецца пачынаючы з X ст., а варагі з’явіліся на Русі ў IX ст.

Вельмі часта прыхільнікі нарманскай тэорыі для абгрунтавання сваей пазіцыі прыцягваюць зброю, у першую чаргу мячы. У дружынных курганах знаходзяць т.зв “каралінгскія” мячы, якія дасягалі ў даўжыню 1 м. Цэнтрам вытворчасці такіх мячоў была Рэйнская вобласць (адсюль і назва зброі). Асноўная колькасць “каралінгскіх” мячоў знойдзена ў Скандынавіі, Францыі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, вядомы яны і ва усходнеславянскіх землях. Аднак сёння абгрунтавана, што вытворчаць мячоў каралінгскага тыпу вялася і ва Усходняй Еўропе: каля Міргарада, што пад Палтавай, знойдзены характэрны меч, на двух баках ляза якога былі клеймы рускага майстра: “Коваль” “Людоша”.

Акрамя мячоў, у дружынных курганах археолагі выяўляюць наканечнікі стрэл, наканечнікі коп’яў як ланцэтападобнай формы (скандынаўскі тып), так і ромбападобнай формы (усходнеславянскія). У пахаваннях фіксуюцца тыпова русскія шлемы-шышакі сфераканічнай формы, кальчуга (запазычаная рускім насельніцтвам ад стэпавых плямёнаў каля X ст.). У цэлым, як мяркуюць спецыялісты, зброя і абарончы комплекс “дружынных курганаў” не могуць сведчыць аб значнай ролі варагаў на Русі.

У адным з гнёздаўскіх курганоў была знойдзена пасудзіна тыпу амфары з надпісам “горушна” (гарчыца), якая датуецца першай чвэрцю X ст.  Гэта найбольш старажытны ўсходнеславянскі надпіс. У Скандынавіі ў гэты час існавала рунічнае пісьмо, якое рэзка адрозніваецца ад іншых алфавітаў.

На ўсходнеславянскай тэрыторыі няма ні воднага паселішча, якое было б заснавана скандынавамі.

Такім чынам, станаўленне сярэднявечнай Русі было абумоўлена развіццём самой славянскай культуры. Нейкая частка варагаў сапраўды асела на ўжо існуючых паселішчах, аднак яна хутка растварылася ў асяроддзі мясцовага насельніцтва.

## 2. Старажытнаруская вёска

Старажытная Русь была аграрнай краінай. Аснову яе эканомікі складала сельская гаспадарка. Паселішча, жыхары якога займаюцца пераважна сельскай гаспадаркай, называецца вёскай. Першапачаткова, пры першабытнаабшчынных адносінах, практычна ўсе паселішчы аседлых земляробаў і жывёлаводаў адносіліся да вёсак. Пасля аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі з агульнай масы паселішчаў пачалі вылучацца рамесна-гандлёвыя і адміністрацыйныя цэнтры, якія паступова пераўтвараліся ў гарады.

Па археалагічных матэрыялах гэтыя працэсы прасочваюцца ў VIII–IX ст. З гэтага часу вёскі становяцца спецыфічнымі паселішчамі, якія паводле свайго складу і функцый адрозніваюцца ад іншых населеных пунктах.

Вылучаюцца некалькі тыпаў сельскіх паселішчаў:

*Весь* – неўмацаванае паселішча вольных сялян.

*Сяло* – неўмацаванае паселішча асабіста залежных сялян.

*Пагост* – адміністрацыйны цэнтр.

У канцы I тыс. вёскі размяшчаліся на поймавых узвышшах і берагавых схілах рэк і азёр – г.зн. у месцах, найбольш прыдатных для заняткаў земляробствам. Памеры і формы вёсак былі разнастайныя (ад 1 тыс. да 45 тыс. га), але пераважалі невялікія і сярэднія вёскі плошчай да 3 тыс. га. З цягам часу памеры паселішчаў памяншаліся. Дамінавала бессістэмная забудова вёсак.

У VIII–IX ст. з’явіліся асобныя сялянскія двары-сядзібы. Характар забудовы, плаціроўка і памеры жытлаў (9–12 м$^2$) сведчаць аб тым, што малыя сем’і жылі паасобку, але вялі сумесную гаспадарку ў межах адной вялікай сям’і.

З канца X ст. да другой паловы XIII ст. колькасць вёсак павялічылася амаль у два разы. Рассяленне стала больш шчыльным, адбывалася адасабленне новых паселішчаў. Захоўвалася бессістэмная забудова, аднак паступова пачынала дамінаваць аднарадная забудова вёсак, калі хаты размяшчаліся ў адной лініі ўздоўж ракі.

У канцы XIII–XIV ст. пачалося асваенне сялянамі раней не занятых міжрэчных узвышшаў і водападзелаў, на якіх яшчэ існавалі некранутыя лясы. У гэты час будаваліся толькі маладворныя вёскі.

У розных рэгіёнах былі распаўсюджаны розныя тыпы жытлаў. На поўдні Беларусі ў VIII–IX ст. дамінавалі паўзямлянкі плошчай да 24 м$^2$. Паступова сяляне пачалі будаваць выключна наземныя хаты, а

паглыбленыя ў грунт пабудовы выкарыстоўваліся толькі ў гаспадарчых мэтах. Такое спалучэнне і паўзямлянак, і наземных жытлаў прасочвалася і на Панямонні. У паўночных і ўсходніх рэгіёнах дамінавалі наземныя жылыя пабудовы.

*Прылады працы.* Найбольш старажытнай прыладай для апрацоўкі глебы ва ўмовах існавання падсечна-агнявога земляробства лічыцца барана-сукаватка (зрубленая елка з буйнымі сучкамі), якая выкарыстоўвалася для рыхлення зямлі. У VIII–IX ст. пашырылася ўжыванне сахі, ляднае (падсечнае) земляробства паступова замянялася папаравай сістэмай. Старажытная саха была шматзубая, яна паступова замянялася адна- і двухзубымі прыладамі. Такія прылады былі найбольш зручнымі для апрацоўкі камяністых лясістых глебаў. У перыяд з канца X ст. да другой паловы XIII ст. значна пашырылася папаравая сістэма земляробства і карыстанне плугам. У гэты час развівалася рамяство, асабліва апрацоўка металаў і ювелірная справа. Знаходкі шматлікіх упрыгожанняў на археалагічных помніках сведчаць аб даволі высокім узроўні жыцця насельніцтва. У канцы XIII–XIV ст. адбывалася масавае распаўсюджанне плуга, трохполля. Аднак гаспадарчы прагрэс стрымліваўся такім фактарам, як пагаршэнне прыродных умоў (павышэнне вільготнасці і частыя паводкі). Для апрацоўкі зямлі выкарыстоўваліся таксама матыкі і рыдлёўкі.

Асноўнай прыладай для збору ўраджая быў серп. Па сваіх памерах, канструкцыі, тэхналагічным асаблівасцях старажытныя вырабы блізкія этнаграфічным і сучасным вырабам. Частай знаходкай з’яўляюцца косы-гарбушы.

Па археалагічны даных вызначана, што для апрацоўкі ўраджаю выкарыстоўваліся каменныя ручныя жорны ў выглядзе двух дыскаў з адтулінамі ў цэнтры; драўляныя ручныя ступы і нават нажныя ступы (былі знойдзены ў Мінску).

*Сельскагаспадарчыя культуры***.** Асноўнай збожжавай культурай, вядомай паўсюдна, з’ўлялася жыта. Другой па значэнні культурай была пшаніца. Збожжа было знойдзена пры раскопках як сельскіх, так і гарадскіх паселішчаў. У Полацку, Мінску, Гародні былі знойдзеныя зернейкі ячменя, проса, аўса. У Гародні было выяўлена зерне грачыхі. Бабовыя культуры прадстаўленыя гарохам, вікай, бабамі. Сярод тэхнічных культур вядомы лён і каноплі. Па старажытнарускіх пісьмовых крыніцах вядомы такія агародныя і садовыя культуры, як агуркі, гарбузы, капуста, буракі, морква, цыбуля, укроп, яблыкі.

*Жывёлагадоўля* займала значнае месца ў гаспадарчым жыцці вёскі. На помніках знаходзяць косткі свінні, дробнай і буйной рагатай жывёлы, лошадзі, сабакі. Гадавалі таксама птушку: курэй, утак, гусей. Косткі хатніх птушак былі знойдзены ў Ваўкавыску.

*Прысвойваючая гаспадарка.* Па археалагічных даных вызначана, што насельніцтва палявала на зуброў, туроў, ласей, дзікоў, мядзведзяў, баброў, зайцаў і інш. У Ваўкавыску былі знойдзены косткі дзікіх птушак. Значнае месца належала рыбнай лоўлі і бортніцтву (збору дзікага мёду). На помніках ў паўднёвай Беларусі былі выяўлены спецыяльныя нажы-медарэзкі.

*Сельскае рамяство*. Вядучая роля належала ганчарству. У канцы X ст. на поўдні, а ў XI ст. – ў паўночных раёнах Беларусі з’явілася ганчарнае кола. Вытворчасцю керамікі пачалі займацца мужчыны.

Важнай галіной рамяства з’яўлялася чорная металургія і металаапрацоўка. Кавалі атрымоўвалі крычнае жалеза не толькі для ўласных патрэбаў, але і пастаўлялі крыцы ў гарады. Сельскія майстры выраблялі ўсе неабходныя ў гаспадарцы рэчы.

Ювелірная справа прадстаўлена майстэрнямі па апрацоўцы бронзы, радзей срэбра. Сельскія ювеліры выраблялі разнастайныя падвескі, бранзалеты, пярсцёнкі, кольцы, упрыгожанні галавы і інш. Майстар забяспечваў сваёй прадукцыяй раён радыусам каля 10–15 км.

*Пахавальныя помнікі.* На працягу IX–XIII стст. у сельскай мясцовасці захоўваўся курганны абрад пахавання. У IX–X ст. пахаванні здзяйсняліся па абраду трупаспалення. Звычайна мужчынаскае пахаванне суправаджалася нажамі, спражкамі, ганчарнымі гаршкамі. Жаночыя пахаванні адрозніваюцца большай разнастайнасцю інвентару. Як правіла, у іх прысутнічаюць розныя ўпрыгожванні са срэбра, бронзы і шкла. У канцы X–пачатку XI ст. пачалося распаўсюджанне абраду трупапакладання, што было абумоўлена ўкараненнем хрысціянскіх традыцый. Па гэтай жа прычыне ў XII–XIII ст. пахаванні сталі здзяйсняцца ў падкурганных ямах, паступова павялічвалася колькасць безынвентарных пахаванняў.

## 3. Старажытнарускі горад

Горад – населены пункт, жыхары якога занятыя пераважна ў прамысловасці, гандлі, кіраванні, культуры. Гарады ўзніклі ў працэсе паглыблення грамадскага падзелу працы – аддзялення рамяства ад земляробства. Галоўная рыса феадальнага горада – канцэнтрацыя рамёстваў і абмену.

Аднак першапачаткова словам “горад” абазначалі любое ўмацаванае паселішча, якое не заўседы трансфарміравалася ва ўласнагарадское паселішча: гэта магла быць феадальная сядзіба, крэпасць і г.д. Найбольш старажытнымі гарадамі Старажытнай Русі з’яўляліся Кіеў, Ноўгарад, Смаленск, Белавозера, Ізборск, Полацк, Растоў Вялікі, Мурам і Ладага. Вызначальнымі рысамі сярэднявечнага горада з’яўляюцца:

- паведамленні аб горадзе у пісьмовых крыніцах як аб важным населеным пункце, цэнтры акругі;
- наяўнасць дзяцінца і пасада, плошча якога ў некалькі разоў перавышае плошчу дзяцінца;
- наяўнасць складанага ўнутрыгарадскога плана з элементамі добраўпарадкавання;
- узвядзенне манументальных свецкіх ці культавых пабудоў;
- пражыванне ў горадзе значнай колькасці гандлёва-рамеснага насельніцтва;
- наяўнасць у горадзе адміністратыўнага апарату. Тут чыніўся суд, сюды паступалі падаткі, тут выдаваліся законы.
- горад – гэта і цэнтр абароны, тут меліся ўзброеныя сілы (дружына), што забяспечвала нармальную жыццядзейнасць адміністратыўнага апарату і вырашала задачы абароны.
- гарады былі цэнтрамі пісьменнасці і культуры.

Даследчыкамі вылучаюцца тры асноўныя шляхі станаўлення гарадоў:

- гандлёва-рамесны;
- абшчынна-феадальны – горад утвараўся на аснове старажытнага абшчыннага цэнтра;
- феадальны (дзяржаўны) – горад узнікаў у выніку цэнтралізатарскай палітыкі князёў асобных земляў-княстваў.

На тэрыторыі Беларусі першыя гарады ўзніклі ў IX–XIII ст. і ўяўлялі сабой агароджанае ўмацаванае паселішча. Нярэдка яны ўтвараліся на месцах былых гарадзішчаў жалезнага веку. Многія гарады развіваліся з умацаваных паселішчаў, феадальных замкаў, парубежных крэпасцей. Як правіла, гарады мелі прывязку да сутокаў рэк, ад назвы якіх часта і атрымоўвалі свае назвы. Геаграфічнае размяшчэнне гарадоў – скрыжаванне гандлёвых шляхоў, блізкасць рэк і азёр, якія выкарыстоўваліся як транспартныя магістралі – спрыяла іх росту.

Ядром горад быў *дзяцінец* – цэнтральная частка паселішча, размешчаная на ўзвышэнні і ўмацаваная драўляным тынам, равамі і валамі.

Побач узнікалі *вакольны горад,* вакол якога ўтваралася другая лінія ўмацаванняў, і *пасады* – гандлёва-рамесніцкія часткі горада. Непадалёку ад горада знаходзіўся курганны могільнік (некропаль).

Забудова ўсходнеславянскага горада была пераважна драўляная. Мураванымі былі пераважна храмы і княжацкія церамы. Вуліцы масціліся драўлянымі маставымі, мелі разгалінаваную дрэнажную сістэму. Сядзібы адрозніваліся па памерах і плошчы. Дамы знаці называліся “харомамі” і часта былі двухпавярховымі, акружанымі галерэямі, сенямі.

Самым буйным горадам Усходняй Еўропы ў XI–XIII ст. з’яўляўся **Кіеў.** Першы ўспамін аб горадзе ў летапісу адносіцца да 862 г. Лічыцца, што ў XI–XIII ст. тут магло пражываць не менш за 50 тыс. чалавек. Горад узнік з былога племяннога цэнтру. У Кіеве былі выяўлены напластаванні V – VI ст., у сувязі з чым некаторыя даследчыкі аднеслі час узнікнення горада да V ст. і звязалі гэтыя падзеі з дзейнасцю легендарнага князя Кія. Аднак толькі ў IX ст. гэтае пасяленне набыло рысы горада.

Дзяцінец старажытнага Кіева, разам з княскімі пабудовамі, знаходзіўся на Старакіеўскай (Андрэеўскай) гары. Ядро горада прадстаўляла невялікі ўмацаваны замак з язычніцкім капішчам. Першая крэпасная сцена была зроблена з дрэва. На навакольных гарах (Шчакавіца, Кудравец, Лысая гара) размяшчаўся пасад. Кіеўскі некрапаль IX–X ст. складаўся як з параўнальна бедных, так і вельмі багатых пахаванняў, у якіх былі выяўлены вырабы з золата, срэбра, рэшткі дарагога адзення, арабскія дырхамы і дарагая зброя.

Найбольш актыўнае развіццё Кіева прыходзілася на канец X–сярэдзіну XIII стст. Пры Уладзіміры Святаславічы былі пабудаваны новыя моцныя ўмацаванні (новы дзяцінец “горада Уладзіміра”). У першай палове XI ст. пры Яраславе Мудрым была ўзведзена новая гарадская сцяна. У гэты час горад меў тры брамы, самай вядомай з якіх з’яўлялася “Залатая” брама. Вялікі гандлёва-рамесны пасад знаходзіўся на Падоле. Тут змяшчаліся гандлёвая і вечавая плошча, стаялі каменныя цэрквы.

У выніку археалагічных раскопак у Кіеве адкрыта звыш 200 жылых і гаспадарчых пабудоў. Жытлы падзяляліся на два тыпы: наземныя зрубныя будынкі і паўзямлянкі слупавай канструкцыі.

Акрамя таго, археолагі адкрылі некалькі цэркваў, княскіх палацаў, якія былі пабудаваны з камня і тонкай плінфы. Першая на Русі цагляная царква – Дзесяцінная царква – была ўзведзена ў 989–996 гг. Яна была разбураная мангола-татарамі ў 1240 г. Самае старажытнае збудаванне Кіева, якое захавалася да нашага часу, – Сафійскі сабор, закладзены ў 1037

г. Гэты манументальны храм распісаны фрэскамі, упрыгожаны мазаікамі, скульптурай.

У горадзе знойдзены шматлікія майстэрні. Надзвычай высокага ўзроўню развіцця дасягнулі кавальская, ювелірная справа, ганчарная дрэваапрацоўчая вытворчасці і інш. Важную ролю ў эканамічным жыцці горада адыгрываў і гандаль. У Кіеў прыязджалі купцы не толькі са ўсіх канцоў Старажытнай Русі, але і іншых краін: Скандынавіі, Польшчы, Германіі, Чэхіі, Венгрыі, Візантыі, Арабскага Усходу, Хазарыі.

Росквіт Кіева быў гвалтоўна прыпынены ў 1240 г. нашэсцем полчышчаў Батыя. Выяўлена некалькі брацкіх магіл, якія былі запоўнены шкілетамі загінуўшых. У выніку нашэсця манголаў Кіеў быў спалены, разбураны і разрабаваны. Аднак горад не быў цалкам знішчаны. Археалагічныя раскопкі паказалі, што жыцце працягвалася ва ўсіх гістарычных частках Кіева, хаця колькасць насельніцтва значна паменшылася.

Другім буйным горадам Старажытнай Русі быў **Ноўгарад.** Першы ўспамін аб Ноўгарадзе ў летапісу адносіцца да 859 г. Ноўгарад размяшчаўся на берагах р. Волхаў. Горад падзяляўся на 5 канцоў: Людзін, Нераўскі, Славенскі, Загародскі і Плотніцкі. На думку некаторых даследчыкаў, Ноўгарад узнік як сталіца федэрацыі, якая складалася са славен (Славенскі канец), фінна-угорскага племені мера (нерава) – Нераўскі канец і крывічоў (Людзін канец).

Дзякуючы павышанай вільготнасці культурнага пласта ў Ноўгарадзе добра захаваліся вырабы з арганікі: рэшткі драўляных жытлаў, вулічныя маставыя, а таксама шматлікія рэчы, найбольш каштоўнымі для навукі з якіх з’яўляюцца берасцяныя граматы.

Планіроўка і забудова горада найбольш поўна прасочана ў самым вялікім Нераўскім раскопе. Тут выяўлены тры гістарычныя вуліцы: Вялікая, Халоп’я, Казмадзем’янская. Гэтыя вуліцы існавалі на працягу многіх стагоддзяў і праз кожныя 15–20 гадоў нанава масцілася драўлянымі плахамі. У слаях X–XV ст. археолагі знайшлі 30 ярусаў маставых

Адметнасцю наўгародскіх грамадзянскіх пабудоў з’яўляецца адсутнасць паўзямлянак, шырока распаўсюджаных у іншых гарадах. Людзі жылі ў наземных драўляных хатах. Падлога высцілалася тоўстымі абцясанымі плахамі. Над ніжнім паверхам узводзіўся верхні паверх, які па плошчы пераўзыходзіў ніжні і часткова абапіраўся на вертыкальныя слупы. Дамы ацяпляліся цаглянымі пячамі. Жылым з’яўлялася верхняе

памяшканне, а ніжняе – выкарыстоўвалася ў гаспадарчых мэтах. Дамы часта ўпрыгожвалі разьбой па дрэве.

У X ст. ў Ногарадзе быў узведзены драўляны Сафійскі сабор. У 1045–1050 гг. ён быў заменены каменным храмам, які захаваўся да нашых дзён. Наўгародскі Сафійскі сабор быў пяцікупальным, збудаваным, як і цэрквы ў Кіеве, у тэхніцы чаргавання радоў каменю і плінфы.

Археалагічныя даныя сведчаць аб высокім узроўні развіцця рамёстваў. Асноўным цэнтрам гандлёва-эканамічнага жыцця Ноўгарада быў рынак. Побач з рынкам знаходзіліся Нямецкі і Гоцкі гандлёвыя рады. Розныя знаходкі адлюстроўваюць гандлёвыя сувязі Ноўгарада з вельмі далёкімі краінамі: Францыяй, Італіяй, краінамі Ўсходу і інш.

У Ноўгарадзе было знойдзена звыш 800 берасцяных грамат, самыя старажытныя з якіх адносіцца да першай паловы XI ст., самыя познія – да сярэдзіны XV ст. Гэтыя знаходкі сведчаць аб высокім узроўні старажытнарускай гарадской культуры.

Ноўгарад не быў разбураны і разрабаваны татара-манголамі.

**Полацк.** Адзін з самых старажытных гарадоў летапісных славян. Упершыню ўзгадваецца ў летапісах у 862 г. Быў заснаваны крывічамі. Горад займаў выгаднае геаграфічнае становішча – у месцы ўпадзення р. Палаты ў Заходнюю Дзвіну.

Найбольш старажытная частка Полацка – дзяцінец (Полацкае гарадзішча). Першапачаткова ён размяшчаўся ў месцы зліцця дзвюх рэк, пазней, у канцы X ст. – пачатку XI ст., быў перанесены на бераг Заходняй Дзвіны. Новы дзяцінец атрымаў назву “Верхні горад”. Ён стаў адміністрацыйным цэнтрам горада, тут быў пабудаваны Полацкі Сафійскі сабор. Да дзяцінца прымыкаў Ніжні горад, які быў абнесены магутнымі валамі. Яны часткова захаваліся да сённяшняга дня. На супрацьлеглым беразе Заходняй Дзвіны размяшчаўся неўмацаваны гандлёва-рамесніцкі пасад – Запалоцце.

Магутнасць культурнага пласта дасягала 5,5 м. У раскопах былі зафіксаваныя 14 будаўнічых гарызонтаў, кожны з якіх складаўся з вулічнай маставой і прылеглых жылых пабудоў.

Горад меў сядзібную забудову, калі жылыя хаты разам з гаспадарчымі пабудовамі ўтваралі адзіны комплекс. Хаты былі наземныя драўляныя зрубнай канструкцыі, плошчай 12–25 м$^2$. У хатах мелася драўляная падлога, яны ацяпляліся глінабітнымі пячамі.

У матэрыялах раскопак знайшлі адлюстраванне розныя бакі гаспадарчай дзейнасці гарадскога насельніцтва. Знойдзены шматлікія

прадметы хатняга ўжытку, вырабы з чорнага металу, рамесніцкія дрэваапрацоўчыя прылады, рэшті сродкаў руху (дэталі сяней, калёсаў, вёслаў і г.д.). Выяўлены зброя і рыштунак вершнікаў, прылады сельскагаспадарчай вытворчасці. Вызначана, што ў Полацку выраблялiся як высокамастацкія вырабы з каляровых металаў, так і таныя ўпрыгожанні. Горад з'яўляўся цэнтрам па вытворчасці шкляных бранзалетаў.

У IX–XIII ст. у Полацку быў узведзены шэраг манументальных збудаванняў, найбольш вядомым з якіх з'яўляецца Полацкі Сафійскі сабор. Ён быў пабудаваны паміж 1044 і 1066 гг, у часы княжання Усяслава Чарадзея. Даследчыкі мяркуюць, што Полацкую Сафію ўзводзіла тая ж брыгада майстроў, што будавала Сафійскі сабор у Ноўгарадзе. У XII ст. у Полацку склалася мясцовая архітэктурная школа, выразным сведчаннем якой з'ўлялася царква Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, узведзеная зодчым Іаанам. Характэрныя рысы полацкай школы: 1) узнятая цэнтральная частка храма; 2) храм завяршаеца башнепадобным барабанам і купалам; 3) кладка з цэглы-плінфы.

Археалагічныя даныя ўказваюць на высокі узровень развіцця рамёстваў. Аб высокім узроўні развіцця і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сведчыць знакаміты крыж Ефрасінні Полацкай, які быў зроблены ў 1161 г. майстрам Лазарам Богшам.

Полацк быў цэнтрам пісьменнасці. На тэрыторыі Полацкай зямлі былі выяўлены брасцяныя граматы. Дзве граматы знойдзены ў Полацку, па адной – у Віцебску і Мсціслаўлі.

**Мінск.** Горад упершыню ўзгадваецца ў крыніцах у 1067 г.

Пытанне аб месцы ўзнікнення горада выклікае дыскусіі. На думку пераважнай большасці даследчыкаў, горад першапачаткова (у X–XI ст.) размяшчаўся за яго сучаснымі межамі – праз 16 км на захад ад гістарычнага цэнтра, дзе захаваўся комплекс археалагічных помнікаў (гарадзішча і селішча на р. Менка). Мінск на Менцы выконваў функцыю адміністрацыйнага цэнтра воласці. У канцы XI ст. горад быў перанесены да сутокаў Свіслачы і Нямігі. Галоўнай прычынай "пераноса" горада былі працэсы, звязаныя з фарміраваннем удзельнага Менскага княства. На думку Э.М. Загарульскага, археалагічныя помнікі на Менцы адносяцца да познесярэдневяковага часу, а горад Мінск адразу ўзнік на р. Свіслач, пры ўпадзенні ў яе р. Няміга.

Мінск меў тыповую для свайго часу забудову. Цэнтрам горада з'яўляўся ўмацаваны дзяцінец ("Замчышча", "Замкавая гара", "Стары горад") плошчай каля 3 га. Ён быў абнесены валам, які меў складаную

канструкцыю: унутры знаходзіліся дубовыя клеці, запоўненыя пяском, а на грэбені насыпу былі ўзведзены драўляныя сцены. Побач з дзяцінцам размяшчаўся пасад на правым і левым берагах Свіслачы. Агульная плошча пасада магла займаць 16–18 га.

Горад з самага пачатку свайго існавання меў вулічную планіроўку. У паўднёва-ўсходняй частцы замчышча меўся ўезд – Мінская брама, ад якога вялі 2 вуліцы – Замкавая і Вялікая. У раскопах былі зафіксаваныя 13 будаўнічых гарызонтаў, кожны з якіх складаўся з вулічнай маставой і прылеглых жылых пабудоў. У XII–XIII ст. у наваколлі дзяцінца ўзнік рамесны пасад з гандлёвай плошчай – Нямігскі рынак.

Горад меў сядзібную забудову. Хаты былі наземныя драўляныя зрубнай канструкцыі, плошчай 16–25 м². У хатах мелася драўляная падлога, яны ацяпляліся глінабітнымі пячамі. Гаспадарчыя пабудовы мелі слупавую канструкцыю. Па меры росту горада яго забудова паступова ушчыльнялася. У Мінску было звычайным размяшчэнне на адной сядзібе дзвюх хат некалькіх (да пяці) гаспадарчых збудаванняў. Тэрыторыю двара звычайна абносілі трывалай агароджай – найчасцей частаколам.

Да пачатку XII ст. у паўднёва-ўсходняй частцы замчышча будавалася мураваная Мінская Замкавая царква. Дагэтуль не вядома, ці было яе будаўніцтва завершана. У пачатку XIII ст. на месцы храма ўзніклі хрысціянскія могілкі.

Археалагічныя даныя сведчаць аб высокім узроўні развіцця рамёстваў (чорнай металургіі і металаапрацоўкі, апрацоўкі дрэва і скуры і г.д.). Слядоў мясцовай шкларобчай вытворчасці не выяўлена. У культурным пласце знойдзены шматлікія рэшткі зброі (наканечнікі стрэл, дзідаў, мячы і інш.), рыштунка вершніка. Горад узнік як парубежная крэпасць.

## 4. Раннефеадальныя замкі (XII – XIII ст.)

Замак – сядзіба феадала, умацаваная сеньёральная рэзідэнцыя.

На тэрыторыі Беларусі замкі пачынаюць будавацца з XII ст. У XII – XIII ст. яны былі пераважна драўляныя. У наступную эпоху, у познім сярэднявеччы, па-ранейшаму ўзводзіліся драўляныя замкі, аднак у XIV ст. з’явіліся і мураваныя замкі.

Археалагічныя прыкметы замкаў:

1. невялікая плошча пры моцных умацаваннях (равы, валы, агароджы (частакол, тын) і інш.).

2. наяўнасць у культурным слоі вялікай колькасці прадметаў узбраення, конскага рыштунку.

3. пераважанне костак дзікіх жывёл над хатнімі.

4. наяўнасць у культурным слоі дарагіх упрыгожанняў і імпартных вырабаў.

На тэрыторыі Беларусі замкі даследаваліся на Падняпроўі (Вішчынскі замак, Збораўскі замак), на Панямонні (замкі каля в. Індура, Мсцібава і інш.).

Найбольш вывучаным з'яўляецца **Вішчынскі замак** (Рагачоўскі раён). Ён размяшчаўся на высокай надпоплаўнай тэрасе правага берага Дняпра. Паўкруглая пляцоўка абаронена трыма паралельнымі лініямі глыбокіх равоў і магутных валоў. На грэбені ўнутранага вала ўзвышалася абарончая сцяна з бярвёнаў, тыльны бок сцяны быў абмазаны глінай.

На пляцоўцы выяўлены рэшткі 6 наземных аднакамерных драўляных пабудоў – жытлы, гаспадарчае збудаванне, майстэрня ювеліра.

Рэчавы комплекс Вішчынскага замка багаты і разнастайны: сельскагаспадарчыя і прамысловыя прылады, інструментарый рамеснікаў і адыходы вытворчасці, побытавыя рэчы і ўпрыгожанні, зброя.

На гарадзішчы знойдзены выдатны па сваёй мастацкай каштоўнасці скарб вельмі дарагіх ювелірных упрыгожанняў і плацежных зліткаў. У склад скарбу ўваходзілі бранзалеты, прывескі, ланцужкі пацеркі і інш. Усе рэчы выраблены з высокапробнага срэбра, некаторыя ўпрыгожанні былі пазалочаныя.

Віішчынскі замак існаваў у сярэдзіне XII – сярэдзіне XIII ст. Верагодна, яго можна атаясамліваць з летапіснай Воішчынай, якая была захоплена і знішчана ў 1258 г. аб'яднанымі воскамі літоўцаў і палачан.

**Гарадзішча каля в. Збораў** Рагачоўскага раёна. Паўкруглая невялікая пляцоўка ўмацаваная высокім валам (вышынёй каля 4 м) і глыбокім равом (глыбінёй да 3 м). На помніку было знойдзена шмат прадметаў мясцовай вытворчасці, а таксама прывазныя вырабы (шкляныя бранзалеты чырвонага колеру, абломак бронзавай чашы і інш.). Рэчавы комплекс датуецца XII–XIII ст. Не выключаецца, што Збораўскі замак быў рэзідэнцыяй мясцовых рагачоўскіх князёў.

На **Індурскім гарадзішчы** (Гродзенскі раён) разам з прадметамі вайсковай справы былі знойдзены сельскагаспадарчыя і прамысловыя прылады. Выяўлена вялікая колькасць кругавой керамікі з тыповым славянскім арнаментам, шмат костак свойскай і дзікай жывёлы. Гарадзішча датуецца XI–XIII ст.

На базе ўмацаваных сельскіх паселішчаў замкавага тыпу ўзніклі шматлікія гарады Беларусі (Ваўкавыск, Капысь, Лукомль, Рагачоў і інш.), аднак пераважная большасць такіх паселішчаў стала не гарадамі, а вёскамі.

### 5. Гандлёвыя сувязі старажытнарускага насельніцтва паводле археалагічных даных

Значнае месца ў эканамічным жыцці Старажытнай Русі належала гандлю. Прычынай узнікнення гандлю стала грамадскае раздзяленне працы. Развіццю гандлю спрыяла развітая сістэма рэк, якія з’яўляліся асноўнымі сродамі зносін. Былі і сухапутныя дарогі.

Унутры невялікіх тэрыторый – акруг – усталёўваўся рэгулярны абмен паміж гарадскімі рамеснікамі і вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Вёска мела патрэбу ў якасных вырабах гарадскіх рамеснікаў, а гараджане – у прадуктах харчавання і сыравіне. Аднак эканамічныя сувязі паміж вёскай і горадам не абмяжоўваліся толькі тэрыторыяй пэўных акруг, а ахаплівалі прасторы ўсёй Старажытнай Русі і нават выходзілі па-за яе межы.

Сувязі паміж асобнымі землямі Русі і іншымі рэгіёнамі прасочваюцца па распаўсюджанні некаторых катэгорый знаходак. Напрыклад, праселкі, якія выраблялiся з ружовага шыферу, здабытага ў Оўручы на Валыні, сустракаюцца па ўсей Русі і далёка за яе межамі. З Кіева ў іншыя землі паступалі шкляныя бранзалеты, пацеркі, колты, а таксама прадметы, звязаныя з хрысціянскім культам (крыжы-энкалпіёны, іконкі і г.д.). З паўднёва-заходніх княстваў Русі, а таксама з Ноўгародскай зямлі на тэрыторыю сучаснай Беларусі прывозілі соль. Полацкія купцы гандлявалі ў Ноўгарадзе воскам. Зробленыя ў Полацку шкляныя бранзалеты траплялі ў Мінск і Друцк.

З другой паловы IX ст. усталяваліся сувязі Старажытнай Русі з Візантыяй, якія яшчэ больш умацаваліся пасля прыняцця хрысціянства ў 988 г. X ст. датуюцца першыя гандлёвыя кантакты Русі з Заходняй Еўропай. З Візантыі прывозілі прадметы, звязаныя з хрысціянскім культам, упрыгожанні. З Прычарнамор’я паступалі віно і аліўкавы алей, якія транспартыраваліся ў спецыяльных пасудзінах (амфарах). З Прыбалтыкі паступаў бурштын і некаторыя вырабы з бронзы. У Ваўкавыску знойдзены розныя касцяныя вырабы паўднёва-германскай вытворчасці.У Гродне быў знойдзены бронзавы вадалей, зроблены ў Сярэдняй Германіі. У Навагрудку, Тураве былі знойдзены абломкі блізкаўсходняга шлянога посуду. У Навагрудку былі выяўлены і фаянсавы посуд іранскай

вытворчасці. У Полацку, Мінску, Брэсце і іншых гарадах знойдзены грабяні з самшыту, якія прывозіліся з Каўказу.Традыцыйнымі прадметамі гандлю Заходняй Русі з суседнімі краінамі былі футра, скура, воск.

Неабходнымі прыналежнасцямі сярэднявечных гандляроў з'яўляліся карамыславыя вагі з шалямі для ўзважвання срэбраных зліткаў (манет) і бязмены, якія выкарыстоўваліся для ўзважвання тавараў. У Мінску знойдзены бязмен, якім можна было ўзважыць грузы да 8 пудоў.

Сведчаннем існавання развітага гандлю з'яўляюцца свінцовыя таварныя пломбы. На тэрыторыі Беларусі такія пломбы – нярэдкая знаходка. Яны вядомыя з раскопак у Навагрудку, Ваўкавыску, Гродне, Віцебску, Полацку, Мінску, Друцку.

Паказчыкам развітага гандлю з’яўляюцца і шматлікія скарбы манет, знаходкі сярэбраных грашовых зліткаў, якімі аплочваліся буйныя таварныя партыі. Перыяд канца VIII – X ст. з’яўляецца перыядам абарачэння арабскай манеты – куфічнага дырхама. Пасля спынення паступлення арабскага срабра на Русь, з 20-х гг. XI ст. умацніўся прыток еўрапейскай манеты – дэнарыяў. На Беларусі вядомыя знаходкі як адзінкавых дырхамаў, так і скарбаў, у якіх налічвалася некалькі соцень манет. У X–XI ст. у трох гарадах: Кіеве, Ноўгарадзе і Цьмутаракані – была арганізавана чаканка ўласнай манеты. З XII ст. пачалося мясцовае ліццё срэбраных зліткаў – грывен. Вядомыя т.зв. наўгародскія зліткі (у выглядзе доўгага бруска вагай каля 200 г) і кіеўскія зліткі (шасцікутнай формы вагаю каля 160 г). У XII–XIV ст. наступіў “безманетны” перыяд, які быў выкліканы спыненнем паступлення арабскага срэбра і адсутнасцю ўласнай сыравінай базы.

### 6. Распаўсюджанне пісьменнасці паводле археалагічных даных

Аб шырокім распаўсюджанні на Русі пісьменнасці сведчаць такія археалагічныя даныя, як знаходкі прыладаў для пісьма, берасцяныя граматы, а таксама надпісы на посуду, праселках, прадметах побыту і нават на сценках цэркваў.

Для пісьма выкарыстоўваліся *пісалы, альбо стылі* (металічныя стрыжані даўжынёй 8–13 см, завостраныя на адным канцы і з лапатачкай на другім). На тэрыторыі Беларусі пісалы знойдзены амаль ва ўсіх гарадах. Пісалі на спецыяльных дошачках (цэрах), якія мелі з аднаго боку паглыбленне, запоўненае воскам. Для пісання выкарыстоўвалі таксама бяросту. У шматлікіх гарадах былі знойдзены *берасцяныя граматы* – пісьмы, запіскі і дакументы XI–XV ст. на кусках бярозавай кары.

Берасцяныя граматы ствараліся не пісцамі-прафесіяналамі, а звычайнымі людзьмі, як заможнымі, так і беднымі, як мужчынамі, так і жанчынамі. Вядомы нават берасцяныя граматы, напісаныя дзецьмі. Граматы змяшчаюць тэксты побытавага, гаспадарчага зместу, даўгавыя распіскі, перадаюць палітычныя навіны і г.д.

Першая берасцяная грамата была знойдзена ў 1951 годзе падчас археалагічных раскопак у Ноўгарадзе. Граматы былі выяўлены таксама ў такіх гарадах, як Старая Руса, Смаленск, Пскоў і інш. Знойдзены яны і на тэрыторыі Беларусі – у Віцебску і Мсціслаўлі. Першая беларуская берасцяная грамата знойдзена ў 1959 годзе ў Віцебску падчас будаўнічых прац. Яна датуецца другой паловай XIII – першай паловай XIV ст. Яе тэкст: "Ад Сцяпана да Нежылы. Калі ты прадаў адзенне, то купі мне жыта на 6 грыўняў. А калі чаго не прадаў, то прышлі мне ў наяўнасці. Калі ж прадаў, то будзь ласкаў, купі мне жыта". Другая грамата была выяўлена ў 1980 годзе падчас раскопак у Мсціслаўлі ў культурных напластаваннях пачатку XIII стст. Гэта фрагмент з двума радкамі: у першым гаворыцца пра пшаніцу на суму 4,5 грыўні, у другім – пра нейкага Сямёна.

На археалагічных помніках выяўлена таксама шмат прадметаў з надпісамі. У шматлікіх гарадах Старажытнай Русі і знойдзены свінцовыя пячаткі з выявамі князёў, святых і надпісамі кірылічнымі літарамі. Напрыклад, у Ноўгарадзе Вялікім была знойдзена пячатка князя Ізяслава Уладзіміравіча (памёр у 1001 годзе), на якой была выява знака Рурыкавічаў (трохзубец) і надпіс кірылічнымі літарамі "Изас(лав)ос". У тым жа горадзе выяўлены пячаткі XII ст. з надпісам "Иефросіня г(осподи)и помози рабе своей Ефросини нарецаемой", якія належылі Еўфрасінні Полацкай. Пячаткі знаходзілі і на тэрыторыі Беларусі.

Надпісы сустракаюцца і на прадметах рэлігійнага культу. Напрыклад, у Ваўкавыску знойдзены медны пазалочаны абразок XII ст. з выявай св.Дзмітрыя і надпісам "Димитри". На каменных выразаных абразках з Мінскага замчышча змешчаны імёны "Никола", "Стефан", "Петр". Сведчаннем распаўсюджвання пісьменнасці ў шырокім асяроддзі з'яўляюцца надпісы-графіці, прачэрчаныя вострымі прадметамі на побытавых рэчах, костках жывёл і сценах будынкаў. Напрыклад, на ўнутраным слупе Спаскай царквы Еўфрасіньеўскага манастыра ў Полацку захаваўся надпіс кірылічнымі літарамі: "Месяца сентября преставился раб Иван..." Літары ад графіці на тынкоўцы дома XII ст. выяўлены ў Навагрудку.

Надпісы сустракаюцца і на побытавых рэчах. Вядомы фрагмент амфары з Пінску з надпісам “ополчо внно” (Ярополче вино). Амфара з надпісам “Олъкъсн” (праўдападобна, Аляксей) выяўлена на пасадзе Навагрудка ў культурных напластаваннях першай паловы XII ст. Даволі часта графіці сустракаюцца на шыферных праселках XI – XIII ст. Унікальнай знаходкай з'яўляецца самшытавы грабеньчык пачатку XIII ст., раскапаны ў Брэсце, на якім выразаны кірылічныя літары

Падчас раскопак на гарадзішчах Маскавічы і Рацюнкі (Браслаўскі р-н) былі знойдзены косткі жывёл з прадрапанымі малюнкамі і рознымі знакамі, у т.л. рунічнымі.

На тэрыторыі Беларусі вядомы і манументальныя эпіграфічныя помнікі – т.зв. “Барысавы камяні”, якія датуюцца XII ст. Гэта – вялікія валуны з высечанымі на іх 6-канцовымі крыжамі і надпісамі “Господи помози рабу своему Борису”. Такія камяні былі знойдзены ў рэчышчы Заходняй Дзвіны. Лічыцца, што да прыняцця хрысціянства “Барысавы камяні” былі язычніцкімі фетышамі, а надпісы на іх былі высечаны ў час вялікага голаду ў пачатку мая 1128 года. Імя “Барыс” звязваецца з імем полацкага князя Барыса Усяславіча (1127–1129 гг.).

## 7. Рэлігійныя ўяўленні старажытнарускага насельніцтва паводле археалагічных даных

**Язычніцтва паводле археалагічных даных.** Дахрысціянскія культавыя збудаванні, месцы маленняў і ахвярапрынашэнняў называюцца *свяцілішчамі ці капішчамі.* Аб існаванні дахрысціянскіх культавых аб'ектаў сведчаць легенды пра ўзгоркі, на якіх стаялі царквы альбо касцёлы, што праваліліся пад зямлю, а таксама – спецыфічныя тапонімы: Святое возера, Божая горка, Валова гара, Турава гара, Перунова гара, Красная гара, Святы камень, Змееў камень і інш.

Даследчыкі мяркуюць, што язычніцкія свяцілішчы (капішчы) існавалі ў шматлікіх мясцінах на тэрыторыі Беларусі. Адным з самых даследаваных помнікаў з’яўляецца гарадзішча-капішча каля вёскі Верхаўляны (Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл.). Мясцовая назва - “Гарадзішча”. Круглая ў плане пляцоўка дыяметрам каля 7 м абкружана ровам і валам. З паўночна-заходняга боку ў вале быў зроблены праход, які злучаўся з пляцоўкай земляной перамычкай. Падчас раскопак пляцоўкі археолагі выявілі вугольную праслойку, фрагменты ганчарнай керамікі і крамяні са слядамі апрацоўкі. У рове была знойдзена каменная выбрукоўка, косткі і зубы жывёл, фрагменты керамікі, вуголле. На думку

спецыялістаў, гэта выбрукоўка мела рытуальныя функцыі: тут знаходзіліся ахвярнікі, у якія кідалі мяса жывёл і рытуальна разбітыя пасудзіны.

На свяцілішчах часта ставіліся ідалы, прысвечаныя аднаму са шматлікіх язычніцкіх багоў. Ідалы знаходзілі ў Слоніме, Ваўкавыску, Шклове і інш. Як правіла, ідалы мелі выразныя індывідуальныя рысы. Пасля прыняцця хрысціянства значная частка ідалаў была знішчана. Іх закопвалі ў зямлю ці тапілі ў вадаёмах і балотах. Часам на ідалах выбівалі крыжы. На тэрыторыі Беларусі вядома таксама каля 300 культавых валуноў.

З язычніцкімі вераваннямі звязаны і прывескі-амулеты (абярэгі). Іх рабілі з іклаў і костак жывёл, бурштыну, металу, ракавінак каўры. Археолагі часта знаходзяць такія вырабы пад час раскопак курганоў і паселішчаў. Вядомы амулеты разнастайных формаў. Мяркуюць, што абярэгі мелі розныя функцыі і былі звязаныя з рознымі культамі (сонца, агню і г.д.) Так, падвескі-луніцы маглі сімвалізаваць месяц. Плоскія стылізаваныя калькі і полыя шумячыя падвескі-конікі лічаць ўвасабленнем дабрыні, шчасця і ўрадлівасці. Часта знаходзяць шматлікія бразготкі, функцыі якіх звязваюць з ахоўвай людзей ад злых духаў. Вядомы бранзалеты са стылізаванымі зааморфнымі канцамі, іх звязваюць з культам змяі. Сімваламі сонца з'яўляліся падвескі з крыжам у коле. У курганных пахаваннях X–XIII ст. сустракаюцца падвескі-крыжыкі. Разнавіднасцю крыжа з'яўлялася свастыка, выявы якой у выглядзе клемаў на донцах гаршкоў, плінфаў неаднаразова знаходзілі на паселішчах і ў курганных пахаваннях. Пачынаючы з XI ст. на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваліся прывескі-амулеты ў выглядзе ключыкаў, сякерак, лыжачак і іншых мініяцюрных прадметаў побыту. Лічыцца, што ў славянскіх язычніцкіх вераваннях ключ і лыжка былі сімваламі багацця і дабрабыту, сякера – сімвалам бога Перуна.

**Хрысціянства паводле археалагічных даных.** Прыняцце хрысціянства (988 г.) знайшло сваё адлюстраванне ў паступовых зменах пахавальнага абраду насельніцтва. У канцы X – пачатку XI ст. пачаўся паступовы пераход ад традыцыйнага язычніцкага трупаспалення да трупапакладання ў курганных насыпах. З цягам часу велічыня курганаў змяншалася. У гарадах мемарыяльнымі месцамі рабіліся храмы і прылеглыя тэрыторыі. Князёў, эліту і заможных людзей хавалі ў каменных грабніцах (напрыклад, вядомы пахаванні полацкіх епіскапаў каля Спаскай царквы ў Полацку) і саркафагах (знойдзены ў Тураве).

У археалагічным матэрыяле фіксуюцца таксама іншыя праявы хрысціянізацыі: змяненне знешняга выгляду гарадоў, звязанае з будаўніцтвам цэркваў і манастыроў, часта мураваных; распаўсюджанне культавых прадметаў.

## 8. Манументальнае дойлідства старажытнарускіх гарадоў

Каменнае дойлідства на Русі пачалося ў Х ст. Найбольш старажытнай пабудовай з каменя з’яўляецца Дзесяцінная царква ў Кіеве, якая была пабудавана візантыйскімі майстрамі ў 989 – 996 гг. Аснову царквы складала пабудова з трымя апсідамі (паўкруглымі выступамі, дзе ўстанаўліваўся алтар). Унутры царква была ўпрыгожаная фрэскамі і паліванымі markdownрознакаляровымі пліткамі. У ХІ ст. у Кіеве быў пабудаваны яшчэ адзін каменны храм – Сафійскі сабор. Ён быў пяціапсідным, з цэнтральным купалам, вакол якога размяшчаліся 12 меншых па памерах купалаў. Сабор быў упрыгожаны фрэскамі і мазаікамі. У пачатку ХІІ ст. у Кіеўскім княстве пачалі ўзводзіць шасцістоўпныя храмы з трыма апсідамі, а з сярэдзіны ХІІ ст. – чатырохстоўпныя саборы. У 1045 – 1050 гг. быў пабудаваны Сафійскі сабор у Ноўгарадзе. Храм меў тры апсіды і пяць купалаў. Наўгародскую Сафійскую царкву будавалі кіеўскія майстры.

Своеасабліва развівалася дойлідства Уладзіміра-Суздальскай зямлі. Першыя каменныя храмы былі пабудаваныя паводле традыцыі кіеўскай дойлідскай школы. Пазней склалася мясцовая архітэктурная школа, галоўнай адметнасцю якой была багатая арнаментацыя сцен. Пярлінай дойлідства Уладзіміра-Суздальскай зямлі лічыцца царква Пакрова-на-Нярлі.

На тэрыторыі Беларусі найбольш старажытным каменна-цагляным будынкам з’яўляецца Сафійскі сабор у Полацку, узведзены ў сярэдзіне ХІ ст. Як мяркуюць даследчыкі, полацкі Сафійскі сабор узводзілі майстры, звязаныя з будаўніцтвам Сафіі ноўгародскай і кіеўскай. Полацкая Сафія па планіроўцы была блізкая да Сафіі Наўгародскай, аднак мела і шэраг спецыфічных рысаў, перадусім у планіроўцы, унутраным аздабленні, афармленні фасадаў.

У пачатку ХІІ ст. пачалося фарміраванне своеасаблівай полацкай архітэктурнай школы. Школа сфарміравалася на аснове візантыйска-кіеўскіх архітэктурных традыцый. Адной з яе асаблівасцяў была т.зв. муроўка “са схаваным радам”, пры якой на фасад выходзілі плінфы не ўсіх радоў, а праз рад, а прыкрытыя звонку растворам прамежкавыя рады адступалі ад плоскасці сцяны. Помнікі гэтай школы вядомы ў Полацку

(Спаса-Праабражэнская царква, Бельчыцкія храмы, храм-усыпальніца ў Сяльцы) і іншых гарадах Полацкага княства (царква Звеставання (Дабравешчання) у Віцебску).

Рэшткі мураванай царквы канца ХІ – першай чвэрці ХІІ ст. знойдзены пры раскопках Мінска. Даследаванні паказалі, што яе не дабудавалі – быў закладзены толькі падмурак.

У ХІІ ст. своесаблівая архітэктурная школа склалася ў Гродзенскім княстве. З яе помнікаў вядомы рэшткі храмаў у Гродне і Ваўкавыску, рэшткі княскага палаца і абарончай сцяны на дзядзінцы Гродна. Да нашых дзён захавалася Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне, пабудаваная ў другой палове ХІІ ст.

Да асаблівасцяў гродзенскай архітэктурнай школы адносяцца некаторыя рысы планіровачнай кампазіцыі храмаў, дэкаратыўныя элементы (фасады ўпрыгожвалі ўстаўкамі з маёлікавых плітак і шліфаваных камянёў), практыка выкарыстання галаснікоў для паляпшэння акустычных якасцяў памяшканняў.

Рэшткі яшчэ адной мураванай царквы былі выяўлены ў Тураве. Храм належаў да кіеўскай архітэктурнай школы.

## 9. Прыкладное мастацтва старажытнарускага насельніцтва паводле археалагічных даных

У гарадах Старажытнай Русі знойдзены шматлікія ўзоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Шырокі попыт у насельніцтва мела прадукцыя ювеліраў. Цэнтрам ювелірнай вытворчасці быў Кіеў, аднак ювелірнай справай займаліся і ў іншых гарадах. Так, рэшткі ювелірных майстэрань былі раскапаныя ў Мінску, Полацку, Навагрудку. Аб мясцовым характары ювелірнай вытворчасці сведчаць знаходкі ювелірных льячак і тыгляў, ліцейных формачак і пінцэтаў і інш. Акрамя вядомых і ў папярэднія эпохі форм каляровай металаапрацоўкі (ліцце, коўка, чаканка), з’явіліся новыя тэхнікі: штампоўка, валачэнне, скань, зерць, чарненне, эмаль, інкрустацыі.

Зерць – ювелірны прыём, пры якім на залатую, срэбную, радзей бронзавую аснову напайвалі вельмі маленькія шарыкі з золата ці срэбра. Скань – прыпой на залатую ці срэбную аснову з вельмі тонкага золата ці срэбнага дроту. Эмаль – шклопадобны сплаў, які афарбоўвалі ў розныя колеры і які пасля застывання даваў цвёрдую роўную паверхню. Чарненне – тэхніка, якая заключалася ў тым, што на паверхні срэбнай рэчы

выразаўся малюнак, які потым запаўняўся рэчывам цёмна-матавага колеру. Гэта рэчыва атрымлівалі з волава, срэбра, медзі і серы.

Найбольш дарагімі ювелірнымі вырабамі былі колты – упрыгожанні ў выглядзе багата аздобленых пустацелых скрыначак, у якія закладвалі тканіну з прыемным водарам. Колты прывешваліся па баках галавы на металічных ланцужках. Гэтыя ўпрыгожанні насілі заможныя гараджанкі.

Параўнальна распаўсюджанымі знаходкамі з’яўляюцца вырабы, звязаныя з хрысціянскім культам. На тэрыторыі Беларусі пры раскопках у Полацку, Мінску, Тураве, Мсціслаўлі, Віцебску, Магілёве, Гродне і інш. гарадах былі выяўлены крыжы-энкалпіёны (двухстворкавыя нагрудныя крыжы-складзені, выкананыя ў тэхніцы ліцця). Звычайна на вонкавым баку, у сяродкрыжжы, знаходзілася рэльефная альбо схематычная выява Хрыста, на адваротным баку была размешчаная выява Маці Боскай з Дзіцём, а на канцах крыжа – рэльефныя ці графічныя выявы святых. Крыжы часта мелі надпісы.

Шэдэўрам прыкладнога мастацтва з'яўляўся крыж, зроблены полацкім майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. па заказу полацкай князёўны Ефрасінні.

На тэрыторыі Старажытнай Русі знойдзена шмат скарбаў, якія змяшчалі высокамастацкія ўпрыгожанні: колты, бранзалеты, падвескі, медальёны і інш. Выдатны па сваёй мастацкай каштоўнасці скарб вельмі дарагіх ювелірных упрыгожанняў і плацежных зліткаў быў знойдзены і непасрэдна на тэрыторыі Беларусі – на Вішчынскім гарадзішчы (Рагачоўскі р-н).

Вялікіх поспехаў у старажытнарускі час дасягнула шкларобства. Да XI ст. шкляныя вырабы паступалі на Русь з Візантыі і Бліжняга Усходу. У пачатку XI ст. з’явіліся мясцовыя шкларобчыя майстэрні. Асабліва шырокае распаўсюджанне атрымалі такія вырабы, як шкляныя пацеркі і бранзалеты. Вытворчасць шкляных бранзалетаў была наладжана ў Кіеве, Ноўгарадзе, Смаленску, Полацку і інш. гарадах. Гэтыя ўпрыгожанні з’яўляліся атрыбутамі гараджанак. Вопыт вырабу ўпрыгожанняў са шкла і каляровых эмалей садзейнічаў арганізацыі ў шэрагу гарадоў, у т.л. Полацку і Гродне, вытворчасці паліваных дэкаратыўных плітак і смальтавай мазаікі для ўпрыгожвання мураваных храмаў.

Высокага ўзроўню дасягнула і мастацкая разьба па каменю. У старажытных пабудовах Кіева знойдзены шматлікія разныя каменныя пліты. Вялікай папулярнасцю карысталіся рэльефы на плітах з оўручскага чырвонага шыферу. Саркафаг з такога матэрыялу быў знойдзены і ў

Тураве. Падчас раскопак раннесярэднявечных помнікаў археолагі нярэдка знаходзяць і прадметы дробнай пластыкі, як правіла, звязаныя з хрысціянскім культам, перадусім каменныя абразкі, якія насілі на грудзях. На тэрыторыі Беларусі такія абразкі былі выяўлены ў Полацку, Пінску, Мінску.

## ТЭМА 6. АРХЕАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ ПОЗНЯГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА (XIV—XVIII СТ.).

### План

1. Гарады.
2. Замкі і абарончыя збудаванні.
3. Мястэчкі.
4. Вясковыя паселішчы.

*Ілюстрацыі па тэме прыведзены ў Прэзентацыі 7.*

Час XIV–XVIII ст. вызначаўся пэўнымі, спецыфічнымі ў параўнанні з папярэднімі перыядамі, рысамі. Гэта быў час росквіту і заняпаду феадалізму, час фарміравання беларускай народнасці. У XIV–XVIII ст. тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад ВКЛ, якое захоўвала аўтаномію і пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай. У згаданы перыяд узмацніліся сувязі беларускіх зямель з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Значныя змены адбываліся і ў гаспадарчым жыцці. Рамяство набыло цэхавую арганізацыю, з цягам часу з’явілася мануфактурная вытворчасць. Распаўсюдзіўся новы тып паселішчаў – мястэчкі. Павялічылася колькасць неўмацаваных сядзіб феадалаў у вясковай мясцовасці. Менавіта ў гэты час атрымалі распаўсюджванне замкі. Змены ў канфесійнай сітуацыі прывялі да з’яўлення на тэрыторыі Беларусі пратэстанцкіх і ўніяцкіх храмаў, што надавала новы выгляд паселішчам.

Перыяд XIV–XVIII ст. параўнальна добра прадстаўлены ў пісьмовых і іканаграфічных крыніцах. Тым не менш, без археалагічнага вывучэння нельга атрымаць дастаткова поўнага ўяўлення пра матэрыяльную культуру гэтага часу, і, адпаведна, пра эпоху ў цэлым.

## 1. Гарады

Гарады позняга сярэднявечча, як і ў ранейшчы час, былі адміністрацыйна-гаспадарчымі і культурнымі цэнтрамі пэўных тэрытарыяльных акруг. У гарадах засяроджваліся органы кіравання гэтымі акругамі, а таксама рамесна-гандлёвыя карпарацыі, якія ажыццяўлялі вытворчасць розных відаў гаспадарчай і побытавай прадукцыі і яе рэалізацыю. Аднак у XIV–XVIII ст. у гарадах адбываліся больш складаныя, чым у папярэдні перыяд, сацыяльна-тэрытарыяльныя змены. У развіцці гарадоў і ў эвалюцыі іх планіроўцы вылучаюцца два этапы.

На першым этапе (XIV–XV ст., ва ўсходнім рэгіёне да XVI ст.) укаранялася і развівалася спецыялізаваная рамесніцкая вытворчасць. Забудова гарадоў, як і ў папярэднія стагоддзі, вялася па сацыяльным прыкметам. Былы дзяцінец пераўтвараўся ў Верхні замак, на тэрыторыі якога размяшчалася адміністрацыя акругі і яе абслуга. Тэрыторыя былога вакольнага горада, а ў некаторых, найбольш буйных, гарадах і частка неўмацаванага пасада, абносіліся новай лініяй ўмацаванняў і станавіліся Ніжнім замкам. Тут размяшчаліся сядзібы ювеліраў, майстроў мастацкай апрацоўкі матэрыялаў (жалеза, косткі і г.д.), а таксама сядзібы акруговай шляхты. Часам на тэрыторыі Ніжняга замка размяшчаўся торг, які існаваў яшчэ з “дазамкавай” пары. Асноўнае насельніцтва гарадоў – рамеснікі і гандляры – месцілася на навакольных неўмацаваных пасадах. Археалагічныя даследаванні сведчаць, што гарадскія пасады XIV – XV ст. па сваіх памерах не на шмат перавышалі пасады папярэдняга перыяду, а часам былі і меншыя.

Другі этап (XVI ст, XVII–XVIII ст.) абумоўлены развіццём феадальных адносінаў і ўздымам гандлёва-рамесніцкай дзейнасці, а таксама зменамі ў прававым статусе гарадоў і атрыманнем некаторымі з населеных пуктаў Магдэбургскага права. Рост прэстыжнасці замкавай тэрыторыі, павялічэнне шчыльнасці яе забудовы сядзібамі заможных гараджан і мясцовай шляхты паступова выцясняла сядзібы шэраговых гараджан і ўсю іх рамесніцкую і гандлёвую дзейнасць на аддаленыя ўчасткі горада, часта за рэчку (на процілеглы бок ад замкаў). Так узнікалі новыя цэнтры – т.зв. “места”. У іх развіваўся торг – цэнтр гандлёва-рамесніцкага жыцця гараджан. Тут узводзілася ратуша, у якой месцілася адміністрацыя, якая клапацілася ўжо толькі аб інтарэсах гараджан, а не ўсёй акругі. Тут будаваліся і храмы. З цягам часу значэнне гэтых цэнтраў павялічвалася, а замкаў – памяншалася. У некаторых гарадах новыя места таксама ўмацоўваліся абарончымі ўмацаваннямі, за межамі якіх працягвалі

развівацца неўмацаваныя другасныя часткі горада (пасады, слабоды, прадмесці). Усё гэта садзейнічала ўпарадкаванню ўнутранай планіроўкі гарадоў і развіццю вулічнай сеткі.

У XIV–XVIII ст. агульны выгляд гарадоў быў драўляным. Мураванымі былі замкавыя муры і вежы, даволі часта – храмы і кляштары, і, пачынаючы з XVI ст. – таксама некаторыя грамадскія пабудовы (перадусім ратушы). З XVII ст. з каменю ўзводзілі і дамы заможных гараджан. Аднак асноўным матэрыялам гарадской забудовы па-ранейшаму заставалася дрэва.

Падчас раскопак познесярэднявечных гарадоў археолагамі былі знойдзены шматлікія гарадскія сядзібы і рэшткі масавай забудовы: жылыя, гаспадарчыя і грамадскія збудаванні. Жытлы, звычайна зрубныя, будаваліся на драўляных фундаментах і мелі двускатны дах, пакрыты цёсам. Каля некаторых пабудоў меліся ганкі. У жытлах былі драўляныя падлогі. Адметная рыса жылых пабудоў – наяўнасць унутры печы. Калі ў XIII ст. не было ўстойлівага парадку размяшчэння печы ў хаце, то пачынаючы з XIV ст. яна займала адзін з бліжэйшых да ўвахода вуглоў, што было ўласцівай рысай беларускага жытла нават у пачатку XX ст. Як правіла, печкі былі глінабітныя, аднак паступова распаўсюджваліся і кафляныя печкі. Вокны звычайна былі шкляныя.

Пабудовы гаспадарчага прызначэння прадстаўлены памяшканнямі для жывёлы, для захавання розных харчовых прыпасаў, а таксама пабудовамі вытворчага прызначэння. Пабудовы для жывёлаў – хлявы – як правіла, былі зрубнай канструкцыі і мелі драўляную падлогу. Пабудовы для захавання збожжа – клеці, скwіраны – мелі высока размешчаную падлогу. Для захавання іншых прыпасаў выкарыстоўваліся паграбы і падклецці. Падклецці таксама маглі выступаць у якасці жылых памяшканняў: тады ў іх прарубалі вокны і ўсталёўвалі печы. Да пабудоў вытворчага прызначэння, вядомых па археалагічных даных, адносяць кузню (Брэст) касцярэзныя майстэрні (Віцебск, Мсціслаўль), майстэрні па апрацоўцы бурштыну і шкла (Мінск) і інш.

Грамадскія збудаванні, даследаваныя археалагічна, нешматлікія. Найбольш вядомай з’яўляецца карчма XVII ст., знойдзеная ў Віцебску.

У познесярэдневяковых гарадах будаваліся вулічныя маставыя. Амаль да канца XVII ст. яны, як і ў папярэдні перыяд, былі драўляныя. У пачатку XVII ст. з’явіліся першыя брукаваныя дарогі, але ў асноўным гэта былі невялікія ўчасткі пад’ездаў да замкаў і сядзіб магнатаў. У гарадах брукаванае пакрыццё вуліц распаўсюдзілася толькі ў XVIII ст.

Неад’емным складнікам гарадской інфраструктуры былі разнастайныя водаадводныя і каналізацыйныя збудаванні. Уся водаадводная сістэма была размешчана такім чынам, каб стокі, з улікам рэльефу мясцовасці, выходзілі за межы горада ў бок натуральных паніжэнняў.

## 2. Замкі і абарончыя збудаванні

У XIII–XIV ст., у сувязі з развіццём вайсковай справы, на тэрыторыі Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, у т.л. Беларусі, назіраліся істотныя змены ў развіцці ваенна-інжынернага мастацтва. У шэрагу гарадоў Беларусі пачалося будаўніцтва магутных мураваных вежаў, якія сумяшчалі абарончыя і жылыя функцыі – т.зв. *данжонаў*. Найбольш вядомая вежа-данжон была пабудаваная ў другой палове XIII ст. у сучасным мястэчку Камянец Брэсцкай вобласці. Вежа цалкам збудавана з цэглы, што робіць яе ўнікальнай. Першапачаткова вежа мела натуральны цагляны чырвоны колер, а праёмы вокнаў і нішаў былі атынкаваны і пабелены.

Значную ролю ў ваеннай і палітычнай гісторыі ВКЛ адыгрывалі шматлікія замкі. У беларускай археалогіі да *замкаў* адносяць вялікакняскія (каралеўскія) рэзідэнцыі, сеньёральныя рэзідэнцыі (уладальніцкія замкі ў прыватнаўласніцкіх гарадах і мястэчках), умацаванае жыллё феадалаў у вясковай мясцовасці.

З XIV ст. пачалося распаўсюджанне *замкаў-кастэляў*. Тэрмін “кастэль” паходзіць ад лацінскага слова “замак” і першапачаткова азначала ўмацаваны валам і равом лагер рымскага легіёна. У сярэднявечнай Еўропе кастэллю называлі невялікі каменны замак з адной – дзвюмя вежамі, які будавалі ў нізіне на штучным насыпе. Асноўныя рысы замкаў тыпу кастэль: 1) размяшчаўся на пляцоўцы, якая ў плане нагадвала квадрат; 2) вакол замка знаходзіўся роў, запоўнены вадой; 3) вышыня сцен дасягала 15–16 м; 4) у двары былі выкапаныя калодзежы; 5) замак сумяшчаў абаронную, жылую і будаўнічую функцыі.

Аднымі з першых такіх замкаў на тэрыторыі Беларусі былі Лідскі і Крэўскі замкі. Вялікакняскія дойліды ўзялі за ўзор рыцарскі кастэль і дапасавалі яго да мясцовых умоў і патрэбаў.

Замкі размяшчаліся на невялікіх пагорках пры сутоках дзвюх рэчак. Гэта стварала дадатковыя перашкоды для ворагаў, аднак не дазваляла ў далейшым узводзіць новыя лініі абароны. Замкі мелі форму чатырохвугольнікаў з дзвюма вежамі, якія размяшчаліся ў вуглах па дыяганалі. У Лідскім замку вежы не выступалі за перыметр сцен, што не дазваляла весці абстрэл бліжэйшых падыходаў да іх і павялічвала

“мёртвую прастору”, у якой атакуючыя маглі дзейнічаць амаль без перашкод. У Крэўскім замку Крэўская вежа выходзіла за лінію мuроў, што спрыяла правядзенню абстрэлу войскаў праціўнікаў. Разам з тым, вялікія аконныя праёмы зніжалі абарончыя якасці вежы. Акрамя сцен і вежаў, амаль усе іншыя пабудовы гэтых замкаў былі драўляныя.

Гродзенскі Верхні (Стары) замак канца XIV – пачатку XV ст. займаў узвышша са стромкімі схіламі на беразе Нёмана. Яго пяць вежаў выступалі за лінію сцен, а тыльны фасад жылога корпусу быў уключаны ў лінію сцен. Такі тып замкаў сваё развіццё атрымаў падчас будаўніцва Мірскага замка. Яго ўзвядзенне пачалося ў першыя гады XVI ст. Замак меў у плане форму няправільнага чатырохвугольніка з выступаючымі вежамі па вуглах і праязной вежай. Сцены замка мелі баявую галерэю і ніжні ярус байніц.

У канцы XVI–пачатку XVII ст. у будаўніцтве каменных замкаў праявіліся новыя тэндэнцыі. Асноўны акцэнт рабіўся на жылое памяшканне, а абарончым збудаванням надавалася менш увагі. Да замкаў гэтага тыпу належыць Гальшанскі.

Некаторыя замкі XVI ст. складаліся з дзвюх частак: уласна замка і падзамка, у якім звычайна размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы. І замак, і падзамак мелі ўмацаванні. Да замкаў гэтага тыпу належаць замкі ў Іказні і Дуброўна.

Аднак не ўсе замкі XIV – XVII ст. былі мураваныя. Значная колькасць іх мела толькі драўляна-земляныя ўмацаванні і драўляную забудову. Прынцыпы размяшчэння драўляных замкаў і іх фартыфікацыі практычна не адрозніваліся ад тых, што былі ўласцівыя мураваным. Такія замкі былі пабудаваныя ў Астрашыцкім Гарадку, Радашковічах і інш.

Развіццё артылерыі садзейнічала далейшаму змяненню абарончых збудаванняў. У асаблівай небяспецы знаходзіліся замкі, якія не размяшчаліся ў балоцістай мясцовасці і ў дачыненні да якіх атакуючы бок мог выкарыстоўваць цяжкія гарматы. Для памяншэння эфектыўнасці варожай артылерыі у такіх замках ствараліся дадатковыя лініі абароны, якія на некалькі дзесяткаў метраў адстаялі ад замкавых муроў. Сам замак такім чынам ператвараўся ў цытадэль (цытадэллю называюць унутранае ўмацаванне крэпасці, якое мела самастойныя фартыфікацыі і якое выступала ў якасці апошняга апорнага пункту для гарнізона). З улікам новых прынцыпаў абароны быў пабудаваны Геранёнскі замак.

У другой палове – канцы XVI ст. пачалося будаўніцтва *бастыённых уладальніцкіх замкаў.* Увесь цяжар абароны ў бастыённых замках клаўся на бастыёны (умацаваныя выступы у крэпасной сцяне ці ў абаронным валу,

прызначаныя для абстрэлу праціўніка), равы. Жылыя карпусы, як правіла, не былі прыстасаваныя для абароны (нават вежы выконвалі пераважна дэкаратыўную ролю) і з’яўляліся сапраўднымі палацамі. Адным з найбольш вядомых замкаў гэтага тыпу з’яўляецца Нясвіжскі.

## 3. Мястэчкі

Мястэчкі – гэта невялікія паселішчы, галоўнымі функцыямі якіх былі гандаль і абслугоўванне кірмашоў і гандлёвых шляхоў, водных і сухапутных. Такія населеныя пункты пачалі ўзнікаць у XIV ст. Звычайна мястэчкі засноўвалі на новым, незаселеным раней месцы. Часам такія паселішчы трансфарміраваліся з вёсак.

Як правіла, мястэчкі не мелі абарончых збудаванняў, толькі асобныя населеныя пункты (Мір, Свіслач) былі ўмацаваныя. Для большасці мястэчкаў, якія ўзнікалі на новым месцы, была ўласцівая рэгулярная планіроўка. Галоўным месцам у мястэчку была рыначная плошча (“рынак”), на якой ажыццяўлялася большасць гандлёвых аперацый. Менавіта з рынку пачыналася фарміраванне новага паселішча. Рыначныя плошчы забудоўваліся па перыметры жылымі дамамі, тут жа размяшчаліся крамы, складскія памяшканні, корчмы, цэрквы альбо касцёлы, а пры наяўнасці ў мястэчка Магдэбургскага права – і ратуша.

Мястэчкі маглі мець розную планіроўку. Акрамя згаданай цэнтрычна-геаметрычнай (калі забудоўвалася толькі рыначная плошча), вылучаюць таксама планіроўку лінейную (калі забудоўваліся толькі вуліцы, якія размяшчаліся на адной альбо некалькіх восях), радыяльную (калі забудоўваліся толькі вуліцы, якія веерам разыходзіліся ад цэнтральнай плошчы ў напрамку да іншых населеных пунктаў, сядзіб феадалаў і інш.).

У найбольш буйных мястэчках узнікалі прадмесці (Маладзечна, Паставы) альбо новыя “места” (Мір, Радашковічы). Прадмеці выраслі з даўніх слабод. Яны маглі размяшчацца як побач з асноўнай часткай паселішча, так і пэўнай адлегласці ад яе, часам нават на супрацьлеглым беразе ракі. Вызначальнай рысай “места” была наяўнасць альтэрнатыўнага рынку, вакол якога фарміравалася ўласная вулічная сетка. Найбольш развітая планіроўка была характэрная для мястэчак Заходняй Беларусі.

У сувязі з функцыянальнай спецыфікай гэтых населеных пунктаў тут было шмат корчмаў, бровараў, пякарняў для вандроўных гандляроў. Колькасць кузняў таксама была большай, чым патрабавалі інтарэсы ўласна мястэчка і яго наваколля. Аднак, паколькі гандаль меў сезонны характар, жыхары мястэчак вымушаны былі займацца таксама сельскагаспадарчай

працай, на што ўказваюць параўнальна шматлікія знаходкі адпаведных прыладаў.

Матэрыяльная культура мястэчак спалучала рысы, уласцівыя як гораду, так і вёсцы, пры гэтым першыя дамінавалі. Жылыя пабудовы некаторых местачкоўцаў нагадвалі дамы гараджан: яны мелі параўнальна вялікія памеры, драўляныя падлогі, шкляныя шыбы, кафляныя печы. Аднак у сядзібах узводзілася вялікая колькасць гаспадарчых пабудоў, што нагадвала двары заможных сялян. Іншыя рысы, якія збліжаюць местачковую культуру з гарадской – частыя знаходкі замкоў і ключоў, манет. Аднак прадметы ўзбраення, рыштунак вершніка і баявога каня сустракаюцца рэдка. Увогуле не знойдзены мастацкія вырабы з каляровых металаў і косці, якія сустракаюцца ў гарадах.

## 4. Вясковыя паселішчы

Найбольш распаўсюджаным тыпам населеных пунктаў сярэдневяковай Беларусі былі сёлы (вёскі). У XIV–XVIII ст. яны складаліся з некалькіх сялянскіх двароў (“дымаў”), у забудову кожнага з якіх уваходзілі жылы дом і некалькі гаспадарчых будынкаў (клець-свіран, гумно, хлеў і інш.). Двары размяшчаліся асобна адзін ад аднаго альбо групамі, але ў адміністрацыйных адносінах складалі адзін населены пункт – сяло. Такія паселішчы звычайна былі невялікія па памерах, яны мелі бессістэмную (кучавую) планіроўку. У Заходняй і Цэнтральнай Беларусі ў выніку правядзення аграрнай рэформы XVI ст. (“валочная памера”) пачалі фарміравацца вёскі з рэгулярнай (вулічнай) планіроўкай. За межамі рэгулярных вёсак заставаліся свабодныя зямельныя плошчы, якія арэндаваліся заможнымі сялянамі ці дробнай шляхтай – т.зв. “засценкі”. Яны складаліся з аднаго ці некалькіх двароў.

У XIV ст. працэс сельскага рассялення на тэрыторыі сучаснай Беларусі ішоў вельмі павольна, што, як лічыцца, было звязана з агульным дэмаграфічным крызісам у еўрапейскіх краінах. У XV–XVII ст. гэты працэс адбываўся вельмі інтэнсіўна, і менавіта ў гэты час узнікла большасць з існуючых цепер вёсак. Войны сярэдзіны XVII ст. і пачатку XVIII ст. істотна прыпынілі працэсы сельскага рассялення. У выніку шмат вёсак было знішчана, і новыя ўзнікалі не на старым месцы, а на пэўнай адлегласці ад яго.

Асноўным тыпам сельскага рассялення на тэрыторыі Беларусі з’яўляўся прырэчны (далінны), калі вёскі размяшчаліся на берагах рэк. На поўначы існавалі таксама паселішчы прыазёрнага тыпу. У XVI ст. пачаў

распаўсюджвацца водападзельны (не звязаны з вадаёмамі) тып рассялення. Стварэнне аддаленых ад вады паселішчаў вынікала з эканамічных інтарэсаў землеўласнікаў.

Забудова сярэднявечных вёсак вывучана слаба. Сялянскія жытлы ўяўлялі сабой невялікія зрубы, узведзеныя з дрэў хваёвых парод. Падлогі былі земляныя, глінабітныя альбо з дошак. У хатах знаходзіліся печкі, як правіла, глінабітныя.

Побач з жытламі ўзводзіліся гаспадарчыя пабудовы. На некаторых селішчах выяўлены ямы-склепы, дзе захоўваліся сельскагаспадарчыя прыпасы.

Падчас раскопак сельскіх паселішчаў знаходзяць разнастайны гліняны посуд, шкляны посуд, шматлікія прылады працы і рэчы штодзённага побыту. Знаходкі сведчаць аб тым, што ў XIV–XVIII ст., у адрозненне ад папярэдняга перыяду, вёскі ўжо не былі ізаляванымі ад рынку паселішчамі з натуральнай гаспадаркай, а актыўна ўдзельнічалі ў гандлі з гарадамі і мястэчкамі.

Яшчэ адным тыпам сельскіх паселішчаў XV–XVIII ст. з’яўляліся неўмацаваныя **сядзібы феадалаў (двары і фальваркі).** Як правіла, яны засноўваліся каля ўжо існуючых вёсак. Іх забудова залежала ад узроўню багацця ўладальніка. У склад буйных двароў уваходзіла некалькі жылых і дзесяткі гаспадарчых пабудоў (свіраны, стайні, хлявы, гумны, бровары і інш.), а часам нават млын і храм. Пабудовы размяшчаліся па перыметру, утвараючы невялікі ўнутраны двор. Неад’емным элементам феадальнай сядзібы была вялікая ўязная брама. Забудова невялікіх фальваркаў складалася з жылога дома і самых неабходных гаспадарчых пабудоў. Планіроўка такіх паселішчаў была бессістэмная.

Жытлы былі драўляныя, яны ўзводзіліся на каменных фундаментах. Падлогі рабіліся з дошак. Нязменнай прыналежнасцю жылых сядзібных памяшканняў былі кафляныя печы, якія не толькі ацяплялі памяшканне, але і ўпрыгожвалі інтэр’ер. Вокны звычайна былі шкляныя.

На помніках знаходзяць разнастайныя рэчы: гліняны і шкляны посуд, шматлікія прылады працы і рэчы штодзённага побыту. Даследчыкі вылучаюць шэраг адметнасцяў матэрыяльнай культуры феадальнай сядзібы, у параўнанні з вёскай:

1. шырокае распаўсюджанне паліванага, а таксама імпартнага посуду;
2. частыя знаходкі замкоў і ключоў;
3. знаходкі засцёжак для кніг, шахматы;
4. сустракаюцца прадметы ўзбраення і вайсковага рыштунку.